№ 35 (345) 26 верасьня 2003

www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Ад зэка да пракурора
Турма ў фантастычных апавяданьнях. С. 11

Урбан Алін
Швэцыя магла б быць прыкладам. С. 5

Лёлік Ушкін
Прычына касавокасьці — расейскія левыя. С. 2

Франак Вячорка
Уся праўда пра ліцэй. С. 12

Бабіна лета

PHOTO.BYMEDIA.NET

У менскім Палацы мастацтва працуе фотавыстава «Мэрылін Манро». Сярод 300 фатаграфій ёсьць здымкі, зробленыя ў апошні тыдзень жыцьця акторкі, якія яна перакрэсьліла і забараніла друкаваць. Да 20 кастрычніка зь іх будзе ўсьміхацца нам каліфарнійскае лета.

НАВІНЫ

Мінюст падтрымаў Гайдукевіча

Міністэрства юстыцыі прызнала неправамоцнымі рашэньні зьезду ЛДПБ, на якім кіраўніку партыі Сяргею Гайдукевічу выказалі недавер. Мінюст палічыў, што пасьля сыходу прыхільнікаў Гайдукевіча зьезд страціў кворум. Сярод мінюстаўскіх рэкамэндацый партыі — на працягу трох месяцаў не ўступаць у кааліцыі.

Мілер астыў

«Газпром» пачынае перамовы пра пастаўкі газу ў Беларусь на рынкавых умовах. 23 верасьня кіраўнік «Газпрому» Аляксей Мілер, параіўшыся з паслом РФ у Беларусі Аляксандрам Блахіным, патэлефанаваў гендырэктару «Белтрансгазу» Пятру Пётуху. Яны дамовіліся ў найбліжэйшы час зладзіць перамовы. Плянуецца, што частку газу «Газпром» паставіць у Беларусь у якасьці платы за транзыт, частку — за грошы па рынкавых цэнах.

Уайлд у камітэцкай залі

Спэктакль «Эрнэст» паводле камэдыі Оскара Ўайлда «Эрнэст» паставіў менскі рэжысэр Сяргей Кулікоўскі. Прэм'ера адбылася 23 верасьня на сцэне клюбу імя Дзяржынскага. У спэктаклі граюць Галіна Таўкачова, Аўгуст Мілаванаў, Вера Кавалерава і інш. Гэтая камэдыя Ўайлда лічыцца адной з найлепшых у даробку аўтара.

МБ, БелаПАН

ТЭМА ТЫДНЯ

Ялта асобна, а Эўразьвяз асобна

Гутарка з Аляксандрам Батурам — выкладчыкам паліталёгіі ўнівэрсытэту Трыніці-каледж (Дублін).

«НН»: Як Вы ацэньваеце сёньняшні стан беларуска-расейскіх адносінаў, у зьвязку з «газавым крызысам»?

Аляксандар Батура: Нарэшце ствараецца нармальнае, цьвярозае становішча, заснаванае на рынкавай эканоміцы і інтарэсах абедзьвюх дзяржаваў. Пераход на рынкавыя ці калярынкавыя цэны на газ прывядзе Беларусь ці да пошукаў дывэрсыфікацыі крыніцаў сыравіны, ці да неабходных эканамічных рэформаў. Бо прамысловасьць можа папросту абваліцца ад такога шоку. Можа прывесьці і да пошуку альтэрнатыўных інвэстыцыяў, каб падтрымаць прамысловасьць, ці да ўсяго гэтага разам.

Галоўнае — «газавы крызыс» можа падштурхнуць Беларусь да зьмены ейнага статусу. Наўрад ці Беларусь здолее знайсьці іншыя крыніцы сыравіны, бо нават прапанаваныя Расеяй «рынкавыя» цэны ніжэйшыя за сусьветныя. Нават магчымыя інвэстыцыі з арабскіх краінаў, калі яны ўвогуле магчымыя, будуць патрабаваць пэўнай гарантыі. Так што эканамічныя рэформы ўсё ж трэба будзе пачынаць. Ня трэба баяцца рынкавых цэнаў на газ — яны толькі дапамогуць эканоміцы рэфармавацца, зьменшыць залежнасьць ад адной краіны.

У цэлым стан беларуска-расейскіх стасункаў я б ацаніў па меншай меры як патавы, а па большай — як партыю на карысьць Расеі. Нават калі Расея ня здолее навязаць Беларусі свае правілы гульні, любое зацягваньне статус-кво прывядзе да пагаршэньня эканамічнай сытуацыі ў нашай краіне. Пуцін незваротна ператварыўся ў актыўнага інтэгратара, а Лукашэнка цяпер можа граць толькі навязаную яму ролю. Пуцін ня будзе псаваць сабе імідж «зьбіральніка земляў» — расейскія выбарцы гэта любяць. Хутчэй за ўсё ён здолее працягнуць існую патавую сытуацыю да сваіх выбараў.

«НН»: Якія нэгатыўныя наступствы для эканамічнай і палітычнай стабільнасьці Беларусі могуць выклікаць Ялцінскія пагадненьні?

А.Б.: Эканамічная і палітычная «стабільнасьць» Беларусі — нэгатыўная зьява.

Працяг на старонцы 3.

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

Ня ў нас

Мастак Лявон Тарасэвіч, што з Валілаў на Беласточчыне, у трэці раз стварае мастацкі аб'ект ня ў сьценах галерэяў. Раней ён выходзіў на адкрытае паветра ў Вэнэцыі і Барсэлёне, цяпер — у Познані, на калёнах тамтэйшае опэры, з нагоды 750-годзьдзя гораду. Артысту прапанавалі для «афармленьня» любы будынак у горадзе, ён выбраў Вялікі тэатар, дзеля ягоных калёнаў.

Тарасэвіч намаляваў жоўта-зялёныя пасы на 54 поліхлёрвінілавых колах. Цяпер некалькі дзясяткаў работнікаў адмысловым чынам мантуюць іх на будынку… Для чаго гэта познанцам? Гэта незвычайна і прыгожа, дый жыхары зьвернуць увагу на тое, да чаго прызвычаіліся, пабачаць свой горад дзівосным і больш яго палюбяць. Гэтак тлумачаць кіраўнікі гораду.

Пакуль нельга сабе ўявіць, каб такі праект беларус Тарасэвіч рэалізаваў у Беларусі, на сталічнай Філярмоніі ці дзесьці на Коласаўскім тэатры ў Віцебску. Як нельга сабе ўявіць, каб Міколу Пінігіну аддалі будынак у Верхнім Горадзе пад тэатар, як было абяцана 10 гадоў таму. Або каб вылучылі грошы на канцэрт і майстар-клясы Марыі Гулегінай. Каб хворага Быкава прывезьлі дамоў прэзыдэнцкім самалётам… Чыноўнікі кажуць: гэта заскладана, гэта задорага, дый вы ж разумееце, што зь *іх* палітычнай пазыцыяй…

Калі б гэтак разважалі нашы продкі, мы б ня мелі ні «Новай зямлі», ні Александроўскай, ні «Песьняроў». Мы б нічога ня мелі.

Андрэй Дынько

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Падпіска на дзяржаўныя газэты зноў прымусовая

У менскай школе №102 дзецям «прапанавалі» падпісацца на дзяржаўныя выданьні. Паводле загаду дырэктара ўсе клясы — ад 1-й да 11-й — мусяць выпісаць ня менш чым па пяць выданьняў. У «сьпісе рэкамэндаванай літаратуры» фігуравалі «Переходный возраст», «Знамя юности», «Минский курьер», «Звязда», «Советская Белоруссия», «7 дней», а таксама часопісы «Качели», «Вясёлка» і «Бярозка».

Начальнік упраўленьня агульнай сярэдняй адукацыі Ўладзімер Шчэрба зазначыў, што Міністэрства адукацыі ня мае дачыненьня да такога загаду: «Яго няма і быць ня можа. Гэта, відаць, нехта на месцах стараецца». Дырэктарка школы Тамара Габелка патлумачыла карэспандэнту «НН», што ніякага загаду не было: «Мы парэкамэндавалі дзецям падпісацца на беларускія выданьні. Школьнікам неабходна рыхтавацца да інфармацыйных гадзінаў».

Прамыўка маладых мазгоў пачалася. За нашыя ж грошы.

АШ

100 гадоў Натальлі Арсеньневай

Баляда Натальлі Арсеньневай

Далёка, нібыта ад сонца, ад маці-краіны,
З Малітвай у сэрцы за родны балотны народ
Глядзела ў чужыя нябёсы яна, і ўспаміны,
Нібыта вугольле, нібы акрываўлены лёд,
Душу працінялі наскрозь і ў былое вярталі,
У голад, у холад, у дым непраглядны вайны,
Дзе словы, як кулі, і кулі, як словы, траплялі
І ў сэрцы людзкія, і ў крылы жаданай вясны.
А неба было, як было па-над ціхаю Вільняй,
Глыбокім і сумным, як тыя азёры, зь якіх
Глядзяць нашы продкі сівыя спакойна і пільна,
Хоць часам у нас і ня бачаць нашчадкаў сваіх.
Ёй сонца з-за хмараў здалёку, як маці-краіна,
Душу асьвяціла на міг, а хапіла — на век,
Каб змрочныя думкі расталі, нібыта ільдзіны,
А сонца застыла ў вачах, нібы крыж на царкве.
Гады праляцелі, як травы сухія згарэлі,
Але засталіся Малітва і родны абсяг,
Зь якімі да зорак ляцім і ляцім, як ляцелі,
І сьлёзы, як зоркі, як вершы, кіпяць у вачах...

ВШ

ЛЕВЫМ ВОКАМ

Месца разводкі

На мінулым тыдні маё заўсёды скіраванае налева вока пачало крывіцца направа.

Прычына касавокасьці — расейскія левыя, якія напярэдадні думскіх выбараў увайшлі ў арагенітальны кантакт з фашыстамі.

Вось «Партыя працы» А.Шэіна прыармянілася да блёку Глазьева. У першай тройцы перадвыбарчага глазьеўскага картэлю стаіць той самы Бабурын, які завабіў францускага нэанацыста Лё Пэна ў Сібір на магілку Калчака, каб разам узгадаць нявінную ахвяру пархатага бальшавізму. Шэін каапэрацыю з фашнёй апраўдвае тым, што Глазьеў даў яму два месцы ў фэдэральным сьпісе. Між тым высьветлілася, што шэінскі намесьнік Храмаў гэтыя месцы ўжо прадаў. Пачаўся скандал, які скончыўся «сплітам» — на палітжаргоне «раскол». Адкольнікі запісаліся да Паўла Барадзіна, якому патрапіць у Думу таксама дапамагаюць жыдаедзкія партыі — «За Русь Сьвятую» і «За Сьвятую Русь».

Беларускія левыя на фоне расейскіх калегаў выглядаюць проста паінькамі-эўракамуністамі, клонамі Карла Бэрлінгуэра і Жоржа Маршэ.

На мінулым тыдні Калякін, Бухвостаў і Шушкевіч падпісаліся пад леваўгоднай справай адзінай дэмакратычнай апазыцыі. Статкевіч корчыць цэлку, аднак, відавочна, не таму, што яго казыча ідэя запрасіць у Беларусь Гайдэра і ўшанаваць памяць укакошаных тут салдатаў Вэрмахту.

Як бачым, паміж ідэйнымі прыярытэтамі расейскіх і беларускіх левых — гранд-каньён. Гэта мімаволі ўмацоўвае любімы тэзыс правых аб тым, што ніякіх унівэрсальных чалавечых катэгорыяў не існуе, затое існуюць варожыя цывілізацыі, напрыклад азіяцкая і эўрапейская. Францьер паміж імі праходзіць па залі буфэту на станцыі «Чырвоная» (перагон Ворша—Смаленск).

Калі гэта так, то мне застаецца толькі расьпісацца ў сваей ідэйнай канфузіі, зачыніць «Левым вокам» і пайсьці разам з скінамі шукаць хачэй. Ідэйнае выратаваньне я знайшоў у клясыка, у «Тэзысах аб Фаербаху». Маркс піша, што ніякай «чыстай думкі» не існуе. Праілюструю гэта на прыкладзе. У свой час на радыё «Стыль» ды-джэй, адказваючы на пытаньне, чым левыя адрозьніваюцца ад правых, сказаў: «Левыя дрочаць левай рукой, а правыя — правай».

На самай справе, відавочна, дрочаць чым заўгодна, толькі б атрымаць свой сатысфэкшн. Гэтак і ў палітыцы: левыя, правыя сымпатыі выкліканыя апэтытамі людзей, як правіла матэрыяльнымі.

У адрозьненьне ад Расеі, дзе сваіх спонсараў акіян, для нашых левых (як, дарэчы, і правых) адзіным месцам разводкі зьяўляецца Эўропа. Даводзіцца прымаць і яе забабоны кшталту легалізацыі марыхуаны або сэксуальнага пакту.

Пры ўсім пазытыве тут ёсьць нэгатыўны аспэкт. Сэртыфікат ляяльнасьці эўрапейскім левым пагражае фармалізацыяй левага руху. Народ наўрад ці прасячэ разгон пра правы жывёлаў і зноў аддасьць голас за бацьку.

Барацьба з фармалізмам у левых павінна стаяць на другім месцы пасьля барацьбы з пустазельлем сталінскай левай традыцыі. Творча адаптаваць эўрапейскую паліткультуру нам дапаможа фантазія ў выбары мастацкіх сродкаў. Для пачатку прапаную правесьці адзіны дзень нечыстаты расы або замуціць ролевую гульню «Забойства Кубэ».

Лёлік Ушкін

ПРАВЫМ ВОКАМ

І дзе я

Калі даводзіцца чарговы раз чуць пра *курс дзяржаўнае ідэалёгіі* ў навучальных установах, пачуцьцё гідлівасьці міжволі саступае месца шкадобе. Бедныя вучні! Бедныя выкладчыкі! Бедная Беларусь!

І справа не адно ў паралелях з «Гісторыяй КПСС», «Зялёнай кнігай» і «Рухнамой» — рысах, за якімі аўтарытарызм ператвараецца ў таталітарызм. Сучасная беларуская эліта сапраўды заблыталася. Да тае сьветапогляднае мешаніны, што характарызуе любое пераходнае грамадзтва, дадаецца каша ў галовах улады.

Камунізм напалам з гуманізмам, сацыялізм з капіталізмам, савецкі патрыятызм зь беларускім канфармізмам, старэчы маразм з праваслаўным атэізмам... Ванітоўны кактэйль. Падручнікі гэтае ідэалёгіі будуць нагадваць самапальны цытатнік закамплексаванага падлетка, які хоча ўладкаваць сьвет па-свойму, але дакладна не ўяўляе навошта і да таго ж ня ў курсе, з чаго пачынаць.

Курс рэжыму ў геапалітыцы? Адсталая Расея, якая так нахабна прагне анэксіі, што яе даводзіцца палохаць Эўропай. Наймацнейшая дзяржава сьвету — вораг №1. Найлепшыя сябры — арабы і кітайцы. Ідэал — савецкая рэспубліка. «Нешта Сярэдняе Паміж Швэцыяй і Кубай». Курс такі, што ані компас, ані флюгер не дапамогуць.

Курс палітычнае ідэалёгіі? Сацыялістычны кансэрватызм, дзе лібэральныя дэклярацыі рэгулярна зьмяняюцца камуністычнымі лёзунгамі. Пасьля пары такіх заняткаў удумлівыя студэнты-палітолягі назаўжды страцяць здольнасьць адрозьніваць брытанскіх торы ад партыі «Баас».

Нават валютны курс, увасобленая канкрэтыка, такой ідэалёгіі рады ня дасьць. Ані эўра, паводле якога жывуць суседзі, ані даляр, на які ўсё мерае нават «Панарама», ані «зайчык», што скача як хоча, ані расейскі рубель, які «ўводзяць і выводзяць», прабачце, праз газавую трубу, ня могуць быць выкарыстаныя для ацэнкі каштоўнасьцяў сучаснае беларускае дзяржавы.

Гэта не ідэалёгія. Гэта, як той казаў, «і дзе я! І дзе я нахажуся?!».

Хаця насамрэч усё проста.

Ідэалёгія любое дзяржавы грунтуецца на незалежнасьці, патрыятызьме й нацыянальнай ідэі. Эўрапейскі цывілізацыйны кантэкст, уласная гісторыя і сёньняшні духовы крызыс заклікаюць Беларусь да хрысьціянскіх прынцыпаў. І ўрэшце, не дзяржава, а моцныя грамадзкія інстытуцыі — сям'я, інтэлігенцыя, царква — павінны навучаць простым словам і простым рэчам, на якіх трымаецца ўся краіна. *Верыць у Бога. Жыць у праўдзе. Любіць Беларусь.*

А інакш курс дзяржаўнай ідэалёгіі будзе вельмі, вельмі кароткім. Як пшык.

Павал Севярынец

Ялта асобна, Эўразьвяз асобна

Аляксандар Батура — палітоляг, нарадзіўся ў Мядзеле. Скончыў Цэнтральнаэўрапейскі ўнівэрсытэт у Будапэшце. Аўтар шэрагу публікацыяў на палітычную тэматыку, сярод якіх апошняя — артыкул «Бясконцая вайна за мір» (часопіс ARCHE, №3-2003).

Працяг са старонкі 1.

Тая «стабільнасьць» — гэта адсутнасьць рэформаў, сацыяльнай, палітычнай і эканамічнай дынамікі, жыцьцёва неабходных для разьвіцьця сучаснага грамадзтва. «Стабільны» мізэрны заробак, «стабільная» адсутнасьць адказнасьці ўладаў за свае памылкі. Нават такія, здаецца, нэгатыўныя паказчыкі, як беспрацоўе (нестабільнасьць), могуць служыць індыкатарам таго, што пачаліся структурныя рэформы эканомікі, і нават такая нестабільнасьць можа быць лепшай, чым наша стабільнасьць.

Сапраўды, Ялцінскія пагадненьні могуць мець «нэгатыўныя» наступствы для «эканамічнай і палітычнай стабільнасьці» Беларусі, калі яны створаць падмурак для эканамічнай дынамікі, падштурхнуць рэформы, такія неабходныя краіне.

Зрэшты, падставаў для залішняга аптымізму няма. У гісторыі СНД і «саюзнай дзяржавы» было шмат бадзёрых заяваў і паляпваньняў па сьпіне, якія нікуды не вядуць. Ня трэба разьлічваць і на «другі Эўразьвяз». На сцэне тыя ж старыя «акторы». Аднак калі Пуцін стане «рухавіком» адзінай эканамічнай прасторы, гэта можна азначаць пэўны прагматызм. Перавага будзе аддадзена не «ўпрыгожваньню елачкі» ў выглядзе наддзяржаўных установаў, актаў, бадзёрых заяваў, а вельмі прагматычнаму і нядрэннаму для ўсіх удзельнікаў саюзу свабоднага гандлю, скасаваньню субсыдый і нетарыфных пагадненьняў, гарманізацыі тарыфаў і пэўных падаткаў. Гэта нядрэнна, пры ўмове што Беларусь заўсёды можа выйсьці з гэтага пагадненьня ў будучыні.

«НН»: Як гэта ўсё можа адбіцца на шанцах Беларусі ўвайсьці ў Эўразьвяз?

А.Б.: Ялцінскія пагадненьні на гэтыя шанцы Беларусі ніяк не ўплываюць. Бо на сёньняшні момант тых шанцаў — прабачце за жорсткасьць — прыкладна столькі ж, колькі ў Марока. Брусэль больш хвалюе, як абсарбаваць «новых эўрапейцаў», што далучацца да «клюбу» налета. На бліжэйшую будучыню межы палітычнай Эўропы — гэта ўсходнія межы Польшчы. Больш таго, сёньня разглядаць Беларусь як магчымага сябра ЭЗ немагчыма нават гіпатэтычна. Па-першае, Беларусь не зьяўляецца дэмакратычнай дзяржавай з рынкавай эканомікай, па-другое, эўрабюракраты да апошняга часу не разглядалі Беларусь як дзяржаву, здольную весьці незалежную замежную палітыку. Можна разважаць пра нэгатыўны ўплыў Ялты на шанцы ўступленьня ў ЭЗ Украіны, якая ў параўнаньні з намі значна прасунулася ўперад па шляху неабходных рэформаў, але гэта ня нашая тэма.

Каб мець шанцы ўвайсьці ў Эўразьвяз, Беларусь павінна быць дэмакратыяй з рынкавай эканомікай, няхай дрэннай, можа, карумпаванай і, можа, некансалідаванай. Паглядзіце на Румынію ці Баўгарыю — яны прайшлі кваліфікацыйны тур.

Палітыка Захаду да Беларусі? Яе няма. Існуе хутчэй неразуменьне сытуацыі, жаданьне схавацца ад праблемы, адкласьці разгляд.

Дэмакратыя ня валіцца зь неба, гэта вынік эканамічнай і сацыяльнай трансфармацыі, якая вядзе да зьяўленьня новых заможных клясаў, сярэдняй клясы, іншых сучасных сацыяльных груповак, якія зьвязваюць свае інтарэсы з дэмакратыяй. На сёньня ў Беларусі замарожаныя ўсе рэформы, існуе поўная «стабільнасьць».

Ялцінскія ж пагадненьні могуць прывесьці да пэўнай дынамікі, да рэформаў, а рэформы — да зьяўленьня новых інтарэсаў. Якія, магчыма, прывядуць да лібэралізацыі і дэмакратызацыі. І толькі пасьля можна будзе размаўляць пра шанцы на ўступленьне ў Эўразьвяз.

«НН»: Ці варта чакаць зьмены стаўленьня Захаду да рэжыму Лукашэнкі? І якія захады беларускіх уладаў маглі б такія зьмены прысьпешыць?

А.Б.: Цяжка сказаць. Калі паглядзець на палітыку Захаду ў дачыненьні да Беларусі, ствараецца ўражаньне, што ніякага стаўленьня, сфармуляванай палітыкі ўвогуле няма. Існуе хутчэй неразуменьне сытуацыі, жаданьне схавацца ад праблемы, адкласьці разгляд: можа, праблема вырашыцца сама сабой, потым зноў адкласьці... Якаснае, каштоўнаснае стаўленьне да рэжыму Лукашэнкі ня зьменіцца: Эўропа паводле такіх правілаў ужо даўно не гуляе, а Беларусь знаходзіцца ў Эўропе. Амэрыка, хутчэй за ўсё, захавае нэгатыўнае, але ў значнай меры пасіўнае стаўленьне да Беларусі. Цяпер ЗША больш турбуюць тэрарысты на Блізкім Усходзе. І Беларусі ня трэба прыцягваць непатрэбнай увагі з боку Амэрыкі сваёй зброяй.

А вось з наступнага году мяжа ЭЗ будзе праходзіць ля Беларусі і Брусэль павінен будзе вызначыцца з стаўленьнем і стратэгіяй у адносінах да нашай дзяржавы, да сваёй суседкі. І тут магчымая цікавая гульня: Брусэль — Польшча/Літва (як чальцы ЭЗ) — Беларусь. Я думаю, што Польшча і Літва ў новым статусе здолеюць падштурхнуць ЭЗ да разгляду беларускай сытуацыі. Так што я б асьцярожна спрагназаваў магчымыя зьмены з боку ЭЗ, пачынаючы з наступнага году. Беларускаму ўраду, каб прысьпешыць гэтыя зьмены з боку Захаду, ня трэба прыдумваць ровар — дэмакратызацыя і лібэралізацыя. Нафты, дзякуй Богу, у нас няма.

«НН»: Ці ёсьць Беларусі карысьць ад падтрымкі антыпуцінскай апазыцыі ў Расеі?

А.Б.: Умешвацца ў будучыя выбары ў Думу было б вялікай памылкай. Каб падтрымліваць каго ў выбарах, патрэбна, па-першае, мець чым падтрымліваць, па-другое, мець каго падтрымліваць, па-трэцяе, патрэбная матывацыя, мэты гэтай падтрымкі. Калі знайсьці пэўныя сродкі, застанецца пытаньне, якіх гульцоў можна падтрымаць. Вось вы кажаце пра антыпуцінскую апазыцыю, але ці ёсьць такая? Электарат супрацьлеглых партыяў ёсьць электарат Пуціна. Прыхільнікі Пуціна ёсьць як сярод электарату СПС, так і сярод камуністаў. Гіпатэтычна Лукашэнка ня можа падтрымліваць СПС, «Яблык», «Адзіную Расею». Як і ЛДПР, якая гуляе згодна з правіламі Крамля. КПРФ ужо ня тая, што была раней. А больш буйных гульцоў і няма. Хіба што левы блёк Глазьева, нацыянал-сацыялістычнае афарбоўкі, — але і тут незразумела, у якую гульню ён гуляе. Застаюцца «незалежныя» і дробныя партыі. Але нават каб і было каго падтрымліваць, я ня бачу мэтаў такой падтрымкі. Палітычная сытуацыя ў Расеі якасна іншая, чым чатыры гады таму, — цяпер там «кіраваная» дэмакратыя. Любое ўмяшальніцтва кантралюецца і фіксуецца. Нават каб Лукашэнка ўмяшаўся, дык магчымасьць дробнага лабіраваньня падтрыманых ім гульцоў ня вартая рызыкі.

Запісаў Сяргей Ёрш

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Прэміі ад Шарамета

19 верасьня, у час правядзеньня «Дня зачыненых газэтаў», беларускім журналістам былі ўручаныя прэміі «За мужнасьць і прафэсіяналізм» імя Зьмітра Завадзкага. Прэмію, заснаваную расейскім «Першым каналам» (былы ОРТ), уручаў кіраўнік аддзелу спэцпраектаў інфармацыйнай дырэкцыі каналу Павал Шарамет.

Ляўрэатамі сталі не арыштанты Маркевіч ды Івашкевіч, а фотакарэспандэнт агенцтва АР Сяргей Грыц, рэдакцыя «Белорусской деловой газеты», а таксама фотакарэспандэнт агенцтва «Reuters» Васіль Федасенка.

Рашэньне аб уручэньні прэміі прымала экспэртная рада «Першага каналу», пасьля чаго яно было зацьверджанае генэральным дырэктарам Канстанцінам Эрнстам.

Дзень зачыненых газэт і ўручэньне прэмій сталі нагодай для правядзеньня «круглага стала» па праблемах незалежных СМІ ў краіне. Атмасфэра на ім была далёкай ад сьвяточнай. Сытуацыя па-ранейшаму крытычная: незалежных радыёстанцый няма зусім, агульнанацыянальныя газэты можна палічыць на пальцах аднае рукі.

«Каб узарваць манаполію ўлады на інфармацыю, недзяржаўная прэса павінна сфармуляваць новую стратэгію дзеяньняў», — такую думку выказала старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна.

«Калектывы дваццаці газэтаў перажылі рэпрэсіі з боку ўлады. Па сутнасьці, судзілі і прыцягвалі да крымінальнай адказнасьці нашу прафэсію».

Асаблівы неспакой Ж.Літвіной выклікае распрацоўка новага, драконаўскага закону пра СМІ. Паўтара году таму пабачыла сьвет яго першая рэдакцыя. «Дзякуючы міжнароднай падтрымцы нам удалося адцягнуць час прыняцьця новага закону. Аднак, зыходзячы з наяўнай інфармацыі, можна меркаваць, што законапраект, які бліжэйшым часам павінен паступіць на разгляд парлямэнту, мае шэраг абмежаваньняў для недзяржаўнай прэсы, у тым ліку кантроль дзяржавы над Інтэрнэтам і папярэднюю цэнзуру нават для малатыражных выданьняў», — сказала Ж.Літвіна.

Сябры рады БАЖ Леанід Міндлін і Дзьмітры Падбярэскі зьвярнулі ўвагу на неабходнасьць стварэньня альтэрнатыўнай сыстэмы распаўсюду недзяржаўнай прэсы.

На думку яшчэ аднаго віцэ-старшыні БАЖ Эдуарда Мельнікава, варта перайсьці да стварэньня трансгранічнага тэлевяшчаньня на 300 тыс. спадарожнікавых антэн, усталяваных у краіне, а таксама пашырыць магчымасьці замежнага выданьня беларускіх газэт і часопісаў.

Франц Субель

Чаму ніхто не пратэстуе?

У Беларусі поўная неадчувальнасьць на інтэграцыйныя працэсы

Угоду прэзыдэнтаў Беларусі, Украіны, Расеі і Казахстану аб стварэньні Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП) некаторыя пасьпяшаліся параўнаць зь ялцінскімі пагадненьнямі 1945 г., што падзялілі Эўропу на савецкую і заходнюю зоны ўплыву. Прадстаўнікі Эўразьвязу і ЗША адкрыта выказвалі занепакоенасьць. У Брусэлі і Вашынгтоне Ялцінскія пагадненьні'2003 разглядалі як сур'ёзную спробу Расеі аднавіць поле прыцягненьня краінаў былога Савецкага Саюзу. На думку камісара ЭЗ па справе пашырэньня Гюнтэра Фэрхогена, уваход краіны ў адзіную эканамічную прастору ў Эўразіі перакрэсьлівае магчымасьць далучэньня да аналягічнае заходнеэўрапейскае. Газэта «Wall Street Journal» засьцерагала Маскву ад пашырэньня свайго ўплыву на Ўкраіну ды Беларусь.

Аднак прэзыдэнт Беларусі, які, прынамсі, на словах — вялікі прыхільнік аб'яднаньня дзяржаваў былога СССР, быў яўна расчараваны і раздражнёны вынікамі спатканьня. На заключнай прэс-канфэрэнцыі нават гаркаўся з гаспадаром — Леанідам Кучмам.

Калі дайшла справа да падпісаньня дакумэнту, першым, паводле пратаколу, яго ўзяў у рукі менавіта Аляксандар Лукашэнка, але подпісу не паставіў — перадаў Назарбаеву. «Давайце пачнём са старэйшых», — сказаў кіраўнік Беларусі. У выніку А.Лукашэнка падпісаў пагадненьне апошнім, папярэдне пагартаўшы дакумэнты, нібыта маючы засьцярогу, што іх могуць падмяніць. Кучма не ўстрымаўся, каб не зачапіць беларускага калегу: пацікавіўся, чаму ён усіх крытыкуе. Лукашэнка адказаў, што нікога ён не крытыкуе, і паставіў свой подпіс.

Але Кучма працягваў жартаваць. «Многія палітыкі, якія так апантана выступаюць супраць дакумэнтаў, нават іх не чыталі, — сказаў украінскі прэзыдэнт. — Але самае цікавае крыецца ў тым, што гэтыя палітыкі прыедуць у Маскву і будуць прасіць падтрымкі на чарговых выбарах». Лукашэнка адрэагаваў імгненна, нагадаўшы Кучму пра яго праблемы: «У нас ёсьць дзейны прэзыдэнт Украіны, і спадзяюся, што яшчэ доўга будзе».

Зь вялікім рыпам прайшоў праект стварэньня «наднацыянальнага органу», што мусіць кіраваць АЭП. У выніку ў дакумэнце зьявіўся орган «рэгулявальны». Праўда, яму ўсё ж перадаецца частка паўнамоцтваў краінаў-падпісантак і рашэньні яго абавязковыя для выкананьня. Украінскі бок перастрахаваўся — абавязковыя, калі не супярэчаць Канстытуцыі. Беларускі бок у асобе А.Лукашэнкі выказаў скептыцызм наконт таго, што пагадненьне, пасьля ўнесеных удакладненьняў і агаворак, будзе працаваць. «Беларусь будзе штосьці прадпрымаць у рамках АЭП толькі пасьля таго, як гэта зробяць астатнія ўдзельнікі», — сказаў Лукашэнка.

Украіна перажыла напярэдадні падпісаньня такі сабе палітычны момант ісьціны. Прапанова падпісаць дакумэнты аб стварэньні АЭП у іхным першапачатковым варыянце сутыкнулася з такімі пратэстамі апазыцыі, дыпляматаў, большай часткі міністраў, а таксама эўрапейскіх і амэрыканскіх партнэраў Украіны, што Кучма і Януковіч мусілі адкарэктаваць сваю пазыцыю і канчатковы тэкст пагадненьня.

У Беларусі ж пагадненьня, здаецца, сур'ёзна не чытаў ніхто. У сытуацыі, калі Беларусь ужо ўтварыла супольны рынак з Расеяй, мытны саюз з Расеяй і цэнтральнаазіяцкімі краінамі, далучэньне ці недалучэньне да АЭП мала што мяняюць у замежнапалітычнай арыентацыі краіны. Звыклася зь цяперашнім станам і дэмакратычная апазыцыя, якая апошнім часам наладжвае плённыя кантакты з Масквой. Да таго ж, у яе заўжды пад саломай схаваны апошні аргумэнт: усе пагадненьні, якія падпісвае недэмакратычны рэжым, ня маюць юрыдычнай сілы. Тым ня менш, шкада, што нашы эканамісты і палітыкі ня маюць магчымасьці публічна абмяркоўваць доўгатэрміновыя зыскі і шкоды ад такіх пагадненьняў для нацыянальных інтарэсаў Беларусі.

Алег Тачоны, Мікола Бугай

Ялта будзе пахаваная

Меркаваньне выкладчыка эканомікі Беларускага ліцэю Аляксея Янукевіча.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«НН»: Ці стварэньне АЭП нясе для Беларусі нейкія небясьпекі?

Аляксей Янукевіч: Яе стварэньне закладае вэктар разьвіцьця эканомікі на дзесяцігодзьдзі наперад. Стварэньне наднацыянальнага органу, рашэньні якога краіны-ўдзельніцы мусяць выконваць, небясьпечнае. Расея з часам можа змусіць яго працаваць на сваю карысьць.

«НН»: Якім чынам?

А.Я.: Бо прадстаўніцтва ў наднацыянальным органе будзе залежаць ад эканамічнага патэнцыялу дзяржаваў. Паводле Пуціна, Беларусь мае эканамічны патэнцыял у параўнаньні з Расеяй 3%, беларускі бок называе іншую лічбу — 12%. У кантэксьце апошніх складанасьцяў у дачыненьнях Менску і Масквы застаецца спадзявацца, што далейшага ходу гэтаму пагадненьню ня будзе дадзена. Што яно застанецца на паперы, а з часам будзе пахаванае.

Гутарыў Сяргей Ёрш

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

Ашчаджэньні растуць

На 62,9% павялічыліся ад студзеня рублёвыя ўклады насельніцтва ў банках. Дэпазыты ў замежнай валюце за гэты пэрыяд вырасьлі на 72,2 млн даляраў (18,5%). У пачатку верасьня дэпазыты грамадзянаў дасягнулі адпаведна трыльёна зь лішкам рублёў і 462,5 млн даляраў.

Закупкі цьвёрдай пшаніцы

Беларусь набудзе ў Расеі ды Украіне 240 тыс. т пшаніцы. Гэтага павінна хапіць, каб год выпякаць булкі і рабіць макарону — на іх прыдатная толькі пшаніца цьвёрдых сартоў, што ў Беларусі не расьце.

Бярозаўскую ГРЭС не аддадуць

Кіраўнік энэргахолдынгу «АЭС Расеі» Анатоль Чубайс заявіў пра жаданьне атрымаць у арэнду Бярозаўскую ГРЭС. У «Берасьцеэнэрга» лічаць, што здаваць у арэнду другую па велічыні (пасьля Лукомскай) ГРЭС магутнасьцю 920 мэгават няма сэнсу.

Тым часам Армэнія перадала «АЭС Расеі» кантроль над адзінай у краіне атамнай электрастанцыяй «Мэцамор». АЭС вырабляе 40% электрычнасьці краіны. Армэнія мае 40-мільённую запазычанасьць за ядравае паліва для той самай станцыі. «Адзіныя энэргасыстэмы» згадзілася сплаціць гэтую суму і забралі АЭС.

Атэстацыя бухгальтараў

Налета дзяржава правядзе атэстацыю ўсіх бухгальтараў краіны. 300 тысячам беларускіх бухгальтараў давядзецца пагартаць падручнікі. Кепска будзе і 190 тысячам індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца бухгальтэрыяй саматужна.

Іранскі капітал ідзе

«Падземны горад» пад плошчай Незалежнасьці ў Менску збудуюць іранцы. Яны ж набылі за 380 млн рублёў 14-павярховы гмах недабудаванага гатэлю ў Берасьці, што чвэрць стагодзьдзя прастаяў пустой бэтоннай каробкай. У ім будуць офісы ды крамы. А ля ракі Мухавец паставяць аквапарк. Беларусы ж пакуль замахнуліся толькі на пабудову ў Іране заводу для вырабу трактароў ды самазвалаў. Разам краіны плянуюць інвэставаць адна ў адну амаль паўмільярда даляраў. Нядаўна такія ж праекты размахваліся рабіць з Іракам.

Конкурс з падказкай

«Інфабанк» аб'явіў студэнцкі конкурс на самую лепшую навуковую працу. Тэма — «Плюсы ды мінусы ўвядзеньня расейскага рубля на тэрыторыі Беларусі». Што да выбару валюты, дык банкіры даюць маладым навукоўцам падказку: аўтар-пераможца атрымае 100 даляраў.

Залатая гарэлка

Адмыслоўцы з Гарадзенскага лікёра-гарэлачнага заводу вынайшлі залатую гарэлку. У паўлітру будзе дадавацца 0,002 г золата ў крышталіках, якія афарбуюць вадкасьць у шляхетны колер. Каштаваць залатая акавіта будзе ўдвая даражэй за звычайную «беленькую». У гарадзенцаў засталіся дзьве праблемы: як атрымаць дазвол Міністэрства аховы здароўя ды як дамагчыся, каб золата не асядала на дно бутэлькі.

ЗША інвэстуюць у тэрмінал на Балтыцы

Агенцтва па замежных інвэстыцыях ЗША і швайцарска-амэрыканскі банк «Credit Suisse First Boston» даюць «Лукойлу» крэдыт у 225 млн даляраў для пабудовы новага тэрміналу на Балтыцы. Гэта дасьць магчымасьць экспартаваць расейскую нафту на Захад у абыход Украіны, Беларусі і Прыбалтыкі. З «Газпромам» кампаніі ЗША дамовіліся пра пастаўкі газу з радовішчаў на дне Баранцавага мора (кошт праекту 10 млрд даляраў). Цяпер Штаты імпартуюць 54% патрэбнай нафты, да 2023 г. гэты паказьнік вырасьце да 68%.

Газавыя пляны Украіны

У 2004 г. «Газпром» зьменшыць пастаўкі ва Ўкраіну да 24 млрд м³ газу (з 26 м³). Аб'ёмы транзыту застануцца нязьменнымі. Цана на расейскі газ ня зьменіцца: 50 даляраў за 1000 м³. Рэшту газу Украіна закупляе ў Цэнтральнай Азіі.

Аўдытары-ашуканцы

Міністэрства юстыцыі ЗША зьвінаваціла аўдытарскія кампаніі «PricewaterhouseCoopers», «KPMG» і «Ernst & Young» у тым, што яны на працягу дзесяці год ашуквалі сваіх кліентаў, беручы зь іх плату за службовыя паездкі сваіх супрацоўнікаў. Усе тры фірмы мелі дамовы з авіякампаніямі, гатэлямі і фірмамі аўтапракату аб спэцыяльных скідках, але кліентам пра гэта не казалі.

АК; БелаПАН, АФН

З УСЁЙ КРАІНЫ

Платныя капальшчыкі

Рынкавыя адносіны ўваходзяць у такую сьвятую справу для беларуса, як капаньне бульбы. У вёсцы Княгінін на Мядзельшчыне той, хто ня здолеў сабраць талаку, мог зьвярнуцца да «прафэсійных» капальшчыкаў. За дзень яны бралі па 10 тыс. руб. або мех бульбы.

К., Мядзел

U kałhas na zarobki

Baranavickaje vytvorčaje bavaŭniana-papiarovaje abjadnańnie jašče ŭ krasaviku nakiravała troch mechanizataraŭ razam z technikaj u kałhas imia Kirava na dapamohu ŭ sielhasrabotach. I dahetul tyja niebaraki tamaka harbaciacca. A miesiac tamu pradpryjemstva nakiravała ŭ toj samy kałhas jašče 30 čałaviek dziela ŭborki lnu. Hetkim čynam vyrašajecca pytańnie zaniataści pracoŭnych.

VBPA z 2004 h. budzie pryznanaje bankrutam. Kala 2000 čałaviek, adnak, dahetul trymajuć na pracy, zmušajučy pa čarzie vychodzić u adpačynak za svoj košt.

Rusłan Raviaka, Baranavičy

Гатэль на Гайне

Калі пяць гадоў таму старшыня калгасу «Касінскі» грузін Атары Лалуа перажыў інфаркт, дактары параілі яму зьмяніць працу. Сёньня сп.Атары — адзін з пачынальнікаў вясковага турызму ў Беларусі. Каля 200 беларусаў ужо заявілі аб сваім жаданьні займацца вясковым турызмам.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Пасьля хваробы Лалуа збудаваў хату ў вёсцы Панізоўе. «Рабілі ўсё для сябе, для сяброў. Першымі гасьцьмі былі сябры і знаёмыя. Пасьля мы з жонкай падумалі: усё адно ж беспрацоўныя, а ад гасьцей няма адбою. Чаму б на гэтым і не зарабіць?» — расказвае гаспадар.

Яго гатэль на некалькі сем'яў пакуль недабудаваны. Ёсьць толькі лазьня і адзін пакой, але да Новага году будзе гатова ўсё. У хаце пахне сьвежым дрэвам, ніякіх лакаў і фарбаў гаспадар не выкарыстоўвае прынцыпова: няхай усё будзе натуральнае. Інтэр'ер аздабляюць ступка, маслабойка, элемэнты ткацкага станка — зьвёз ад цешчы, якая жыве ў Старых Дарогах. Проста перад домам — рэчка, на беразе дзьве крынічкі, клапатлівымі рукамі прыбраныя, расчышчаныя.

Забавы для гасьцей тут простыя: ровар, грыбы, паляваньне, катаньне на байдарках па быстрай Гайне. Узімку — лыжы, конныя шпацыры па лесе (тут дапаможа сусед, бо ў Лалуа коней няма). Для сувязі ў доме плянуюць усталяваць кампутар з выхадам у Інтэрнэт.

Для аматараў паляваньня тут проста рай. Вядуцца дзікі, алені, лісы. Сам сп.Атары не палюе. Пасьля хваробы стаў шкадаваць зьвяроў: «Ну яшчэ дзіка забіць магу. А раней і зайцоў білі. Цяпер шкадую, што раней іх забіваў». І гэта нягледзячы на тое, што ліса рэгулярна прыходзіць да яго на падворак паласавацца курамі альбо пад'есьці за сабакам Робінам. «Ёй таксама жыць трэба», — кажа гаспадар. Перад самым домам на беразе ракі збудавалі хатку бабры. Атары назірае за імі ў бінокль, увечары ці рана раніцай, калі яны паказваюцца. Радуецца, што бабры зьявіліся, бо іх даўно не было ў рацэ: шмат браканьераў.

З цэнамі за паслугі Лалуа пакуль ня вызначыліся. Атары толькі ведае, што 40—60 грыўняў (16—24 тыс. руб.) у суткі з чалавека каштуе сельскі турызм ва Ўкраіне.

Але перш чым вывешваць цэньнік, трэба прайсьці сэртыфікацыю. Ліцэнзіі на экатурызм у нас пакуль не патрабуецца, нават такога панятку няма ў законе. Але да канца году «заканадаўчую базу» пад яго мусяць падвесьці. Папраўкі ў закон аб турызьме ўжо прынятыя. Іх распрацоўнікі грунтаваліся на заканадаўствах Прыбалтыкі і Польшчы. Там экалягічны турызм не абкладаецца падаткам, калі здаеш ня больш за чатыры пакоі. «Гэта не патрабуе ўкладаньняў ад дзяржавы, але будзе прыносіць прыбытак і спрыяць разьвіцьцю рэгіёну. Турысты, прыехаўшы адпачыць у сельскай сядзібе, прынясуць грошы і раёну. Ва ўсім сьвеце гэта найлепшая магчымасьць прыцягваць грошы ў сельскую мясцовасьць, бо сельгасвытворчасьць стратная», — кажа старшынька Аб'яднаньня агра- і экатурызму Валер'я Кліцунова.

Мо для вёскі Панізоўе энэргія і талент Атарыя Лалуа стануць выратавальным шанцам. Ён зусім не шкадуе, што кінуў працу старшыні. «Ужо б, напэўна, другі інфаркт перажыў, каб застаўся. Я вельмі перажываю, калі што ня так, а ў калгасе шмат маразму». Маразм мы назіраем, вяртаючыся ў Лагойск на гаспадаровым джыпе: на калгасных палетках гарыць салома.

Вераніка Дзядок

«Танна і камфортна» не бывае

У карчме ў цэнтры Прагі піва каштуе менш за 50 цэнтаў, шыкоўная засмажаная сьвіная нага — каля 4 даляраў і г.д. За 5 даляраў можна напіцца і наесьціся на ўвесь дзень. Плюс прымальны ўзровень сэрвісу, пэрсанал разумее па-ангельску. Можна прайсьціся вячэрнім Менскам і пашукаць нешта падобнае. Дадайце патрэбу ў візе, малую вядомасьць краіны, аўтарытарны рэжым, Чарнобыль... Вось чаму аднолькавыя па колькасьці насельніцтва Беларусь і Чэхію наведваюць два і сто мільёнаў чалавек у год адпаведна.

Урад знайшоў новую панацэю, якая мусіць «выцягнуць» вёску і вырашыць эканамічныя праблемы краіны. Гэта турызм, асабліва яго эка- і аграварыянты. Маўляў, так і рвуцца замежнікі з сваіх забруджаных мэгаполісаў у беларускую вёску «танна і камфортна» адпачыць. Ці мае гэта пад сабой падставы? Давайце паразважаем.

Турызм — капіталаёмістая галіна. Заможны іншаземец ня будзе хадзіць у вясковую прыбіральню і бяз душу жыць ня будзе. А зааргранізаваць нармальны побыт ва ўмовах беларускай вёскі — як мінімум 10 тыс. даляраў! Вось чаму многія курорты ў той жа Польшчы належаць немцам ці аўстрыякам: яны маюць неабходныя капіталы, ведаюць, які сэрвіс патрэбны іх суайчыньнікам, як рабіць прамоцыю сваіх паслугаў на патэнцыйных рынках. Таму, каб прыцягнуць сюды замежных турыстаў, трэба было б не дэклярацыі прымаць, а, скажам, здаць возера Нарач у арэнду немцам. Тады б жыхары Нямеччыны хутка даведаліся і дзе Беларусь знаходзіцца, і якія ў нас прыгожыя азёры ды рэдкія птушкі.

Яшчэ адна памылка — рабіць стаўку на турыстаў зь іншых краінаў. Замежны турызм — справа сэзонная, ніводзін курорт ня здолее працаваць бяз сталай плыні айчынных турыстаў.

Краіны з вызначанымі нацыянальнымі адметнасьцямі прыцягваюць значна больш турыстаў. Досьвед разьвіцьця турыстычнай справы ў польскіх Татрах і на Мазурах у параўнаньні з Сылезіяй і Памор'ем пацьвярджае гэтую тэзу. Таму забудзьма пра азёры, якіх у Фінляндыі незьлічоная колькасьць, пра буслоў, бальшыня сусьветнай папуляцыі якіх гняздуецца ў Польшчы, і наперад — чытаць пра Марка Шагала і Ігната Дамэйку, гатаваць стравы зь «Літоўскай гаспадыні» ды варыць крамбамбулю!

Дамінік Міхайловіч

НАВІНЫ

PHOTO.BYMEDIA.NET

Дэпутаты супраць Быкава

Дэпутат Ждановіцкага сельсавету, старшыня БНФ Менскага раёну Юрась Зянковіч прапанаваў пераназваць ждановіцкую вуліцу Камуністычную ў вуліцу імя Васіля Быкава. Спачатку дэпутат спытаў парады ў мясцовых людзей, і тры чвэрці іх сваімі подпісамі пацьвердзілі жаданьне жыць на вуліцы імя Васіля Быкава. Народную хартыю перадалі ў Ждановіцкі сельсавет. 24 верасьня дзесяць дэпутатаў вырашалі — зьявіцца ў Беларусі першая вуліца імя Быкава ці не. «Высокая рада» пайшла насуперак жаданьням жыхароў Камуністычнай: маўляў, каб пераназваць вуліцу, трэба ўсю дакумэнтацыю перарабляць, а гэта дорага... Было прынята рашэньне Камуністычную пакінуць камуністам, а імем Васіля Быкава назваць вуліцу ў новым раёне. Раён той толькі будуецца, вуліца толькі праектуецца.

Ціхан Чарнякевіч

У Горках без брыкету

Жыхары прыватных дамоў у Горках могуць застацца на зіму бяз таннага паліва — брыкету. На кожны прыватны дом належыцца 2,5 тоны торфабрыкету. З агульнага кошту выдаткаў (26 тыс. руб. за тону) 30% аплачвае раённы бюджэт, астатняе — уладальнікі дамоў. Запазычанасьць «Райпалівазбыту» пастаўнікам склала 163 млн рублёў, таму бліжэйшым часам брыкет у Горках прадавацца ня будзе.

Заплянаваных на гэты сэзон бюджэтных 226 млн рублёў хопіць, каб задаволіць патрэбу хіба што 800 гаспадароў. У астатніх ёсьць выбар: самім дамаўляцца з торфабрыкетнымі прадпрыемствамі альбо набываць вугаль па 120 тыс. за тону.

«Региональные ведомости», Горкі

З жыцьця Бабруйску

Сярэдняя адукацыйная школа для габрэйскіх дзетак з адмысловай навучальнай праграмай пачала дзеіць у Бабруйску. У клясах пакуль ня больш за дзесяць вучняў, якіх з усяго гораду зьбірае на заняткі аўтобус.

Каб дзіця стала вучнем школы, бацькам даводзілася пацьвярджаць яго габрэйскае паходжаньне. Пэдагагічны калектыў навучальнай установы — настаўнікі першай і вышэйшай катэгорый, падабраныя на конкурснай аснове.

* * *

З чэрвеня не выплачваюцца заробкі працаўнікам бабруйскага леспрамгасу і прадпрыемства «ФанДАК». Мэблевая фабрыка і фабрыка «Люстэрка» таксама ў сьпісе неплацельшчыкаў.

* * *

Міністар гандлю Аляксандар Кулічкоў правёў у Бабруйску прыём па асабістых пытаньнях. Аднак ахвотных скарыстацца з выпадку аказалася няшмат. На прыём да міністра прыйшоў толькі адзін чалавек.

Данута Чыгір, Бабруйск

Урбан Алін: «Швэцыя магла б быць для вас прыкладам»

На радзіме Урбана Аліна клічуць «містэр Беларусь» за цікаўнасьць да нашай краіны. Ён старшыня камісіі па замежнай палітыцы швэдзкага Рыксдагу і сябар працоўнай групы Парлямэнцкай Асамблеі АБСЭ па Беларусі. З Урбанам Алінам гутарыць карэспандэнтка «НН».

WWW.RIKSDAGEN.SE

Урбан Алін: Тая сытуацыя, якая цяпер склалася ў Беларусі, ня можа існаваць доўга. Хутка Беларусь стане суседкай ЭЗ, таму Эўропа павінна больш цікавіцца вашай краінай. З гэтага я зыходжу ў сваёй працы. Дый сама Беларусь мне падабаецца: прырода, людзі... Гэта цяжка вытлумачыць словамі. Мяркую нават калі-небудзь набыць невялічкую хатку ля возера ў паўночнай Беларусі.

— Чым выкліканая стабільная цікавасьць швэдзкіх палітыкаў да беларускіх справаў?

У.А.: Мы заўсёды лічылі, што дэмакратычныя адносіны — адзіна магчымы шлях да мірнага суіснаваньня краін у міжнароднай сыстэме. Найбольшую цікавасьць да вашай краіны выяўляюць швэдзкія сацыял-дэмакраты. Многія з уласнае ініцыятывы пачалі распаўсюджваць інфармацыю пра падзеі ў Беларусі, актыўна рэагаваць на сытуацыю ў вашай краіне.

— Якія Вы можаце правесьці паралелі паміж Беларусяй і Швэцыяй?

У.А.: Нашыя краіны прыкладна аднолькавага памеру; абедзьве маюць добра адукаванае насельніцтва; і швэды, і беларусы моцна сацыяльна арыентаваныя. Швэцыя магла б стацца для вас прыкладам сацыяльна арыентаванай дзяржавы з дынамічнай рынкавай эканомікай. Падчас візытаў у Беларусь мне давялося абвяргаць няслушную інфармацыю пра сваю краіну, асабліва ў лібэральных колах. Многія лічаць, што ў нас амаль сацыялістычная эканоміка, і звычайна зьдзіўляюцца, калі я кажу, што мы маем вялікі рынкавы сэктар. Беларусь магла б разьвівацца паводле швэдзкай мадэлі.

Лукашэнка нягнуткі і прадказальны

— Ці патрэбная Беларусь Эўропе?

У.А.: Не. Гэта добра відаць з амаль поўнай адсутнасьці інтарэсу да Беларусі з боку эўрапейскіх краінаў.

— Чаму так?

У.А.: Вашая дзяржава досыць малая, яна ня мае ні вялікага геапалітычнага значэньня, ні вялікага рынку, як Расея. Калі Беларусь хоча мець сваё месца ў Эўропе, яна сама мусіць яго знайсьці і даказаць на яго сваё права. Адзінае, чым у будучыні Беларусь можа зацікавіць Эўропу, дык гэта танная працоўная сіла. Беларускія прадпрыемствы могуць вырабляць сваю прадукцыю, але збываць яе яны будуць там, дзе людзі ня могуць дазволіць сабе прадукцыю заходніх фірмаў. Яшчэ Эўропа зацікаўленая ва ўсталяваньні ў Беларусі дэмакратыі, маніторынгу правоў чалавека ды стварэньні спрыяльнага клімату для разьвіцьця эканомікі й інвэстыцыяў.

— Якім чынам Эўропа можа паспрыяць усталяваньню дэмакратыі ў Беларусі?

У.А.: Гуляючы з Лукашэнкам. І мы можам перайграць яго, бо Лукашэнка вельмі нягнуткі ў сваіх дзеяньнях. Няцяжка прадказваць ягоныя наступныя крокі ды іх вынікі. Напрыклад, увяла Эўропа забарону на паездкі беларускіх урадоўцаў — і гэта дало плён. Мы можам абнародаваць інфармацыю пра тое, што ў Беларусі навучаліся ірацкія афіцэры; пра тое, што Расея, магчыма, прадае зброю праз беларускія фірмы. Мы можам дасьледаваць рахункі прэзыдэнта ў заходніх банках. Гэта будзе пэўным ціскам на рэжым Лукашэнкі й можа выклікаць зьмены ў краіне.

— Якія сілы, на Ваш погляд, маюць наймацнейшую праэўрапейскую арыентацыю ў Беларусі?

У.А.: Гэта насельніцтва. Людзі разумеюць, што эўрапейская мадэль разьвіцьця можа ім больш прапанаваць, чым Расея ці СНД.

— Калі так, да якой Эўропы мае імкнуцца Беларусь? Што для Вас Эўропа?

У.А.: Для мяне гэта перш за ўсё кантынэнт, насельніцтва якога падзяляе агульныя каштоўнасьці. Сярод іх — дынамічная рынкавая эканоміка, павага да правоў чалавека і грамадзянскіх правоў, сацыяльна арыентаваная дзяржава, дзе ўсе грамадзяне маюць роўныя магчымасьці. Менавіта ў гэтым я бачу розьніцу паміж Эўропай і Злучанымі Штатамі. Геаграфічна мая Эўропа ўключае Беларусь, Украіну, Малдову, Турцыю і ўсе рэспублікі былога Савецкага Саюзу. Пытаньні выклікае толькі ўдзел Расеі, з прычыны яе памеру. Але і Расеі нельга цалкам адмаўляць.

Кажуць, што пашырэньне Зьвязу, якое хутка мае адбыцца, — апошняе. Але я так ня думаю. Як толькі Беларусь здолее выканаць усе патрабаваньні ЭЗ, Эўропа прывітае Беларусь у сваіх шэрагах.

Адукацыя ўсё жыцьцё

— Якім Вы бачыце далейшае разьвіцьцё краіны?

У.А.: Краіна спрабуе ізалявацца ад працэсаў, якія адбываюцца вакол яе. Але вашыя палітыкі мусяць зразумець, што гэта няправільны шлях. Сьвет глябалізуецца, і вяртаньня назад няма. Спыніць глябалізацыю нельга, можна толькі прайграць, калі працягваць ізалявацца ад сьвету.

Працэс глябалізацыі азначае, што кожная эўрапейская краіна мусіць змагацца за сваё месца на глябальным рынку, як гэта робяць фірмы. Роля ж Эўропы — у пашырэньні ідэі сацыяльна арыентаванай дзяржавы, якая выпраўляе несправядлівасьці жорсткага рынку. Але, паўтаруся, сацыяльная арыентацыя найперш азначае аднолькавыя магчымасьці для дасягненьня посьпеху. У Швэцыі гэтая ідэя выяўляецца цяпер у канцэпцыі «Адукацыя ўсё жыцьцё». Яна дазваляе людзям увесь час паднаўляць свае веды, каб не гублялцца ў рынкавых адносінах.

— Вы кажаце — глябалізацыя, але ж у Беларусі свая культурная спэцыфіка.

У.А.: Я ня бачу ніякай асаблівай спэцыфікі Беларусі. Адзіная адметнасьць, як і ў іншых краінаў рэгіёну, — асобная культура, гісторыя, мова, якія дадаюць калярыту эўрапейскаму калейдаскопу. У астатнім Беларусь — звычайная постсавецкая краіна на шляху разьвіцьця. Толькі некаторыя краіны разьвіваюцца хутчэй, некаторыя павольней. Беларусь належыць да апошняй катэгорыі, куды ўваходзяць краіны, у якіх яшчэ не завяршыўся працэс дзяржаўнага фармаваньня. І атрыбуты дзяржаўнасьці паўстаюць паралельна з эканамічным разьвіцьцём.

— Што мусіць рабіць беларуская грамадзянская супольнасьць, каб наблізіць уступленьне краіны ў ЭЗ?

У.А.: Глядзець, як іншыя краіны спраўляюцца зь пераходным пэрыядам, аналізаваць іх мэтады і выбіраць найлепшыя шляхі для сябе. Шмат працаваць, спадзявацца на сябе, актыўна паляпшаць уласнае становішча. Бо ніхто акрамя вас гэтага ня зробіць. У мяне часам зьяўляецца адчуваньне, што беларускія палітыкі — як з улады, так і з апазыцыі — чакаюць, калі Эўропа зробіць справу за іх. Але ўсё ў вашых руках.

Улада і апазыцыя ў тупіку

— Якія асноўныя праблемы сёньняшняй Беларусі вам бачацца?

У.А.: Галоўная праблема — кіраваньне Лукашэнкі ды цеснага кола яго дарадцаў. У адрозьненьне ад многіх іншых постсавецкіх краінаў, усё жыцьцё ў Беларусі завязанае на прэзыдэнце і ягоных людзях. А тыя не жадаюць пераменаў, бо гэта будзе азначаць страту ўлады. Але яны разумеюць, што доўга так цягнуцца ня можа, асабліва ў эканамічным сэктары. Абодва бакі ў тупіку. Бо апазыцыйныя палітыкі ня маюць яснай праграмы рэформаў і шляху да пераменаў. Людзі баяцца прыватызацыі, у выніку якой большая частка маёмасьці пяройдзе да алігархаў. Магчыма, замест польскага ці расейскага шляху Беларусь можа выбраць чэскі: перад прыватызацыяй стварыць умовы для разьвіцьця прыватнага сэктару. Людзі зь вялікіх дзяржаўных прадпрыемстваў пойдуць туды працаваць, і закрыцьцё фабрык ды заводаў ня выкліча вялікага сацыяльнага зруху.

— Самая адыёзная зьява ў палітычнай сыстэме Беларусі — гэта...

У.А.: Зьнікненьне палітыкаў. Такое Эўропа ня ў стане ні зразумець, ні прыняць. Кіраўніцтва краіны, калі яно хоча палепшыць міжнародныя адносіны, мусіць давесьці сьвету, што ня мае да гэтага дачыненьня. У эўрапейскай традыцыі гвалт як мэтад палітычнай барацьбы выключаны.

Другая пачварная зьява — уціск свабоды прэсы. Вольнае распаўсюджваньне інфармацыі — ня толькі фундамэнтальнае права грамадзяніна. Гэта інтэрас грамадзтва. Чым лепш грамадзтва інфармаванае, тым больш асэнсаваны выбар яно можа зрабіць. На жаль, цяпер дзяржава аддзеленая ад грамадзтва і дзейнічае супраць яго інтарэсаў. Грамадзтва мусіць дарасьці да разуменьня, што ўрад існуе для народу, а не наадварот. І патрабаваць ад уладаў справаздачы.

Трэці адыёзны элемэнт — парушэньне правоў чалавека. Гэтаму супрацьстаіць АБСЭ. Але падкрэсьлю, што перш за ўсё само грамадзтва мусіць выяўляць актыўнасьць.

— Якімі элемэнтамі палітычнага жыцьця разьвітыя дэмакратычныя дзяржавы розьняцца ад «пачаткоўцаў»?

У.А.: Асноўнае адрозьненьне — у цесным пераплятаньні палітыкі і бізнэсу. Калі я сустракаю парлямэнтароў з новых дэмакратыяў, яны заўсёды пытаюцца: якім бізнэсам займаюся я? Тыя бізнэсоўцы ідуць у палітыку, каб наладзіць кантакты для сваёй будучай дзейнасьці. А для мяне палітыка — гэта праца сама ў сабе, а не факультатыўны занятак.

Гутарыла Аліна Бельская,
Стакгольм—Хельсынкі

НАВІНЫ

Латвія — у Эўразьвязе

За далучэньне да ЭЗ у суботу прагаласавалі 67% латышоў. Трэці сусед Беларусі далучаецца да Эўразьвязу. Найбольш галасоў супраць ЭЗ у Латвіі паступіла зь мясцовасьцяў, дзе пераважаюць расейскамоўныя жыхары: у Дзьвінску супраць галасавалі 67%, у Рэжыцы — 55%.

Варонін гатовы выйсьці з СНД

Прэзыдэнт Малдовы не выключае, што ягоная краіна можа выйсьці з СНД і дамагацца цясьнейшай інтэграцыі з Эўразьвязам. На думку Ўладзімера Вароніна, прэзыдэнты чатырох краін, падпісваючы ялцінскія пагадненьні, не ўлічылі інтарэсаў іншых дзяржаў Садружнасьці.

Залаты маёнтак

Выстаўлены самы вялікі ў гісторыі пазоў былога жыхара «ўсходніх крэсаў» да польскай дзяржавы. Нашчадкі магнатаў Браніцкіх дамагаюцца кампэнсацыі 150 млн злотых (каля 80 млрд руб.) за маёнтак, пакінуты пад Ваўкавыскам у 1939-м. Справу разгледзіць кракаўскі суд.

Судзьдзі супраць Бэрлюсконі

Італьянскія судзьдзі ў мінулы чацьвер правялі сымбалічную 15-хвілінную акцыю пратэсту супраць нападак прэм'ер-міністра Сыльвіё Бэрлюсконі. Усе працэсы перапынілі і ўслых зачыталі заяву з асуджэньнем прэм'ера, які называў судзьдзяў «пухлінай, якую трэба выдаліць».

СП; БелаПАН, «Gazeta Wyborcza»,

Пошта губляе лісты

У Польшчы штогод губляецца каля трох мільёнаў лістоў. Але, як кажуць паштавікі, гэта няшмат, бо агульная колькасьць лістоў, што перасылае пошта цягам году, — мільярд. А тры мільёны ад мільярда — гэта ўсяго 0,3%. Слабое суцяшэньне для тых трох мільёнаў палякаў, што не атрымалі доўгачаканых капэртаў!

Палякі меней вандруюць

Да канца году ў Польшчы могуць збанкрутаваць каля 400 турыстычных фірмаў (больш за 200 ужо зьніклі). Галоўныя прычыны зьніжэньня турыстычнай актыўнасьці палякаў — вайна ў Іраку і на Блізкім Усходзе, SARS, а таксама жаданьне ва ўмовах эканамічнага спаду мець грошы «на чорны дзень».

Аборты ці забойствы

Польская паліцыя шукала маці пяцярых немаўлятаў, целы якіх былі знойдзеныя ў бочцы ў падвале аднаго з дамоў пад Люблінам. Гаспадар хаты Анджэй К. сказаў, што ягоная жонка, Іялянта К., сышла з хаты і ўжо некалькі дзён не вяртаецца. У выніку дасьледаваньняў ДНК высьветлілася, што Анджэй і Іялянта К. зьяўляюцца бацькамі дзетак, забітых і схаваных у бочцы. Ад пачатку году ў Польшчы знойдзеныя некалькі такіх жахлівых пахаваньняў.

Гэта сталася нагодай для ўзнаўленьня дыскусіі ў справе легалізацыі абортаў. Цяпер польская жанчына можа зрабіць аборт у выпадку, калі роды пагражаюць яе здароўю, калі пашкоджаны плод і калі цяжарнасьць сталася вынікам гвалту (гэта трэба давесьці ў судзе). Летась у амаль саракамільённай Польшчы было афіцыйна зроблена ня болей за паўтары сотні абортаў, а неафіцыйна — да 200 тыс.

У гэтай справе полькі едуць у Калінінград, Украіну, Беларусь.

Посткамуністы, якія кіруюць цяпер у Польшчы, у сваіх перадвыбарчых праграмах абяцалі зьвярнуцца да лібэралізацыі закону аб плянаваньні сям'і. Аднак жаданьне не сварыцца з каталіцкай царквой аказалася мацнейшым.

АДз, Варшава

Малы Бот Эўропы

КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

«Вы — венгр?» — па-змоўніцку гледзячы мне ў вочы, спытаў мой украінскі спадарожнік. Два мужыкі, якія сядзелі ля акна ў вагоне цягніка «Менск—Львоў», павольна ўтаропілі ў мяне свае нерухомыя зрэнкі. Я адразу адчуў сябе нібы макака ў беларускай пушчы, але здолеў абыякавым тонам прамовіць: «Не-е. Я проста еду ў Вугоршчыну на футбол...»

Пад'яжджаючы да Кіева, я ўзгадаў гэтую леташнюю гісторыю. Дзякуй вышнім сілам, цяпер ніхто не нахіляўся да мяне і, атакуючы мой кірпаты нос водарам «Пярцовай» ці «Sergio Tacchini Donna», не пытаўся: «Вы — малдаванін?» Бо гэтым разам канчатковай мэтай майго падарожжа была Малдова. Краіна, падобная шмат чым да Італіі: і цёплымі стасункамі зь віном, і ня так даўно набытым — няхай сабе праз Дунай! — выхадам да мора. Падобная і моваю — адзін знаёмы малдаванін пераконваў, што выдатна разумее італьянцаў. Пад уплывам гэтых параўнаньняў ты глядзіш на пакручастую лінію малдаўскай мяжы на сваёй завэдзганай падарожнай мапе і ў думках ахрышчваеш тэрыторыю ад Сарокаў да Кагулу й ад Унгенаў да Цігіны Малым Ботам Эўропы...

Кідаю пагляд у акно ды пазнаю кіеўскі мікрараён Дарніцу, дзе два з паловай гады таму мы — беларускія заўзятары — начавалі ў гатэлі МУС Украіны. З тае нашае дружнае шасьцёркі хтосьці сядзіць у Штатах, хтосьці зарабляе грошы на радзіме; я еду адзін.

Калі ў Менску вы папросіце ў краме марозіва з макам ды каноплямі, то на вас, як мінімум, паглядзяць, як на ідыёта. У Кіеве зь вялікай імавернасьцю вам адкажуць: «Адно ці два?..» Мак у тым марозіве і сапраўды ёсьць, а вось заміж канабісу густа насыпана зерняў кунжуту, якога хоць тону зжары — патрэбнага эфэкту ня будзе.

«Мне, калі ласка, гэтага супцу, — я тыцкаю пальцам у вітрыну кітайскай кавярні хуткага харчаваньня. — Што гэта, дарэчы?» — «Боршч», — ніякавее за прылаўкам прыгожая дзяўчына. «Кітайскі?!» — перапытваю. «Украінскі», — сканфужана, але зь мяккім дакорам кажа яна. «Давайце», — уздыхаю я, а ў галаве мільгае думка, што спалучэньне бульбы Ла Чао ды ўкраінскага баршчу са сьмятанай будзе зусім няшкодным для майго выпрабаванага арганізму.

Інтэграцыя страваў адбылася гладка ды бяз шуму, і я шчасьліва заснуў праз некалькі гадзінаў у адэскім цягніку. Сьнілася мне ўкраінска-малдаўская мяжа. Пасьля я з жахам зразумею, што такое мяжы перасекчы мне гэтым разам не наканавана. Але сьпярша прайдуся па Малой Арнаўцкай ды Дзерыбасаўскай, зазірну ў вочы мэталёваму герцагу дэ Рышэлье, памачу пяты ў халаднаватым моры ды запхну сябе ў смуродны аўтобус Адэса—Кішынёў—Аргей, які з хуткасьцю стомленай жаўлы пацягнецца ў свой нялёгкі шлях.

Украінскія памежнікі праверылі пашпарты ды прапусьцілі наш «Ікарус». І тут я ўбачыў нешта надзвычай знаёмае: чырвона-зялёную шыльду і надпіс... Прыднястроўская Малдаўская Рэспубліка. У салён заходзіць дзядзька ў камуфляжы і абвяшчае, што ўсе грамадзяне без прыднястроўскае прапіскі мусяць сплаціць па паўдаляра за транзыт. Я плачу, а прыднястроўскі памежнік выводзіць на талёнчыку «Арлоу Б.» Стаім дастаткова доўга, пакуль расчараваныя мытнікі, не знайшоўшы ў нас аніводнае гранаты ці хаця б якога кілограмчыка дынаміту, не адпускаюць аўтобус у аплачаны ды цалкам легальны транзыт па прыднястроўскай дзяржаве. Дзяржаве спадара Сьмірнова, былога — так казаў малдаванін Юра — крымінальніка, які цяпер трымае пасаду прэзыдэнта ПМР ды ўвесь бізнэс у пяці сваіх гарадах. Бізнэс ягоны называецца «Шэрыф». Гэта ўсё ад апошняга кіёску на левым беразе Днястра-Ціраса да ультрасучаснага спарткомплексу ў Ціраспалі. Цалкам кантраляваць нібыта не ўдаецца толькі каньячны завод «Квінт». Каменка, Рыбніца, Дубасары, Ціраспаль ды адзіны горад на правым беразе — Бэндэр (Цігіна) — вось тэрыторыя Сьмірнова ды Суворава. Расейскі палкаводзец намаляваны на кожнай купюры прыднястроўскіх рублёў, у два разы даражэйшых за малдаўскія леі.

Ля мосту цераз Днестар вока спатыкаецца на камуфляжнай сетачцы, пад якой ціхенька хаваецца БМП. Пасьля гэтага кулямётнае гняздо, абкладзенае мяшкамі зь пяском, супрацьтанкавы «вожык» на ўзбочыне ды «калашы» ў руках малайцоў колеру хакі падаюцца нармальнай зьявай.

На прыпынку ў Бэндэры-Цігіне ў салён заходзіць бабулька і... пачынае жаліцца на «перастройку». Перастройка забрала ўсе грошы, памажыце ўкраінскімі грыўнямі ці малдаўскімі леямі. Я ўмомант выдумляю сам сабе правіла: не падаваць болей за адзін раз у дзень. Адэскі дзядок мне шапнуў: «Удачы», — і ні слова пра «перастройку».

Калі табе пажадалі ўдачы ў Адэсе — яна прыйдзе... У кішынёўскім гатэлі для артыстаў цырку — чамусьці менавіта туды на старой «Волзе» прывёз маю сьціплую пэрсону таксіст — адміністратарка доўга прыглядалася да мяне, а найболей да латак у самых экзатычных месцах на маіх штанах. Спачатку нумар каштаваў 10 даляраў, пасьля ў чатыры разы патаньнеў. Я ўслых падзякаваў адміністратарцы, у думках — дзядулю ды пайшоў у свой пакой выграбаць з ложка мёртвых прусакоў.

Наколькі нецікавая сталіца Малдовы архітэктураю, настолькі займальная яна вулічнымі замалёўкамі. Стаю ля аблупленай сьцяны, на адным яе краі пачынаецца сакрамэнтальнае «Ленин жил...». На гэтым фраза абрываецца, а замест працягу вісіць абвестка «Приму на квартиру 2-х ребят»... Праз колькі кварталаў бачу жанчыну, якая сядзіць на скрыні, трымаючы перад сабою бутэлькі зь нейкай вадкасьцю ды колькі шклянак. «Што гэта ў вас?» — пытаюся. «Каньячны сьпірт, 50 грамаў — 1 лей. Мацунак — 40°». Скажыце, вы калі-небудзь куплялі на менскай вуліцы шклянку каньяку за 150 рублёў? А езьдзілі на таксі 70 кілямэтраў за 8 даляраў? А елі пэрсыкі па 350 руб. за кілю?..

Назаўтра ў цягніку Кішынёў—Санкт-Пецярбург мой спадарожнік-расеец будзе імкнуцца з захапленьнем расказаць мне, як Расея кагосьці там перамагла ў футбол. На наступны дзень ён будзе ціха-ціха чытаць кніжку, я ж буду размаўляць з суседам-малдоўцам. Той, частуючыся разынкамі ды гледзячы на ўсё тую ж мапу Эўропы, будзе баяць пра тое, што гагаузы любяць вырошчваць тытунь, што ля белай скалы ў Сароках жылі гайдукі, што на поўначы Малдовы кепска расьце вінаград, што сам ён ня хутка вернецца дадому ў Кагул зь Піцеру. Будзе павольна праводзіць пальцам па мапе ад Малога Боту да Нямеччыны ды расказваць пра таварышаў. Ровары, лясныя сьцежкі, адсутнасьць візаў, у заплечніках — выключна ежа. Тры тыдні шляху ў парабкі да баўэраў — зарабіць грошай ды вярнуцца дадому машынай, з купленым за 700 вашынгтонаў румынскім пашпартам у кішэні.

Ты намацваеш у пляцаку свой беларускі ды адчуваеш нейкую незразумелую падступную радасьць ад таго, што Малдова забіла на адзін мяч болей. Ня дзіва: яна ж — Малы Бот Эўропы, вельмі падобны да Італіі.

Багдан Арлоў,
Менск—Кіеў—Адэса—Кішынёў—Ціраспаль—Менск

ЭЎРАІНТЭГРАЦЫЯ: ПОЛЬСКІ ДОСЬВЕД

Камэнтары пасьля рэфэрэндуму

Агульнапольскі рэфэрэндум у справе далучэньня краіны да ЭЗ адбыўся 7—8 чэрвеня 2003 г. Яўка склала 58,85% ад правамоцных галасаваць. 77,45% удзельнікаў выказаліся за ўступленьне Польшчы ў Эўразьвяз. Супраць былі 22,55%.

Падчас урачыстага абвяшчэньня вынікаў прэзыдэнт Польшчы Аляксандар Квасьнеўскі падзякаваў усім, хто выканаў свой грамадзянскі абавязак, — ці яны галасавалі за далучэньне да Эўразьвязу, ці супраць. Паводле прэзыдэнта, вынік эўразьвязаўскага рэфэрэндуму сьведчыць пра тое, што палякі дарасьлі да дэмакратыі.

А вось як выказваліся палітыкі, каталіцкія гіерархі, грамадзкія дзеячы — як прыхільнікі, так і праціўнікі далучэньня краіны да эўрапейскіх структураў.

«Польшча патрабуе Эўропы», — заявіў **Ян Павал II** падчас сустрэчы з польскімі паломнікамі на рымскім Пляцы Сьвятога Пятра. Галава каталіцкага Касьцёлу заклікаў палякаў да інтэграцыі. Папа адзначыў, што далучэньне Польшчы да эўраструктураў зьяўляецца доказам гістарычнай справядлівасьці, а таксама актам узбагачэньня Эўропы. Гэтыя словы ён казаў за два тыдні да рэфэрэндуму.

8 чэрвеня, камэнтуючы вынікі галасаваньня, прэм'ер **Лешак Мілер** казаў, што ганарыцца палякамі: «Мы ўносім у Эўропу вялікі польскі патэнцыял, гонар нашай нацыі, кваліфікаванасьць грамадзянаў, наш запал да працы. Усё гэта мы будзем разьвіваць, каб у Польшчы жылося лепш, каб было менш праблемаў і каб мы маглі будаваць станоўчую супольную будучыню».

Радасьць палякаў падзялялі й суседзі. Прэм'ер Чэхіі **Ўладзімер Шпідла** сьцьвярджаў: вынік галасаваньня сьведчыць пра тое, што Польшча — гэта частка Эўропы: «Гэткі вынік рэфэрэндуму зьяўляецца наступствам сур'ёзнай зацікаўленасьці ўсяго польскага народу». Чэхія тады таксама рыхтавалася да эўразьвязаўскага рэфэрэндуму, які адбыўся 13—14 чэрвеня і скончыўся перамогай «за».

Былога польскага прэм'ера **Ежы Бузака** ў сувязі з рэфэрэндумам непакоіла іншае. Вынік галасаваньня сьведчыць, што многія палякі расчараваныя дзейнасьцю палітыкаў: «Палова палякаў альбо ня ўдзельнічалі ў рэфэрэндуме, альбо прагаласавалі «не». Гэта павінна выклікаць адпаведную рэфлексію. Цяпер мы ўсе, нават тыя, хто выказаўся супраць інтэграцыі з ЭЗ, далучаемся да эўрапейскіх структураў, і мы павінны супольна змагацца і аднолькава ўяўляць сабе будучыню».

На думку пісьменьніка, палітыка і шматгадовага дырэктара польскай рэдакцыі радыё «Свабодная Эўропа» **Яна Новака-Езяраньскага**, рэфэрэндум адкрыў новыя магчымасьці разьвіцьця Польшчы: «Далучэньне да найбольшага супольнага рынку збыту дае магчымасьць выйсьці з дэпрэсіі, у якой краіна знаходзіцца ад часу падзелаў. Гэта рэалізацыя апошняга этапу мараў: свабода, дэмакратыя, дабрабыт. Яшчэ некалькі дзясяткаў гадоў таму ніхто не паверыў бы, што Польшча апынецца перад гэткай гістарычнай магчымасьцю».

У сваю чаргу лідэр нацыянал-каталіцкай Лігі польскіх сем'яў **Раман Гертых** дзякаваў усім, хто падчас рэфэрэндуму выказаўся супраць эўраінтэграцыі. Раман Гертых падкрэсьліў, што гэткае рашэньне людзям было вельмі цяжка прыняць: «Была аглушальная прапаганда, якая заняла 99% часу ў дзяржаўных і прыватных электронных СМІ. Сёньня сказаць «не» было вельмі цяжка. Аднак гэта зрабілі каля чатырох мільёнаў людзей».

«Цяпер мы павінны прысьпешыць заканатворчую працу і добра падрыхтавацца да выбараў у Эўрапарлямэнт. Каб Польшчу ў гэтай структуры прадстаўлялі вартыя дэпутаты», — кажа **Ян Кулакоўскі,** першы польскі прадстаўнік на перамовах пра ўступленьне краіны ў Эўразьвяз.

Цяпер перад Польшчай стаяць наступныя заданьні. Напрыклад, падрыхтоўка да эфэктыўнага выкарыстаньня эўрапейскіх сродкаў дапамогі.

Падрыхтавала Ганна Дамбкоўская,
Беларуская служба радыё «Палёнія»

26 верасьня пятніца

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 14.05, 23.45 Мая краіна.
9.05 Маст. фільм «Супраць плыні».
11.05 «Што сказаў нябожчык?». Сэрыял.
12.10 Камэдыя «Ас з асаў».
14.15 Чэмпіянат сьвету па мастацкай гімнастыцы. Відэаагляд.
15.10 «Маскі-шоў».
15.30 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «5х5».
17.05 «Масква — Менск».
17.15 «Хіты 80-х». Канцэрт вакальна-інструмэнтальных ансамбляў «Арэра», «Синяя птица», «Поющие сердца», «Самоцветы».
19.05 Камэдыя «Самалет ляціць у Расею».
20.50 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.40 «Спэцыяльны рэпартаж». «Аўгустоўскі канал. Паміж Віслай і Нёманам».
21.50 Маст. фільм «Уцякач».
23.55 Маст. фільм «Вуліцы асалоды».

● СТВ

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.40 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00, 18.20 «Менск і менчукі».
8.10, 23.00 «Тэхналёгія».
8.20 Маст. фільм «Снайпэр у горадзе».
10.05, 14.45 «Хіт-момант. Вынікі месяца».
10.20, 20.35 «Аўтапанарама».
10.35 «Тэатральныя гісторыі».
10.50 «Тайна асуджаных самалётаў». Дак. фільм.
11.25 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Сусьветныя розыгрышы».
13.50, 18.35 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
16.20 Драма «Расейскія бабы».
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Камэдыя «Найлепшы сябар».
23.10 «Навіны СНД».
23.25 «Хіт-момант. Прэм'ер-выпуск».
23.50 Баявік «Тайна затанулага самалёта».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.30 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Сэрыял «Два лёсы».
10.45 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
15.00 «Горад жанчын».
15.45, 22.10 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары». 20-я сэрыя.
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
21.05 «Поле цудаў».
23.45 IX урачыстая цырымонія ўручэньня нацыянальнай тэлевізійнай прэміі «ТЭФІ-2003».

● РТР

7.45 Сэрыял «Каменская-2. За ўсё трэба плаціць».
8.50 Аншляг.
9.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.05 «Другая палова».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Народны артыст.
20.50 «Кубак гумару». У перапынку: Вынікі галасаваньня «Народны артыст — Ваш выбар!»

● Культура

15.00 «Плён асьветы». «Гутаркі пра расейскую культуру».
15.45 «Сёньня прэм'ера». Дак. фільм.
16.45 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
17.30 Навіны культуры.
17.45 «Да Франкфурцкага кніжнага кірмашу».
17.55 «Краканош». Мультфільм.
18.10 «Алаў». Дак. фільм.
19.00 «Бег». Маст. фільм.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Хто там...».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Без рэцэпту».
10.05 Фактар страху.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 «Іх норавы».
17.25 «Нацыянальнае бясьпека: стэпавае права шахматнай рэспублікі».
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Маст. фільм «Паліцэйскі».
22.25 Супэрбокс: Дэрык Гейнэр супраць Оскара Леона.

● Эўраспорт

9.30 Конны спорт. Мастэрз. Паўтор.
10.30 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
11.00 Пляжны валейбол. ЗША. Паўтор.
11.30 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Турцыя—Германія. Турцыя.
13.00 Тэніс. АТР. Чвэрцьфінал. Палерма. Жывая трансьляцыя.
14.30 Футбол. Кубак УЭФА.
15.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 18-ы этап. Паўтор.
16.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 19-ы этап. Жывая трансьляцыя.
19.00 Пляжны валейбол. ЗША. Паўтор.
19.30 Тэніс. WTA. Ляйпцыг. Жывая трансьляцыя.
21.00 «Формула». Аўтачасопіс.
21.30 «Супэргоначны ўік-энд». Аўтачасопіс.
22.45 «Самы дужы чалавек». Сусьветны рэкорд.
0.00 «Сэрыі». Аўтачасопіс.
0.30 Аўтагонкі. Сьпілбэрг.
1.00 Экстрэмальныя віды спорту.

27 верасьня субота

● БТ

7.35 «Спэцыяльны рэпартаж». «Аўгустоўскі канал. Паміж Віслай і Нёманам».
7.45, 18.30 Мая краіна.
8.00 «Існасьць». Духоўная праграма.
8.25 Слова мітрапаліта Філарэта на сьвята Ўзьвіжаньня жыватворнага крыжа гасподняга.
8.35 «36,6».
9.00, 12.00, 15.00, 21.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства-2».
10.00 «Усё нармальна, мама!».
10.45 «Шпілька». Тэлечасопіс для жанчын.
11.10 Мэлядрама «Ясенія».
13.30 «Кропка». Музычна-забаўляльная праграма для моладзі.
14.10 Дак. сэрыял «На прыродзе з Стэфанам Пэйранам».
15.05 Футбол. Адборачны турнір чэмпіянату Эўропы-2004 сярод юначых каманд. Відэаагляд.
15.50 Маст. фільм «Сталкер».
18.45 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
19.25 Камэдыя «Старыя-разбойнікі».
21.15 «Вакол плянэты».
21.45 Маст. фільм «Банды Нью-Йорку».
0.25 Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат сьвету. Відэаагляд.

● СТВ

7.30 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.55 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.20 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.45 Маст. фільм «Госьць з будучыні». 5-я сэрыя.
9.55, 19.55 «СТВ-спорт».
10.05 «Рэактыўны бокс».
10.20 Дак. фільм «Жывыя сьведкі ледавікоў».
11.00 «Анфас».
11.15 «Разам».
11.45 «Партрэт у інтэр'еры».
12.00, 0.30 «Срэбранае вясельле». Тэлесэрыял. 1-я сэрыя.
13.05 Камэдыя «За двума зайцамі».
14.50 «Дружная сямейка».
16.00 «Клясыка гумару».
17.05 «Канал гісторыі»: «Работы, пра якія можна толькі марыць». Дак. фільм.
18.50 Камэдыя «Гульня ў чатыры рукі».
19.30 «24 гадзіны».
20.10 Мэлядрама «Восень у Нью-Ёрку».
22.05 «Навіны СНД».
22.20 «Арт-хаўз»: «Чэхаўскія матывы».

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Грай, гармонік любы!
8.55 Слова пастыра.
9.10 Здароўе.
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Вяртаньне дадому».
11.10 «Падарожжы натураліста».
11.40 «Ералаш».
12.10 «Гісторыя з геаграфіяй». «Цуды сьвету».
13.05 Прэм'ера. «Пярэстая стужка».
14.00 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.25 «Ералаш».
14.40 «Вялікія бацькі».
15.10 Маст. фільм «Іншаплянэцянін».
17.00 «Каханьне Чапая». Дак. фільм.
17.55 Камэдыя «Ўсе ў захапленьні ад Мэры».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.00 «Розыгрыш».
23.20 «Залаты грамафон».
0.20 Баявік «Рабакоп».

● РТР

9.20 «Не сумуй!».
10.20 Сам сабе рэжысэр.
11.15 «Круты маршрут».
12.15 Клюб сэнатараў.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Да Чорнага мора».
14.45 «ХА». Маленькія камэдыі.
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Растоў» (Растоў-на-Доне) — ЦСКА. Жывая трансьляцыя з Растова-на-Доне.
17.00 «Кубак гумару».
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.20 Аншляг.
21.15 Сусьветнае кіно. Маст. фільм «Сонная лагчына».

● Культура

11.45 ГЭГ.
12.00 «Ішоў сабака па раялі». Маст. фільм.
13.05 «Салдацкі каптан». Мультфільм.
13.20 «Навука: стратэгія прарыву». «Адукацыя».
13.50 «Партытуры не гараць».
14.15 «Зьяўленьне Майстра».
14.55 «Гісторыя каня». Тэлевэрсія спэктаклю.
17.05 «Загадкі Н.Ф.І. і іншыя вусныя аповеды Іраклія Андронікава». Дак. фільм.
18.10 «Адкрыцьцё Міжнароднага дому музыкі». Першы выступ Нацыянальнага філярманічнага аркестру Расеі.
20.30 Сьмеханастальгія.
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.45 Маст. фільм «Ноч у Варэне».

● НТВ

9.00 Кулінарны паядынак.
9.55 Кватэрнае пытаньне.
10.50 Спорт «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 «Дзікі сьвет».
12.00 Дэтэктыў «Пярсьцёнак з Амстэрдаму».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
15.55 Сэрыял «Агент нацыянальнай бясьпекі-3: гульня».
17.05 «Найноўшая гісторыя: вайна ў шклянцы». 2-я сэрыя.
18.00 «Асабісты ўнёсак».
19.00 Баявік «Варашылаўскі стралок».
21.10 Маст. фільм «Аднойчы на Дзікім Захадзе».
0.25 Начныя музы.

● Эўраспорт

9.30 Футбол. Кубак УЭФА. Спэцыяльны агляд. Паўтор.
11.30 Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат сьвету. Будапэшт. Жывая трансьляцыя.
13.30 Тэніс. WTA. Ляйпцыг. Паўтор.
14.00 Тэніс. WTA. Ляйпцыг. Паўфінал. Жывая трансьляцыя.
15.30 Футбол. Кубак УЭФА. Паўтор.
16.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. Гонка з асобным стартам. Жывая трансьляцыя.
19.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
21.00 «Алімпійскія гульні». Часопіс. Паўтор.
21.30 Бокс. Чэмпіянат Эўропы. Цяжкавагавікі. Паўтор.
23.15 Экстрэмальныя віды спорту.
0.00 Аўтагонкі. Гоначная сэрыя «Амэрыкан Леман». Маямі. Жывая трансьляцыя.
2.15 Тэніс. Палерма.

28 верасьня нядзеля

● БТ

7.35 «Дастань зорку!».
8.05 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
8.35 Арсэнал.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства-2».
9.55 Атрымай новыя мільёны з «Gallina Blanca».
10.00 «Кліп-абойма». Вынікі хіт-параду.
10.55 «Падарожжа дылетанта». «Глыбокае. Мэцэнат Я.Корсак».
11.20 Маст. фільм «Апошні з магікан».
13.15 «Ваша лято».
13.55 Мая краіна.
14.10 Дак. сэрыял «На прыродзе з Стэфанам Пэйранам».
15.05 КВК. 1/3 фіналу Эўралігі.
16.40 «На скрыжаваньнях Эўропы».
17.20 «Маскі-шоў».
17.40 Камэдыя «Пацучыныя гонкі».
19.25 Камэдыя «Формула каханьня».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.00 Чэмпіянат сьвету па мастацкай гімнастыцы. Відэаагляд.
22.40 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Матч туру.

● СТВ

7.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.50 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.15 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.40 «Каралеўства крывых люстэрак». Маст. фільм.
9.55 «СТВ-спорт».
10.10, 20.20 «Аўтапанарама».
10.35 «Менск і менчукі».
10.40 «Сьвецкая хроніка».
10.50 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.05 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.15 «Філярманічны тыдзень».
11.20 «Плянэта людзей».
11.35, 0.00 «Срэбранае вясельле». Тэлесэрыял.
12.25 «Без макіяжу».
12.45 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Дэтэктыў «Задача з трыма невядомымі».
15.20 «Дружная сямейка».
16.30, 17.25 «Галоўныя ролі». Тэлесэрыял.
18.25 «168 гадзін».
19.15 «Залатая дзясятка Беларускай опэры».
19.45 «Пакуль гарыць сьвечка...».
20.40 «Асабісты інтэрас».
21.20 «Турпаход».
21.30 «24 гадзіны».
21.50 Драма «Чалавек, які плакаў».
23.45 «Навіны СНД».

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Армейскі магазын.
8.50 Дыснэй-клюб: «Вяртаньне «Караля-Льва».
9.10 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 «Дачнікі».
12.10 Дог-шоў.
12.50 Сьмехапанарама.
13.15 «Клюб падарожнікаў».
13.50 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.15 Ток-шоў «Выбар».
14.55 Камэдыя «Жывіце ў радасьці».
16.10 Маст. фільм «Амэрыканская дачка».
17.50 «Прагулкі зь пячорным чалавекам» у цыкле «Жывая прырода».
18.45 «КВК-2003». Прэм'ер-ліга.
20.30 Контуры.
21.15 Супэрбаявік «Армагедон».
23.50 Праграма «Вялікія гонкі».

● РТР

9.05 «Гарадок».
9.40 «Сто да аднаго».
10.30 Вакол сьвету.
11.25 Дыялёгі пра жывёл.
12.15 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.10 Кінагісторыі Глеба Скараходава.
13.20 Маст. фільм «Дзяўчаты».
15.15 «Форт Баярд».
16.55 Леў Лешчанка. «Найлепшыя песьні».
18.50 «У гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Маст. фільм «Анаконда» (ЗША). 1997.
22.15 Маст. фільм «Апрэль».
0.15 Чэмпіянат сьвету па аўтагонках у клясе «Формула-1». Гран-пры ЗША. Трансьляцыя з Індыянапалісу.

● Культура

11.15 «Рыцары сьмеху».
11.40 Прагулкі па Брадвэі.
12.05 «Прыгоды Бураціна». Мультфільм.
13.15 «Акадэмія палійцэйскіх сабак». Дак. сэрыял.
13.45 Ізноў кружэлка сьпявае.
14.15 Зорныя гады «Ленфільму».
14.55 «У сьвеце танцу». «Тры балеты Нача Дуата». Фільм-балет.
16.20 «Астравы».
17.00 Дак. фільм «Першы раз на эстрадзе».
18.05 «Як важна быць сур'ёзным». Маст. фільм.
19.40 «Больш чым каханьне».
20.25 «Культ кіно». «Хуткі бягун». Маст. фільм.
23.25 Джэм-5.

● НТВ

9.05 «Расьліннае жыцьцё».
9.45 Вайсковая справа.
10.15 «Апэльсынавы сок».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 Усё адразу!
12.05 Маст. фільм «З табой і безь цябе...».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.25 «Іх норавы».
16.15 Сэрыял «Агент нацыянальнай бясьпекі-3: падышах».
17.25 «Злачынства ў стылі «мадэрн»: «Лідваліяда».
18.00 Маст. фільм «Стоеная пагроза».
20.00 «Надоечы».
21.30 Фактар страху.
22.25 Баявік «Разбойнік».

● Эўраспорт

9.30 Маратон. Бэрлін. Жывая трансьляцыя.
12.00 Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат сьвету. Будапэшт. Жывая трансьляцыя.
13.00 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Імола. Жывая трансьляцыя.
15.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Турцыя.
16.00 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 21-ы этап. Жывая трансьляцыя.
19.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Фінал. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
21.00 Аўтагонкі сэрыі «КАРТ». Маямі. Жывая трансьляцыя.
22.00 Аўтагонкі сэрыі «Наскар». Дуўр.
23.00 Аўтагонкі сэрыі «Індыкар». Фантана.
0.15 Тэніс. WTA. Ляйпцыг. Фінал.
1.15 Тэніс. Палерма. Фінал.
2.15 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Імола.

29 верасьня панядзелак

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.05 «У цэнтры ўвагі».
10.05 «36,6».
10.35 Падарожжа дылетанта. «Глыбокае. Мэцэнат Я.Корсак».
11.05 «Шпілька». Тэлечасопіс для жанчын.
11.30 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
12.10 Спэцыяльны рэпартаж. «Аўгустоўскі. Паміж Віслай і Нёманам».
12.25 Камэдыя «Пацучыныя гонкі» (ЗША).
14.20 «Ваша лято».
15.10 «Маскі-шоў».
15.30 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «Кліп-абойма». Вынікі хіт-параду.
17.05 «Псі-фактар». Сэрыял.
17.45 «Мая краіна».
18.05 «Што сказаў нябожчык?».
19.05 Зона Ікс.
19.15 Камэдыя «Ваш выбар, мадам».
20.50 Калыханка.
21.00 «Панарама».
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
22.15 Дэтэктыў «Ноч над горадам» (ЗША).
0.05 «Час спорту».

● СТВ

6.30, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
7.00 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30 «168 гадзін».
8.20 «Менск і менчукі».
8.25, 22.50 «Тэхналёгія».
8.35 Камэдыя «Найлепшы сябар».
10.25 «Асабісты інтэрас».
11.00 «Анфас».
11.15 «Турпаход».
11.25 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Клясыка гумару».
13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
13.55 «Круты Ёкер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.50 Драма «Як загартоўвалася сталь», 1-я сэрыя.
17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.05 «Партрэт у інтэр'еры».
18.20 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
19.55 «СТВ-спорт».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.35 Маст. фільм «Кулак Палярнай Зоркі». ЗША.
23.00 «Навіны СНД».
23.15 «Сталічны футбол зь Юр'ем Курбыкам.
23.40 Маст. фільм «Пітоны».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.00 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05 Контуры.
9.50 Дзіцячы сэрыял «Твінісы».
15.00 «Горад жанчын». Тэлешоў.
15.45 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Новы дзень». «Сканэр».
18.20 «Чалавек і закон».
19.00 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
21.50 Сэрыял «Два лёсы».
23.15 «Тайна ўкладаў». Трылер.

● РТР

7.45 Маст. фільм «Дзяўчаты».
9.40 У «Гарадку».
9.45, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 «Камісар Рэкс».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Каменская-3. Ілюзія граху».
21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэньне». «Гульня ў кошкі-мышкі».
22.00 Весткі+.
22.20 Прэм'ера. «Мяцеж 93-га». Фільм першы.
23.30 Народны артыст.

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Злачынства ў стылі «мадэрн»: лідваліяда.
9.55 Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-3: гульня».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Супэршпіёнкі».
17.25 «Увага: вышук!».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.40 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў-IV: Сальда-бульда». Частка 1-я.
19.45 Сэрыял «Чорны крумкач».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.50 «Найноўшая гісторыя: асуджаныя жыць».

● Культура

18.00 Навіны культуры.
18.25 «Хто мы?». «Яўрэйскае пытаньне — расейскі адказ».
18.50 «Мядзьведзь». Маст. фільм.
19.40 Ток-шоў «Школа зласлоўя».
20.35 «Тым часам».
21.15 «Меерхольдаўскія вечары». «Нумар у гатэлі гораду NN».
22.40 «Пецярбург-300». «Сумеснае пражываньне». Дак. фільм.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».
23.55 «Мастацтва фатаграфіі». Дак. сэрыял. «Будучыня. Фатографы і новая тэхналёгія».

● Эўраспорт

9.30 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Дуўр. Паўтор.
10.30 «Супэргоначны ўік-энд». Аўтачасопіс. Паўтор.
11.30, 17.30 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Турцыя. Паўтор.
13.00 Спартыўная гімнастыка. Будапэшт.
15.00 Тэніс. WTA. Ляйпцыг. Фінал. Паўтор.
16.00 Бокс. Варна. Паўтор.
19.30 Футбол. Легенды чэмпіянату Эўропы. Нямеччына-1980.
20.30 Футбол. Легенды чэмпіянату Эўропы. Нямеччына-2000.
21.30 Баявыя віды спорту. ТВА. Паўтор.
23.30 Эўрагалы. Футбольны часопіс.
1.00 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

30 верасьня аўторак

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.45, 14.05, 16.45, 23.45 «Мая краіна».
9.05 Дэтэктыў «Ноч над горадам» (ЗША).
11.05, 18.05 «Што сказаў нябожчык?».
12.10 «Зона Ікс».
12.25 Камэдыя «Ваш выбар, мадам».
14.20 «Усё нармальна, мама!». Забаўляльная праграма.
15.10 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Відэагляд туру.
15.35 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку» (Канада).
16.05 «5х5».
19.05 Дэтэктыў «Бастэр».
20.50 Калыханка.
21.00 «Панарама».
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Інтэр» (Італія) — «Дынама-Кіеў» (Украіна). Жывая трансьляцыя з Італіі. У перапынку — Навіны.
23.55 «Кліп-абойма».
0.15 Футбол. Дзёньнік Лігі чэмпіёнаў.

● СТВ

6.30, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
7.00 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.25, 22.50 «Тэхналёгія».
8.35 Маст. фільм «Кулак Палярнай Зоркі».
10.05 «Сталічны футбол зь Юр'ем Курбыкам».
10.30 «Зьніклы бязь вестак». Дак. фільм.
10.55 «Пакуль гарыць сьвечка...».
11.25 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Відавочца».
13.55, 18.40 «Круты Ёкер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.50 Драма «Як загартоўвалася сталь», 2-я сэрыя.
18.05 «Добры дзень, доктар!».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Запрашаем паскардзіцца...».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.30 «Закон і крымінал».
20.45 Маст. фільм «Які б'е бяз промаху».
23.00 «Навіны СНД».
23.20 Дэтэктыў «Зьнікненьне».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.20 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 22.10 Сэрыял «Два лёсы».
10.45 Маст. фільм «300 спартанцаў». 1-я сэрыя.
11.50 Дыснэй-клюб: «Кім Пяць-з-плюсам».
15.00 «Горад жанчын». Тэлешоў.
15.45 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Куміры».
18.40 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Забойная сіла: Сьпідвэй».
23.35 «Ня толькі пра футбол».
23.55 «На футболе».

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Каменская-3. Ілюзія граху».
8.50 «Не сумуй!».
9.45, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 «Камісар Рэкс».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэньне». «Гульня ў кошкі-мышкі».
22.00 Весткі+.
22.20 Прэм'ера. «Мяцеж 93-га». Фільм другі.
23.30 Народны артыст.

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Надоечы».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Супэршпіёнкі».
17.25 Тэрыторыя выжываньня.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.25 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў-IV: Сальда-бульда». Частка 2-я.
21.30 «Краіна і сьвет».
22.00 «Чорны кастрычнік Белага дому». 1-я сэрыя.

● Культура

15.00 «Плён асьветы». Гутаркі пра расейскую культуру».
15.40 «Жаночы партрэт у інтэр'еры часу». «Незнаёмка». Дак. фільм.
16.35 «Гербы Расеі». Пецяргоф.
16.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.00 Улада факту.
17.30 «Эпоха Дзьмітрыя Ліхачова, расказаная ім самім».
18.00 Канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага ансамблю народнага танцу. У перапынку: 18.55 Навіны культуры.
20.20 «Уяўны музэй Міхаіла Шамякіна». «Уступ». Перадача 1-я.
21.00 Маст. фільм «У агні няма броду». Маст. фільм.
22.30 95-годзьдзю Давіда Ойстраха прысьвячаецца.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».
23.50 «Фантастычная будучыня». Дак. сэрыял. 1-я сэрыя. «Прышэлец».

● Эўраспорт

9.30, 18.30 Эўрагалы. Паўтор.
11.00 Футбол. Легенды чэмпіянату Эўропы. Паўтор. Францыя—Патугалія, 1984—2000.
12.00 Футбол. Легенды чэмпіянату Эўропы. Паўтор. Нідэрлянды-1988.
13.00 Эўрагалы. Паўтор.
14.30 Тэніс. WTA. Масква. Дзень другі. Жывая трансьляцыя.
16.00 Тэніс. WTA. Масква. Дзень другі.
17.30 Сьпідвэй. Гран-пры. Польшча.
20.00 Футбол. Легенды чэмпіянату Эўропы. Паўтор. Нямеччына—1972, 1980, 1996.
21.00 Бокс. Паўтор.
22.00 Бокс. ТВА. Гамбург. Жывая трансьляцыя.
0.00 «Алімпійскія гульні». Часопіс.
0.30 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Дуўр. Паўтор.
1.45 «Сэрыі». Аўтачасопіс. Паўтор.

1 кастрычніка серада

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.05 «Майстар».
10.20 «Шчаўкунок», «Легенда пра Грыга». Мультфільмы.
11.05, 18.05 «Што сказаў нябожчык?».
12.10 Дэтэктыў «Бастэр».
14.10 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
15.10 «Маскі-шоў».
15.35 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «5х5».
17.05 «Псі-фактар». Сэрыял.
19.05 Дэтэктыў «Адзіночка».
20.50 Калыханка.
21.00 «Панарама».
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Штутгарт» (Германія) — «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія). Жывая трансьляцыя з Германіі. У перапынку — Навіны.
23.40 «Акадэмія зласлоўя».
23.55 Кліп-абойма.
0.10 Футбол. Дзёньнік Лігі чэмпіёнаў.

● СТВ

6.30, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
7.00 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.05, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15 «Менск і менчукі».
8.25, 22.50 «Тэхналёгія».
8.35 Маст. фільм «Які б'е бяз промаху».
10.15 «Запрашаем паскардзіцца».
10.25 «Аўтапанарама».
10.40 «Ліхаманка Эбола — тайна вірусу сьмерці». Дак. фільм.
11.15 «Закон і крымінал».
11.30 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Такая прафэсія».
13.55, 18.40 «Круты Ёкер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.50 Драма «Як загартоўвалася сталь», 3-я сэрыя.
18.05 Дак. фільм «Майбурскае права». 1992 г.
20.10 «Добры вечар, маленькі...».
20.25 «Аўтапанарама».
20.45 Маст. фільм «Ну ты і дурань».
23.00 «Навіны СНД».
23.20 Камэдыя «Каханьне знаходзіць Эндзі Хардзі». ЗША.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.20 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 22.10 Сэрыял «Два лёсы».
10.45 «Ня толькі пра футбол».
11.05 Маст. фільм «300 спартанцаў». 2-я сэрыя.
12.10 Дыснэй-клюб: «Цуды на віражах».
15.00 «Горад жанчын». Тэлешоў.
15.45, 0.15 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Новы дзень». Тэорыя неймавернасьці. «Тэлекінэз».
18.40 Сьмехапанарама.
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Забойная сіла: Кітайскі квартал».
23.35 Лубянка. «Расейская вайна ў Парыжы».

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Каменская-3. Ілюзія граху».
8.50 Сам сабе рэжысэр.
9.45, 22.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 «Камісар Рэкс».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэньне». «Аптэчны картэль».
22.00 Весткі+.
22.20 Аўтарытэт.
23.05 Народны артыст.

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Расьліннае жыцьцё».
10.05 Кулінарны паядынак.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Выратавальнікі. Крытычная маса».
17.30 Шчырае прызнаньне.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў-IV: Ізгой».
19.45 Сэрыял «Чорны крумкач».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.50 «Чорны кастрычнік Белага дому».

● Культура

15.00 «Плён асьветы». «Пушкін і лёсы расейскай культуры».
15.45 «Праклятыя партрэты».
16.30 «Гербы Расеі».
16.45 «Парадак слоў».
16.50 «Айчына і лёсы».
17.15 Да Міжнароднага дня музыкі. Канцэрт.
18.00 Навіны культуры.
18.20 «Тайны расейскай зброі».
18.50 «Сага пра Фарсайтаў». Тэлесэрыял.
19.40 «Нацыст, які пакаяўся». Дак. фільм.
20.40 «Прашу слова». Маст. фільм.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».
23.50 «Фантастычная будучыня». Дак. сэрыял. 2-я сэрыя. «Я — робат».

● Эўраспорт

9.30 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.
10.00 Горны вэлясыпэд.
10.30, 21.00 Конны спорт.
11.30 Ветразевы спорт.
12.00 Гольф. Спэцагляд.
13.00 Футбол. Кубак сьвету. ЗША. Жанчыны. Спэцагляд.
14.30 Тэніс. WTA. Масква. Дзень 3-і. Жывая трансьляцыя.
18.00 Снукер. Трыкшот. ТВА.
19.30 Футбол. Кубак сьвету. ЗША. Жанчыны. Паўтор. Агляд.
23.30, 2.30 Футбол. Кубак сьвету. ЗША. Жанчыны. Чвэрцьфінал. Жывая трансьляцыя.
1.30 Гольф.

2 кастрычніка чацьвер

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 10.45, 14.05, 16.45, 23.35 «Мая краіна».
9.05 Камэдыя «Хто сьмяецца апошнім».
11.05, 18.05 «Што сказаў нябожчык?».
12.15 Дэтэктыў «Адзіночка».
14.15 «Кропка». Музычная перадача для моладзі.
15.10 «Маскі-шоў».
15.35 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку (Канада).
16.05 «5х5».
17.05 «Псі-фактар». Сэрыял.
19.05 Маст. фільм «Далёка ад раю».
20.50 «Калыханка».
21.00 «Панарама».
21.40 Камэдыя «Паміж анёлам і д'яблам» (Францыя).
23.50 Кліп-абойма.
24.00 «Новая калекцыя» Алега Лукашэвіча. Міжнародны кінафэстываль у Вэнэцыі-2003.

● СТВ

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30. 19.30. 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.05, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15 «Тэма дня».
8.25, 22.50 «Тэхналёгія».
8.35 Маст. фільм «Ну ты і дурань».
10.20 «Партрэт у інтэр'еры».
10.40 «Cuba Libre — ядзерны кактэйль». Дак. фільм.
11.10 «Фільм, фільм, фільм».
11.25 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Усё для цябе».
13.55, 18.40 «Круты Ёкер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.50 Драма «Як загартоўвалася сталь», 4-я сэрыя.
18.05 «Тэатральныя гісторыі».
18.20 «Плянэта людзей».
20.10 «Добры вечар, маленькі...».
20.25 «Фільм, фільм, фільм».
20.40 Маст. фільм «Амэрыканскі якудза».
23.00 «Навіны СНД».
23.20 Маст. фільм «Арахнід».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.20 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05, 19.00 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 22.10 Сэрыял «Два лёсы». Заключная сэрыя.
10.45 Маст. фільм «Вікінгі». 1-я сэрыя.
11.50 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
15.00 «Горад жанчын». Тэлешоў.
15.45, 0.15 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Бяз тэрміну даўнасьці». «Апэрацыя «Сатурн».
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Забойная сіла: Па-за гульнёй».
23.35 Лубянка. «Расейская вайна ў Парыжы». Фільм 2-і.

● РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Каменская-3. Ілюзія граху».
8.50 Пакой сьмеху.
9.45, 22.20 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 «Камісар Рэкс».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэньне». «Аптэчны картэль».
22.00 Весткі+.
22.35 Народны артыст.

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Жаночы погляд».
10.00 Кватэрнае пытаньне.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Выратавальнікі. Крытычная маса».
17.30 «Прафэсія — рэпартэр».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў-IV: Сьмяротная хвароба».
19.50 Сэрыял «Чорны крумкач».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 «Да бар'еру!».

● Культура

15.00 «Плён асьветы». «Пушкін і лёсы расейскай культуры».
15.30 «Чароўны ліхтар». Дак. фільм.
16.30 «Гербы Расеі».
16.45 «Парадак слоў».
16.50 «Пецярбург: час і месца». «Бясконцая колькасьць мілых жанчын...».
17.15 «Царская лёжа».
18.00 Навіны культуры.
18.20 «Тайны расейскай зброі».
18.50 «Сага пра Фарсайтаў». Тэлесэрыял.
19.40 «Культурная рэвалюцыя».
20.35 Маст. фільм «Васа».
22.45 «Пецярбург-300».
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».
23.55 «Фантастычная будучыня». Дак. сэрыял. «Чалавек з зорак».

● Эўраспорт

9.30 Конны спорт. Паўтор.
12.00, 19.00, 20.30 Футбол. Кубак сьвету. ЗША. Жанчыны. Чвэрцьфінал. Паўтор.
14.30 Тэніс. WTA. Масква. Дзень 4-ы. Жывая трансьляцыя.
16.00 Тэніс. WTA. Масква. 1/8 фіналу. Жывая трансьляцыя.
22.00 Бокс. Сардынія.
0.30 Ралі. Сан-Рэма.
1.00 Футбол. УЭФА.
2.30 Футбол. Кубак сьвету. ЗША. Жанчыны. Чвэрцьфінал. Жывая трансьляцыя.

3 кастрычніка пятніца

● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 16.45, 23.40 «Мая краіна».
9.05 Камэдыя «Паміж анёлам і д'яблам».
11.05 «Што сказаў нябожчык?».
12.10 Маст. фільм «Далёка ад раю».
14.05 «Масква — Менск».
14.20 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
15.10 «Маскі-шоў».
15.35 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «5х5».
17.05 Маст. фільм «Шлях да сходаў».
18.35 Фэстываль «Ноч блюзу» ў Раве-Мазавецкай.
19.05 Маст. фільм «Пякельны хмарачос».
20.50 «Калыханка».
21.00 «Панарама».
21.40 Спэцыяльны рэпартаж. «Адзіная краіна».
21.50 Маст. фільм «Улада агню».
23.50 Камэдыя «Кепскі хлопец».

● СТВ

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.05, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15, 18.20 «Менск і менчукі».
8.25, 22.50 «Тэхналёгія».
8.35 Маст. фільм «Амэрыканскі якудза».
10.25, 20.35 «Аўтапанарама».
10.40 «Тэатральныя гісторыі».
10.55 «Прысуд выкананы». Дак. фільм.
11.25 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Сусьветныя розыгрышы».
13.55, 18.40 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.50 Драма «Як загартоўвалася сталь», 5-я сэрыя.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Камэдыя «Дыямэнты».
23.00 «Навіны СНД».
23.20 Маст. фільм «Гаспадар ночы».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30. 23.40 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Сэрыял «Два лёсы». Заключная сэрыя.
10.45 Баявік «Вікінгі». 2-я сэрыя.
11.50 «Сэрыял».
15.00 «Горад жанчын». Тэлешоў.
15.45, 22.15 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Новы дзень». «Кланаваньне. Праўда і хлусьня».
18.40 Проста сьмех!
20.00 Час.
21.05 «Поле цудаў».
23.55 Баявік «Супэрагент Сайман».

● РТР

7.45 Сэрыял «Каменская-3. Ілюзія граху».
8.50 Аншляг.
9.45 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.05 «Другая палова».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Народны артыст.
20.50 «Юрмаліна-2003».
22.35 Вынікі галасаваньня: «Народны артыст — Ваш выбар!»

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Без рэцэпту».
10.05 Фактар страху.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 «Іх норавы».
17.25 «Нацыянальная бясьпека: страхоўка ад страху».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Маст. фільм «Судзьдзя Дрэд» (ЗША).
22.40 Супэрбокс: Майкл Грант супраць Дэвіда Айзана.

● Культура

15.00 «Плён асьветы». «Пушкін і лёсы расейскай культуры».
15.30 «У сьвеце танцу». «Ядро разбуральніка». Балет у Амэрыцы.
16.30 Набытак рэспублікі.
16.45 «Парадак слоў».
16.50 «Палацавыя тайны».
17.15 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
18.00 Навіны культуры.
18.20 «Тайны расейскай зброі».
18.50 «Сага пра Фарсайтаў». Тэлесэрыял.
19.40 «Лінія жыцьця».
20.40 «Болей чым каханьне».
21.20 «Нязначны чалавек». Маст. фільм.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Хто там...».
23.50 Джазавы канцэрт.

● Эўраспорт

7.15 Мота гран-пры. Жывая трансьляцыя.
10.15 Ралі. Сан-Рэма. Паўтор.
10.45 Футбол. Кубак сьвету. ЗША. Жанчыны. Чвэрцьфінал. Паўтор.
12.15 Футбол. Кубак УЭФА.
16.15 Тэніс. WTA. Масква. Чвэрцьфіналы.
19.00 Футбол. Кубак сьвету. ЗША. Жанчыны. Чвэрцьфінал.
21.00 Футбол. Кубак УЭФА. Клясык.
23.00 Самы дужы чалавек. Часопіс.
0.15 «Формула». Аўтаспартыўны часопіс.
0.30 Спарткар.
0.45 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.
1.15 Ралі. Сан-Рэма.
1.45 Алімпійскі часопіс. Паўтор.

4 кастрычніка субота

● БТ

7.35 «Новая калекцыя» Алега Лукашэвіча. Міжнародны фэстываль у Вэнэцыі-2003.
8.05 «Існасьць». Духоўная праграма.
8.30 «36,6».
9.00, 15.00, 21.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства-2».
10.00 «Усё нармальна, мама!».
10.40 «Дажынкі. Сьвята з глыбіняў гісторыі».
10.55 Рэспубліканскі фэстываль-кірмаш работнікаў вёскі «Дажынкі-2003» (г.Пружаны). Жывая трансьляцыя.
12.25 Мэлядрама «Канец бабінага лета».
13.50 «Шпілька». Тэлечасопіс для жанчын.
14.20 «Кропка». Музычна-забаўляльная перадача для моладзі.
15.05 Камэдыя «Адзін з трынаццаці».
16.40 Маст. фільм «Джэн Эйр».
18.35 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
19.15 Мэлядрама «Месяцам быў поўны сад».
21.15 «Вакол плянэты».
21.45 Рэспубліканскі фэстываль-кірмаш «Дажынкі-2003». Гала-канцэрт майстроў мастацтваў.
23.45 Камэдыя «Бывайце, фараоны».

● СТВ

6.30 «Дзікая плянэта»: «Тутанхамон: у пошуках згубленага фараона» з цыклу «Ў пошуках забытага сьвету». Дак. фільм.
7.30 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.55 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.20 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.40 Маст. фільм «Руслан і Людміла». 1-я сэрыя.
10.00, 19.55 «СТВ-спорт».
10.10 «Рэактыўны бокс».
10.25 «З дакладных крыніц».
10.40 «Разам».
11.10 «Партрэт у інтэр'еры».
11.25 Дак. фільм «Пасьпець да ночы».
11.55, 0.20 «Каханьне імпэратара». Тэлесэрыял. 1-я сэрыя.
12.50 Маст. фільм «Ход у адказ».
14.40 «Дружная сямейка». Сэрыял.
15.45 «Усё для цябе».
16.15 «Клясыка гумару».
16.45 «Галоўныя ролі». Тэлесэрыял.
17.40 Маст. фільм «Сындбад і вока тыгра».
19.30 «24 гадзіны».
20.15 Маст. фільм «Бэавульф».
22.00 «Навіны СНД».
22.15 «Арт-хаўз»: трагікамэдыя «Другасныя людзі».

● АНТ

8.00 «Сэрыял».
8.20 Грай, гармонік любы!
8.55 Слова пастыра.
9.10 Здароўе.
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Дэвід Капэрфілд. Выкрытая ілюзія».
11.00 Прэм'ера. «Цікавае кіно».
12.10 Нацыянальнае геаграфічнае таварыства прадстаўляе: «У цені Вэзувію».
12.55 Канцэрт кампазытара Яўгена Крылатава.
13.30 «Падарожжы натураліста».
14.00 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.25 Разумніцы й разумнікі.
14.55 Дэтэктыў «Стывэн Сьпілбэрг сьпяшаецца дапамагчы».
16.10 «Бяз тэрміну даўнасьці». «Апэрацыя «Сатурн».
18.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Розыгрыш».
21.55 «Залаты грамафон».
22.55 Што? Дзе? Калі?
0.15 Баявік «Рабакоп-2».

● РТР

9.20 «Не сумуй!».
10.20 Сам сабе рэжысэр.
11.15 «Круты маршрут».
12.15 Клюб сэнатараў.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Кухарка».
14.45 «Ха».
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. ЦСКА — «Дынама» (Масква). Жывая трансьляцыя са стадыёну «Дынама».
17.00 «Кубак гумару».
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.20 Аншляг.
21.20 Маст. фільм «Мачаха».

● НТВ

9.05 Кулінарны паядынак.
10.00 Кватэрнае пытаньне.
10.55 Спорт «Лято 6 з 49».
11.00, 15.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
11.10 Надвор'е на заўтра.
11.15 «Дзікі сьвет».
12.00 Маст. фільм «Ёлупні» (ЗША).
14.05 Свая гульня.
15.15 «Жаночы погляд».
15.55 Маст. фільм «Агент нацыянальнай бясьпекі-3: Сьведка».
17.10 Зусім сакрэтна: цяжка быць расейцам.
18.00 «Асабісты ўнёсак».
19.00 Маст. фільм «Каўкаская рулетка».
20.55 Дэтэктыў «8 мілімэтраў».
23.25 Начныя музы.

● Культура

11.05 ГЭГ.
11.20 Хто ў доме гаспадар?
11.50 Маст. фільм «У трыдзявятым царстве».
13.10 «Кібітачка на адным коле». Мультфільм.
13.25 «Навука: стратэгія прарыву».
13.55 Ізноў кружэлка сьпявае.
14.25 Спэктакль «На дне».
17.00 «І Давід танцаваў... Магічная музыка Эфіёпіі». Дак. фільм.
17.55 «У вашым доме».
18.35 Магія кіно.
19.05 Блеф-клюб.
19.50 «Сфэры».
20.30 Сьмеханастальгія.
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Кікудыра». Маст. фільм. Рэжысэр Такешы Кітана.
23.15 «І даўжэй за век...».
23.55 «Пэр Гюнт». Мультфільм для дарослых.

● Эўраспорт

7.15 Мота гран-пры. Жывая трансьляцыя.
10.15 Супэргоначны ўік-энд. Паўтор.
11.15 Футбол. Кубак УЭФА. Клясык.
12.30 Супэргоначны ўік-энд. Эштарыль. Формула Рэно V 6.
13.30 Тэніс. WTA. Масква. Паўфіналы.
16.30 Снукер. Прэстан. Дзень першы. Жывая трансьляцыя.
18.00 Барацьба. Чэмпіянат сьвету. Францыя. Жывая трансьляцыя.
20.00, 0.30 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
20.30 Бокс. Паўтор.
21.00 Бокс. ТВА. Жывая трансьляцыя.
23.30 Экстрэмальныя віды спорту.
1.15 Ралі. Сан-Рэма.
1.45 Мота гран-пры. Агляд.

5 кастрычніка нядзеля

● БТ

7.35 «Дастань зорку».
8.05 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
8.35 Арсэнал.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства-2». Заключная сэрыя.
10.00 Атрымай новыя мільёны з «Gallina Blanca».
10.05 «Кліп-абойма». Вынікі хіт-параду.
11.00 Падарожжа дылетанта. «Вёска Мосар. Куточак раю».
11.25 Маст. фільм «Кніга джунгляў» (ЗША).
13.15 «Ваша лято».
13.55 «Мая краіна».
14.10 Дак. сэрыял «На прыродзе са Стэфанам Пэйронам».
15.35 Маст. фільм «Экзамэн на дырэктара».
16.55 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
17.35 Маст. фільм «Прыбыцьцё» (ЗША).
19.35 Маст. фільм «Сем старых і адна дзяўчына».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
22.30 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Матч туру.

● СТВ

6.35 «Дзікая плянэта»: «Баракуда». Дак. фільм.
7.35 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.00 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.25 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.45 Маст. фільм «Руслан і Людміла». 2-я сэрыя.
9.55 «СТВ-спорт».
10.10, 20.20 «Аўтапанарама».
10.35 «Менск і менчукі».
10.40 «Сьвецкая хроніка».
10.50 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.05 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.15 «Філярманічны тыдзень».
11.20 «Плянэта людзей».
11.35 «Навука і людзі». Дак. фільм.
11.55, 0.00 «Каханьне імпэратара». Тэлесэрыял. 2-я сэрыя.
12.45 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Маст. фільм «Адзін шанец з тысячы».
15.00 «Дружная сямейка». Сэрыял.
16.15 «Найлепшыя шоў сьвету».
17.20 «Галоўныя ролі». Тэлесэрыял.
18.25 «168 гадзін».
19.15 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
19.45 «Пакуль гарыць сьвечка...».
20.40 «Асабісты інтэрас».
21.20 «Турпаход».
21.30 «24 гадзіны».
21.50 Драма «Пасьля навальніцы».
23.45 «Навіны СНД».

● АНТ

8.00 «Сэрыял».
8.20 Служу Айчыне!
8.50 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.10 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 «Дачнікі».
12.10 Дог-шоў.
12.50 Сьмехапанарама.
13.20 «Клюб падарожнікаў».
14.00 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.25 «Ералаш».
14.40 Ток- шоў «Выбар».
15.20 Маст. фільм «Дажывём да панядзелка».
17.05 Песьня году. Восень.
18.45 Мэлядрама «Ў руху».
20.30 Контуры.
21.15 Баявік «Вулкан».
23.15 Баявік «Паліцэйская гісторыя».

● РТР

9.05, 18.50 «У «Гарадку».
9.40 «Сто да аднаго».
10.30 Вакол сьвету.
11.25 Дыялёгі пра жывёл.
12.15 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Ас».
15.10 Гульня «Форт Баярд».
16.50 «Найлепшыя песьні». Міхаіл Таніч. Юбілейны вечар.
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Маст. фільм «Турбулентнасьць».
22.35 Трылер «Водгульле рэха».

● НТВ

9.10 «Расьліннае жыцьцё».
9.45 Вайсковая справа.
10.20 «Апэльсынавы сок».
10.55 Гуляем у «Кено».
11.0. 15.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
11.10 Надвор'е на заўтра.
11.15 Усё адразу!
12.05 Маст. фільм «Чужыя лісты».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Іх норавы».
16.10 Сэрыял «Агент нацыянальнай бясьпекі-3: Сутэнэр».
17.20 Злачынства ў стылі «мадэрн»: астральная справа.
17.55 Маст. фільм «Практычная магія».
20.00 «Надоечы».
21.30 Фактар страху.
22.25 Баявік «Дастаўка».

● Культура

11.15 Нядоўгія гісторыі.
11.30 «Рыцары сьмеху».
12.00 «Парыскі часопіс». «Іван Тхаржэўскі. Камэргер двара Яго Вялікасьці».
12.30 «Краса ненаглядная». Мультфільм.
13.25 «Акадэмія паліцэйскіх сабак». Дак. сэрыял.
13.55 «Партытуры не гараць». «Салямэя» Р.Штраўса.
14.25 «Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру». Дж.Вэрдзі. Опэра «Фальстаф».
17.00 «Мама», «Танцы лялек». Мультфільмы.
17.20 «Што рабіць?».
18.00 «Астравы».
18.40 «Пачатак». Маст. фільм.
20.10 «Дом актора». «Тэатар Віі Артманэ».
20.50 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.20 «Культ кіно». «Справа Маркарэля». Маст. фільм.
23.05 «Зьніклыя сьвіткі Геркулянума». Дак. фільм.
23.55 «Джазафрэнія».

● Эўраспорт

5.00 Мота гран-пры. Жывая трансьляцыя.
9.30 Ралі. Сан-Рэма. Паўтор.
10.00 Супэргоначны ўік-энд. Эштарыль.
11.00, 13.30 Мота гран-пры. Паўтор.
12.00 Тэніс. WTA. Масква. Фінал. Жывая трансьляцыя.
16.15 Супэргоначны ўік-энд. Эштарыль. ETCC. Жывая трансьляцыя.
17.15 Вэляспорт. Кубак сьвету. Парыж—Тур. Жывая трансьляцыя.
18.30 Барацьба. Чэмпіянат сьвету. Францыя. Жывая трансьляцыя.
20.00 Супэргоначны ўік-энд. Эштарыль. GT. Спэцагляд.
21.00 Снукер. Прэстан. Дзень другі. Жывая трансьляцыя.
23.00 Аўтагонкі сэрыі «Наскар».
0.15 Тэніс. ATP. Масква. Фінал.
1.15 Ралі. Сан-Рэма.
2.30 Футбол. Кубак сьвету. ЗША. Жанчыны. Паўфінал. Жывая трансьляцыя.

Дык падпісвайся

Нагадваем, што падпіскаю «Наша Ніва» таньнейшая. Падпісны індэкс 63125. Цана падпіскі на месяц — **2043** рублі. На шапік «Белсаюздруку» — усяго **1360** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Крымінальнае чытво

Зэкаўскія легенды Беларусі

«А можна ў вас трошкі пасядзець? У сэнсе пажыць?..» — «Навошта?» — «А быў бы цудоўны матэрыял». — «Ну, калі раптам што, можаце разьлічваць на самую лепшую камэру». Размова адбывалася ва ўстанове з назвай на «УЖ». Намесьнік начальніка хітра прыжмурыўся і распавёў мне гісторыю пра журналіста і пракурора, якую вы пачытаеце ніжэй. А тады быў самы разгар вулічных хапуноў. Саджалі яшчэ не за «аскарбленія», але за грубыя пераходы праезнай часткі з злосным росьпісам сьценаў.

Я не сядзела, не саджала, не хапала й не вартавала. Мой самы доўгі тэрмін зьняволеньня дагэтуль вымяраецца чатырма гадзінамі. Калі, вядома, можна лічыць кратамі вокны звычайнага райаддзелу. Але калі адны прыяцелі скідаліся на перадачы другім, перамаўляцца з начальствам чамусьці заўсёды выпіхвалі мяне.

Тады я і атрымала мянушку «Крупская» ад людзей у пагонах, і абурэньняў іхных наслухалася. Апазыцыя надта актыўная, многа ходзіць... Турмы надта бедныя, не адпавядаюць эўрапейскім стандартам... І чула я сярод гэтага ўсяго цікавыя гісторыі. А праз колькі часу тое самае раптам параспавядалі й колішнія «сядзельцы».

Гісторыі тыя — як крымінальныя справы пры дыктатуры. Нешта сапраўды было, але амаль усё — байкі. Дарэчы, неяк я бачыла расейскі фільм зь сюжэтам ну дакладна як у адной з турэмных баек! Паводле іх можна зьняць цэлы сэрыял. Было б каму.

УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

Журналіст і пракурор

(упершыню пачутая ў 1996 г. у менскім СІЗА ад начальства)

Адзін журналіст дачапіўся да знаёмага пракурора: хачу ў турму, і ўсё. Ты ж можаш, каб ніхто, маўляў, не даведаўся. Пісака прагнуў выпендрыцца нарысам пра пачуцьці асуджанага на сьмерць. Нават пляшку гарэлкі сябруку-пракурору занёс. Той і махнуў рукой — пішы. Пасадзіў цішком у камэру, каб уражаньняў набраўся, а праз пару дзён выпушчу. Ударылі па рукох. І застаўся журналіст у камэры, дзе «вышкі» чакаюць.

Хутка ўражаньняў стала вышэй даху. Стаміўся пісака, захацеў дамоў ды нармальна паесьці, а пракурора няма. Ужо і два дні праходзіць, і нават тры — няма! Што такое? У ахоўнікаў пачаў пра яго пытацца — тыя крычаць «не паложана».

Паспрабаваў журналіст намякнуць пра дамову з пракурорам аднаму ахоўніку, а той як уваліць дубіналам! Няма чаго строіць тут анёла і архангела — за гэта вышэйшай меры не даюць. І не крычы, што невінаваты. Многа вас тут «невінаватых».

«Калі ня верыце мне, дык пазваніце такому й такому!» — моліцца небарака і кажа пракурорава прозьвішча. «Ага, пазвонім! На той сьвет! — рагочуць ахоўнікі. — Памёр учора твой пракурор». Няшчасны журналюга ледзь не звар'яцеў ад такой навіны. Але надзея шчэ была. Ён жа тут беспадстаўна! Ніякай крымінальнай справы, прысуду, ніякіх дакумэнтаў, згодна зь якімі журналіст мае быць у камэры, — не існуе. Яго ж пракурор прывёў «па блаце».

Прыйшоў начальнік турмы, спытаў, чаго тут крык ды шум. І тэчку паказвае. А ў ёй дакумэнты, дзе чорным па белым стаіць: вязень гэтае камэры забіў некалькі чалавек. І прысуд ёсьць, а як вы думалі. Ну вядома, тут усе невінаватыя... І начальнік сышоў. А журналіст стаў плакаць, біцца ў дзьверы галавой і яшчэ гучней крычаць, што нікога не забіваў, а прысуд ліпавы.

А праз тыдзень ці два зьмірыўся зь лёсам. Жонкі ў журналіста не было, бацькі жылі далёка. Яго ніхто не шукаў, бо ён мог запіць ці пісаць недзе на лецішчы нарысы.

Аднойчы дзьверы адчыніліся, і «сьмяротніка» паклікалі на выхад. «Усё. Фініш, — зразумеў журналіст. — Зараз мяне расстраляюць». Але не, вядуць у кабінэт да начальніка. Мо там якому сьвятару спавядаюцца ці сто грамаў наліваюць перад канцом? Заходзіць ніякі, з надзеяй на сто грамаў, а там за сталом сядзіць... жывы пракурор...

Як стаў журналіст лаяцца-клясьці! А пракурор той і кажа: «Братка, ты ж сам гэтага хацеў! Мусіш быць задаволены». Канец.

Зьверафэрма

(упершыню пачутая на пачатку 90-х ад выкладчыка юрфаку БДУ)

Здарылася гэта яшчэ за Саюзам, у сярэдзіне 80-х. Адна сям'я — мужык, жонка ды сын-школьнік — набыла лятарэйны білет. Праз нейкі час мужык захварэў і памёр. Пасьля пахаваньня сын правярае ў газэце вынікі лятарэі і бачыць: іх нумар выйграў аўтамабіль «Волга». Разам з маці ён пачынае шукаць білет, а білета няма. Тут маці згадвае, што паперку клала мужыку ў кішэню пінжака. У тым пінжаку яго і пахавалі.

Удава кідаецца ў нейкія інстанцыі, дамагаецца ўскрыцьця магілы мужа. З дазволу і ў прысутнасьці пракурора магілу ўскрываюць. Але тут выяўляецца штосьці жахлівае. У некранутай звонку, яшчэ сьвежай магіле з кветкамі і вянкамі, стужкамі і надпісамі на памяць, акрамя жвіру, нічога няма. Ні труны, ні нябожчыка!

Усе ў шоку. Напалоханы, пракурор дае загад праверыць іншыя сьвежыя пахаваньні... Усе магілы пустыя.

Пачалося сьледзтва. Канцоў аніяк не маглі знайсьці. Разгублены дырэктар могілак ведаць нічога ня ведаў і спасылаўся на нячысьцікаў. Усе ж на свае вочы бачылі, што нябожчыкаў клалі ў труны, якія забівалі цьвікамі, і хавалі як мае быць. І вырашылі сьледчыя ўзяць сьлед тае «Волгі».

Усе ашчадныя касы атрымалі загад тэрмінова паведаміць у органы, калі хто прыйдзе з шчасьлівым білетам. І такое паведамленьне паступіла. Міліцыя апэратыўна скруціла нейкага грамадзяніна, які жадаў атрымаць выйгрыш. Насьмерць пераляканы чувак расказаў мянтам, што білет знайшоў у кішэні пінжака, набытага ў камісійнай краме.

Раскруціць клубок за нітачку было справай тэхнікі. Праверыўшы дакумэнтацыю крамы (квіткі на здадзеныя рэчы), сьледчыя выйшлі на цэлую банду.

Мэханізм «бізнэсу» быў просты. Не пасьпявалі зьвяць кветкі на сьвежай магіле, як ноччу рабаўнікі раскопвалі яе, даставалі ўсё начыньне, а потым акуратна засыпалі зямлёю і расстаўлялі на капцы вяночкі, кветачкі і сьвечачкі.

Скрадзеная труна назаўтра ж ішла на рэалізацыю, каб праз невялікі час апынуцца ў руках тых самых рабаўнікоў і пайсьці ў абарот ізноў. Адзеньне нябожчыкаў, абутак, розныя каштоўнасьці таксама хутка знаходзілі пакупніка праз камісіёнку.

Але самае жудаснае — што адбывалася з выкрадзеным нябожчыкам. Сябра аднаго з гэтых бандытаў гадаваў нутрыяў на зьверафэрме. Целы аддавалі на спажыву тым зьвярам. Дырэктар могілак выявіўся не прымхлівым і вельмі практычным маладым чалавекам.

Справа мела шырокі рэзананс. Людзі абураліся й патрабавалі пакараць бандытаў. Зрабіць гэта ўдалося не адразу. І зусім не праз адсутнасьць доказаў віны. Высьветлілася, што падсудным... няма чаго «прышыць»! Акрамя, канечне, адсутнасьці сумленьня. Бо ў Крымінальным кодэксе няма адпаведнага артыкулу!

Адны прапаноўвалі судзіць банду за крадзяжы маёмасьці. Але ім адказвалі, што тыя рэчы ня ёсьць маёмасьцю грамадзянаў: закапаўшы іх у зямлю, грамадзяне з тымі рэчамі добраахвотна разьвіталіся. Іншыя меркавалі, што банду трэба саджаць за выкраданьне людзей. Але што тычыцца мерцьвякоў, дык іхнія правы ў заканадаўстве ніяк не акрэсьленыя. У выніку ўсіх злачынцаў папросту павыганялі з працы. Толькі начальніку могілак далі «хімію», а дырэктару саўгасу — строгую вымову.

Начальнік увесь час падкрэсьліваў, што ні ён, ні падзельнікі не прысвоілі сабе ніводнай рэчы з могілак. Бо гэта — вялікі грэх...

Як мужык двойчы забіў жонку

(упершыню пачутая ў сярэдзіне 90-х ад начальніка калёніі; адначасова пачутая маім мужам ад сукамернікаў у СІЗА КДБ)

Жылі на сьвеце мужык і жонка. Ён любіў выпіць і пабіцца. Тая цярпела-цярпела дый знайшла сабе іншага, непітушчага. І наважылася сысьці да яго ад п'яніцы. Але мужа кабета хацела кінуць так, каб ён не шукаў яе. І заадно — каб адпомсьціць за загубленую маладосьць.

Напаіўшы мужыка да поўнай адключкі, жонка пабіла трохі посуду, пакрычала. Пасьля парэзала сабе нажом руку і, зьняўшы сукенку, запэцкала яе крывёй. Сама ж пераапранулася і ціхамірна сышла ўначы. Але перш патэлефанавала ў міліцыю ад суседчынага імя. Маўляў, нейкі шум, крыкі, мабыць, сусед жонку лупіць-забівае...

Міліцыя паехала на выклік. Гаспадар, натуральна, спаў. Разбудзілі й запыталі, дзе жонка. Ня ведаю, кажа. А што вы, пытаюць міліцыянты, сёньня рабілі, калі яна была? Хто яго ведае, пэўна, сварыліся, біліся, як заўжды, кажа той. То мо забіў? А мужык, галава дурная, нічога ня памятае.

Мужыка забралі ды павезьлі «куды трэба», разьбірацца. І неўзабаве пасадзілі за забойства. Спачатку хацелі нават «вышку» даць, але няшчасны алкаш пісаў прашэньні, тлумачыў, што нічога з тым забойствам няясна. І сам думаў: калі ўжо забіў п'яны, дык чаму нават ценю такой падзеі няма ў памяці?

Замянілі мужыку расстрэл доўгім турэмным тэрмінам. Далі на ўсю катушку, бяз права «УДВ» (умоўнадатэрміновае вызваленьне). Усе гады за кратамі чалавек сумаваў па жонцы, адчуваў віну і каяўся, што сапсаваў ёй маладосьць. Ягоная вэрсія падзеяў была такая: ён піў, яна крычала, потым пабіліся, ён заснуў ля ложка, а яна, уся зьбітая, пайшла і недзе ўтапілася, альбо замерзла ў лесе, так што й цела зьелі ваўкі... І сьніў наш герой начамі кашмары, будзячы ўсю камэру крыкамі «Прабач!»...

Вызваліўся нарэшце, ідзе і ня ведае, што рабіць, куды падацца. Шыбуе паціху вуліцаю да вакзалу, аж бачыць раптам на пераходзе знаёмую постаць. Падышоў бліжэй — жонка яго, жывая-здаровая, у новай сукенцы і з кавалерам пад ручку!

Аслупянеў мужык. Столькі гадоў прамучыўся, а за што?! І такая злосьць на супружніцу законную ахапіла, так ён зароў на яе проста сярод вуліцы, гэтак сябе павёў неадэкватна, што кавалер тае кабеты ўцёк. А сама яна памерла на месцы ад атрыманых ударaў нейкім цяжкім тупым прадметам. Забойца, на гэты раз сапраўдны, быў затрыманы на месцы — ён і ня думаў уцякаць.

Апынуўся мужык той у сьледчым ізалятары, у звыклай хатняй абстаноўцы. Думаў, што цяпер мо дакладна «вышку» дадуць, бо ён жа нібыта рэцыдывіст... Але праз некалькі дзён ахова паклікала яго з рэчамі і паслала за вароты. На волю. Яму нічога не было. Бо можна засудзіць чалавека двойчы за адно й тое ж злачынства. Нават калі адзін і той самы пацярпелы. Нехта, бывае, па колькі разоў у аднаго й таго ж крадзе; было нават, адзін выходзіў чарговы раз і тую самую гвалціў. Але двойчы забіць адну і тую ж жонку немагчыма. Інакш давядзецца афіцыйна прызнаць, што жонка мае два жыцьці. А тады — ці чалавек яна?.. За што тут караць?

Як не забіваў, дык ледзь ня зьнішчылі імем дзяржавы самога, а як забіў — застаўся «на свабодзе і з чыстым сумленьнем». Во як яно бывае.

Тацяна Сьнітко

Багушэвіч уваскрос жанчынай

Таццяна Барысік. Гаркну ў бліскучы мацюгальнік: Вершы. — Асіповічы, 2003.

Кніжка Таццяны Барысік — рэдкая. І ня толькі таму, што выдадзеная накладам 15 асобнікаў. Рэдкая беларуская паэтка сёньня вылузьнецца з утульнае шкарлупіны самакапаньня. Яшчэ радзейшая, вылузнуўшыся, акунецца ў брутальную сацыяльшчыну зь яе гноем, чорнымі кухвайкамі, чаркамі і «зайчыкамі». Вершы Таццяны здольныя выклікаць шок у эстэта сваёй «прыземленасьцю», фармальнай недасканаласьцю (недацягнутыя месцамі рыфмы, аднастайны набор памераў). Але жыцьцесьцьвярджальнай сілай і яснасьцю паэзія Таццяны дзе-нідзе не саступае Багушэвічавай. І ў ейным «Гаркну ў бліскучы мацюгальнік» чуецца «Эх, скручу я дудку!». І «жудка» ад Таццянінае кніжкі ня менш, чым ад інструмэнту Мацея Бурачка. Як і ў Багушэвіча, у Таццяны песьня ня плача. Хутчэй сьмяецца. Месцамі досыць злосна. У сваіх чорнагумарных досьціпах Барысік не баіцца «замахвацца на сьвятое», але робіць гэта без эстэцкае грэблівасьці — жартуе як свая з сваім. Як у гэтым вершы пра любоў да роднай зямлі: «Сем сотак роднае зямлі // У сьне жахлівым // прыйдуць ноччу».

Яшчэ адметнасьць кніжкі — адсутнасьць абстрактных наездаў на «рэжым», «дыктатуру» etc. Усё вельмі канкрэтна: «Я лезу на сьценку ад радасьці — // У краму прывезьлі батоны». Лепей ня скажаш.

Кніга пра Крэмень

Алесь Белакоз. Каб жыла Беларусь: Успаміны, артыкулы, інтэрвію. — Менск: «Беларускі кнігазбор», 2003.

У кнізе ўспамінаў «Доўгая дарога дадому» Васіль Быкаў згадвае Алеся Белакоза — дырэктара Гудзевіцкай «узорна-паказальнай» беларускай школы — ці не адзінай на Гарадзеншчыне. Туды вазілі гасьцей рэспублікі, а тыя пасьля казалі, што з «нацыянальным пытаньнем» у Беларусі ўсё о'кей. Кніжка Алеся Белакоза расстаўляе некаторыя акцэнты. З той школай кіраўнікі рэспублікі змушаныя былі мірыцца, як зь непазьбежным злом. Бо «зламаць» Белакоза не маглі. Пра ўсе свае эпапеі з РАНА, КГБ і іншымі абрэвіятурамі настаўнік-патрыярх распавядае бяз патасу, спакойна. Ад гэтае спакойнасьці яшчэ ясьней усьведамляеш, якое пекла яму давялося перажыць. Такая ж «спакойнасьць» гучыць ва ўспамінах найлепшых прадстаўнікоў нашае эміграцыі.

Чытаючы Белакоза, набываеш калясальны зарад аптымізму, душэўнае цьвёрдасьці. Дапамагае прыклад Чалавека, які ўсё жыцьцё змагаецца зь сьмяротнай хваробай, але на ўласнай больцы не зацыкліўся, імкнецца дапамагчы й іншым. Ягоныя парады, як лячыць рак прыкладаньнем медзі, лекцыі пра карысьць крамянёвае вады настолькі пераканальныя, што хочацца адразу ж бегчы ў поле, шукаць тыя крамяні. Бо аўтар усё выпрабаваў на сабе. Кніжка для ўсіх, каго апанавала паняверка.

Яўген Квач

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

Атэны між Менскам і Вільняй

Шанаваньне Міхала Клеафаса Агінскага ў Залесьсі, ягоным родавым маёнтку, безь перабольшаньня ўзьведзенае ў ранг культу. І падрыхтоўка да штогадовага сьвята, прысьвечанага князю-кампазытару-паўстанцу, ідзе такая, нібыта ён сам прыедзе. Вось быў бы сюрпрыз для ўсіх, хто зьбярэцца ў Залесьсі 28 верасьня! Зрэшты, і бяз князя там цікавага хопіць. Гледачоў чакае карнавальны Паўночнаатэнскі пасьянс (яго ўдзельнікам больш не давядзецца дэфіляваць у кардонных капелюшах — ёсьць шыкоўныя касьцюмы з Купалаўскага тэатру); пошукі Бэльвэдэру; конкурс на найлепшую страву (княская кухмістарская заахвочвае гледачоў везьці свае кулінарныя цуды); канцэрт, у якім знойдзецца месца й незапрошаным музыкам ды паэтам. І — куды ж без пачосткі: апроч традыцыйных залескіх канапак і вогненнай «Бэльвэдэраўкі», княская кухмістарская выстаўляе гасьцям казан гарачае бульбы пад соўсам «Паляньз».

Даехаць да Залесься можна віленскім цягніком (адыходзіць зь Менску ў 6.35, квіток каштуе 4000). Можна таксама ехаць электрычкай да Маладэчна (зь Менску ад'яжджае ў 6.39), а далей гудагайскім дызэлем. Гэтак будзе даўжэй, але таньней. Пачатак імпрэзы а 12-й. У дарогу варта цёпла апрануцца. Зрэшты, арганізатары абяцаюць вогнішча.

Цень К.

ФЭСТЫВАЛІ

Прыз для кампутарнай канарэйкі

18—20 верасьня ў Магілёве прайшоў чарговы фэст анімацыйнага кіно «Анімаёўка-2003». Свае новыя працы на конкурс папрывозілі мультыплікатары зь Літвы, Латвіі, Польшчы, Расеі, Казахстану. Сярод пераможцаў — менская рэжысэрка Алена Пяткевіч.

Мэтай фэстывалю было ня толькі ацаніць «у кулюарах» новыя творы, але і паказаць іх дзецям, расказаць, як робяцца мультфільмы. Для гэтага ў дзесяці раённых цэнтрах Магілёўшчыны прайшлі творчыя сустрэчы з удзельнікамі фэсту. Акрамя аніматараў да дзяцей у госьці прыехалі прадстаўнікі дзіцячых тэлеперадач «Калыханка», «Мультыклюб» і інш.

Усяго на конкурс былі выстаўленыя 34 стужкі 12 студыяў, 150 мультфільмаў дэманстраваліся па-за конкурсам. Фільм менскай рэжысэркі Алены Пяткевіч «Песенька для канарэйкі» атрымаў спэцпрыз за ўвядзеньне новых кампутарных тэхналёгій. Стужка Каіргалі Касымава, прадстаўніка «Казахфільму», уганараваная прызам за павагу да нацыянальнай культуры. Менавіта гэта тэма зьяўляецца асноўнай у творчасьці Казахскай студыі. Латыскую аніматарку Разалію Стыебру ўзнагародзілі за разьвіцьцё новых тэндэнцый у анімацыі. Латышы прывезьлі тры стужкі, аб'яднаныя адной тэмай — фантазіі аб Афрыцы: «Тайзанія», «Падарожжа», «Адзін свабодны дзень». Так, «Тайзанія» нагадвае дзіцячы малюнак флямастэрамі на лісьце сшытка.

Гран-пры фэсту атрымала студыя «Млын» зь Пецярбургу за карціну «Карлік Нос» (дэбют аніматара Івана Максімава), выкананую ў дыснэеўскай манеры. Але ўжо ў наступнай стужцы «Алёша Паповіч» расейцы паспрабуюць адшукаць свой стыль.

Вольга Сінькевіч

Беларускі фэстываль у Брукліне

WWW.BELAOC.COM

У мінулую нядзелю ў парафіі Катэдральнага Сабору БАПЦ сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне прайшоў 3-і Беларускі фэстываль.

Раніцай Сьвятую Літургію адправіў а.Ігар Якунін з іерадыяканам Васілём Касьцюком, прыгожа сьпяваў хор пад кіраўніцтвам Ліды Кано. Пасьля службы ўсе сабраліся ў прыбранай ручнікамі царкоўнай залі, дзе чакаў прыгатаваны нашымі ахвярнымі парафіянкамі выбар смачных беларускіх страваў — дранікі, сырнікі і г.д. Гэтыя стравы парафіянкі прадавалі на вуліцы перад царквой, дзе ў гэты дзень мясцовыя амэрыканскія арганізацыі ладзілі вялікі гадавы кірмаш, названы «Atlantic Antic». Шырокая вуліца была на цэлы дзень зачыненая, і на ёй павыстаўлялі тавары сотні амэрыканскіх і розданаэтнічных гандляроў. Беларускія стравы карысталіся добрым попытам, і ўвесь падрыхтаваны запас быў прададзены яшчэ перад канцом кірмашу.

Тым часам у царкоўнай залі пачалася канцэртная частка фэстывалю. Нашыя мілыя парафіянкі-сьпявачкі Ліда Кано і Рыма Пракопчык пад акампанэмэнт Таццяны Дзямешчык выдатна прасьпявалі некалькі беларускіх песьняў. Новай зьявай на нашай сцэне было трыё Таццяны Дзямешчык, яе дачкі Вольгі ды Настасьсі Стралец, выступ якіх выклікаў захапленьне публікі. Апошняя парадавала ўсіх яшчэ і сольным выкананьнем нашых песьняў. Пасьля канцэрту была разыграная багатая лятарэя, пераважна з вырабаў беларускага народнага мастацтва.

Барыс Данілюк, Нью-Ёрк

ДЫСКАГРАФІЯ

Promo

Валік Грышко (р) 2003

Вось і Грышка, вядомага з творчай суполкі «Беларускі клімат», закранула хваля музычнай беларусізацыі. На гэтым дыску падабраныя песьні, найбольш прыдатныя для радыёэтэру: некаторыя зь іх ужо даўно вядомыя («Што за месяц», зробленая для «Песьнярка», «Лалала» — ня блытаць з анэмпадыстаўскай!), некаторыя сьвежазапісаныя. Сьпяваць пабеларуску Грышко наважыўся нядаўна, і, прызнаецца Валік, пісаць тэксты пакуль складана — не заўсёды хапае словаў. Таму музыкант просіць усіх зацікаўленых у супрацоўніцтве паэтаў зьвяртацца да яго. У гэтым прома-дыску з тэкстамі яму дапамог студэнт філфаку Стас Карпаў.

Грышко вядомы сваімі музычнымі экспэрымэнтамі: то ўсе чатыры струны бас-гітары аднолькава наладзіць, то акустыку грае, то кідаецца ў дзікую электроншчыну... Песьні Грышка зачароўваюць, ствараюць невытлумачальную атмасфэру, яны (напрыклад, «Каханая») хутчэй для мэдытацыі, чым для танцаў. Валік сам неяк назваў свой стыль «халодным рамантызмам». Дакладна акрэсьленая мэлядычная лінія ў кожнай песьні, запаволены рытм, сьветлыя тэксты — у гэтым увесь Грышко. Адзінае «але» — словы не заўсёды можна разабраць, часам яны зьліваюцца з музыкай. У астатнім — шыкоўны альбом, хоць і ня кожны ды-джэй наважыцца паставіць нешта зь яго ў этэр.

Запаветы апошняга старца

Znich (р) 2003

Гэтую праграму «Znich» грае ўжо тры гады, толькі вось запісаць яе як сьлед не маглі — падчас запісу музыкі скарысталі ажно шэсьць студыяў. Акром звычайнага набору электраінструмэнтаў у музыцы «Зьнічу» гучаць літаўры, дуда, ліра, акарына. Дарэчы, на дудзе падыграў Канстанцін Трамбіцкі, які часам гудзе ў «Нэйра Дзюбелі». На дыску цікаўныя знойдуць яшчэ й кліп на песьню «Што за ўсё тлусьцейшае», а таксама 20-хвілінны фільм пра «Зьніч».

Сяргей Будкін

Аўгустоўскі канал чакае

Каля дзевяці гадоў мне прыйшлося працаваць у саўгасе, а пасьля калгасе «Беларусь». Па землях гэтай гаспадаркі працякаў Аўгустоўскі канал, каля невялічкай вёсачкі Нямнова ён упадаў у Нёман. Я памятаю, што заўжды вёска Нямнова і канал былі месцам правядзеньня масавых культурных мерапрыемстваў. Чаму менавіта там? Таму што гэтыя мясьціны вельмі прыгожыя і прыродна багатыя.

З разьвіцьцём чыгунак і аўтадарог канал заняпаў. Зрэшты, хоць з дня пуску каналу ў эксплюатацыю прайшло 165 гадоў, плаціна з мэталёвых канструкцыяў захавалася вельмі добра. Яна накіроўвае воды каналу на тры шлюзы.

За саветамі перасьледавалі нават былых работнікаў каналу. Інжынэра Ўрбанка арыштавалі і кінулі ў адзін з паўночных лягераў. Яго жонку Ніну Сямёнаўну з двума малымі вывезьлі ў Казахстан. Інжынэр пасьля выехаў у Польшчу, дзе й памёр, так і ня змогшы аб'яднацца зь сям'ёй, якая вярнулася ў Нямнова. Сын Урбанка Тадэвуш вырашыў аднавіць гісторыю Аўгустоўскага каналу як памяць аб бацьку. За свае грошы ўзьвёў невялічкі будынак, у якім утварыў музэй. На сьценах разьвешаныя дыяграмы і пляны, фатаздымкі, у папках — дакумэнты... Тадэвуш зрабіў бы, можа, значна болей, але ж жыцьцё яго склалася трагічна. На здароўі адбіліся рэпрэсіі, цяжкія ўмовы ў Казахстане. Ён заўчасна памёр чатыры гады таму. Яго жонка Аўгіньня да гэтага часу носіць жалобнае адзеньне і шкадуе, што яе Тадэвуш не пасьпеў зьдзейсьніць свае задумкі да канца і ўзбагаціць музэй новымі экспанатамі і дакумэнтамі.

Гадоў зь пяць таму кіраўнікі раёну загаварылі, што трэба заняцца рэстаўрацыяй каналу, нават называлі лічбу выдзеленых грошай: семдзесят тысячаў дэнамінаваных рублёў. Быў нават прызначаны адказны за вядзеньне работ, Уладзімер Петух. «А што я мог зрабіць, — казаў ён мне, — за гэтыя дэнамінаваныя рублі? Роўна нічога, таму работ не пачынаў, а грошы пайшлі на іншыя мэты»...

Але ў цёплы час на Аўгустоўскім канале ля вёскі Нямнова жыцьцё не замірае. Тут ёсьць невялічкі драўляны будынак ад гарадзенскай турбазы «Нёман». У ім бавяць свой адпачынак турысты.

Ільля Барысаў, Скідзель

Душа ліцэю жыве

Пасьля чытаньня разнастайных артыкулаў пра ліцэй, яго абарону і адважных ліцэістаў, складаецца памылковае ўражаньне пра гэтую ўстанову. У прэсе яна паўстае жывым прыкладам старагрэцкай школы ці якога сярэднявечнага ліцэю. Міжвольна ўсплывае вобраз: ад раніцы да ночы, сагнуўшыся, дзеці сядзяць у клясе ці ў бібліятэцы, напружана нешта чытаюць ды вывучваюць. А дзеці паўстаюць замкнёнымі, розумам патанулымі ў крыніцах ведаў і толькі цяпер, калі нешта навокал адбываецца, абуджанымі ад гэтага навуковага сну.

На шчасьце, гэта ня так. Бо ліцэй унікальны якраз таму, што тут ня так, як паўсюль. Тут дзеці імкнуцца не замкнуцца ў сабе, а наадварот — раскрыцца. Выкладнікі не баяцца сказаць дзецям праўду ці выказаць уласны пункт гледжаньня, імкнуцца гаварыць шчыра й сур'ёзна, як з дарослымі. Лявон Баршчэўскі ніколі ня ткне на каго-небудзь пальцам і не заявіць: «Прэч з клясы!» Вось чаму такое зьдзіўленьне выклікаў выступ новапрызначанай Шчарбачэвіч, якая з злосным лямантам пачала на ўсіх паказваць пальцам. Ліцэй, які ніколі ня чуў у сваіх сьценах такой беспадстаўнай лаянкі і абыякавасьці да тутэйшых маральных законаў, быў узрушаны і аднагалосна выступіў супраць зьменаў. Гэта не беспадстаўны кансэрватызм, гэта здаровы сэнс і павага да традыцыяў.

Сёньня, седзячы ля ліцэю на халодным асфальце, сто разоў перамаляваным ліцэйскімі лёзунгамі, міжвольна ўзгадваеш усё, што зьвязвае цябе з гэтымі сьценамі: сябра па парце, выкладніка беларускай мовы, заняткі з хіміі. Хочацца вярнуцца ў той час, калі дзень за днём ліцэісты разам з сваім творчым выкладнікам Сяргеем Патаранскім ставілі «Паўлінку». Сёньня ня думаеш, як часам гэта не падабалася, як ты ненавідзеў, калі хтосьці «завальваў» сцэну, але ўзгадваеш твары гледачоў на прэм'еры ці першае прымерваньне строяў. Немагчыма забыцца, як пасьля дэманстрацыйнага прагляду «Паўлінкі» Колас з Патаранскім аднадушна прамовілі: «Мала эротыкі...» І ты стараешся мацней прыціснуць да сябе Паўлінку ці душэўней уздыхнуць, калі яна ад цябе зьбягае... толькі каб дагадзіць рэжысэру. Прыгадваецца, як на першай рэпэтыцыі тэатральнай бойкі ты разьбіў Адольфу Быкоўскаму нос, а табе незнарок расквасілі губу. Не забываешся, як шчыра рагатала заля пасьля чарговага жарту і як табе дарылі першую «тэатральную» кветку.

А ці можна забыць, як на занятках з сусьветнай гісторыі Валянцін Мазец да расповеду пра якую-небудзь гістарычную падзею абавязкова дадаваў актуальны анэкдот? Альбо як на занятках эканомікі Аляксея Янукевіча навучэнцы арганізавалі незаплянаваную дыскусію на тэму «Глябалізацыя: за і супраць», дзе самастойна вырашалі лёс «Макдональдзаў»? А як на хіміі Ю.Касьцюковіч спрачаўся з навучэнцамі наконт вымаўленьня назваў розных хімічных элемэнтаў альбо дыскутаваў на тэму «Як слушна: «этэр» ці «эфір»? А якая школа можа пахваліцца выкладнікам, што на ўроках літаратуры цытуе творы на дзясятках моваў сьвету?!

Глядзіш на будынак — узгадваеш усеагульнае перадсьвяточнае афармленьне, калядную імпрэзу, Дзень першакурсьніка. Калі ліцэісты гатавалі стравы народаў сьвету, а тваёй групе выпала заняцца расейскім сталом, ты наварыў шэсьць гатункаў розных пельменяў, а побач паклаў нарэзаны салёны агурочак і лустачку чэрствага хлеба. Альбо як на Дзень сьвятога Валянціна, падпісваючы сорак дзявятую валянцінку, сустрэў узыход сонца. Узгадваеш, як на дзень самакіраваньня давялося выконваць ролю дырэктара ліцэю альбо кагонебудзь з выкладнікаў: сядзець за настаўніцкім сталом, слухаць адказы, ставіць адзнакі, тлумачыць дапытлівым ліцэістам новую тэму...

Ліцэй параўноўваеш зь месцам выкананьня жаданьняў. Калі чалавек захацеў нечага дасягнуць — у ліцэі ўжо любыя ўмовы створаныя. Застаецца папрацаваць самому чалавеку. Прычым у гэтым месцы адна ідэя не пярэчыць іншай ідэі. Адна насьценгазэта не перашкаджае існаваць чатыром іншым. Кожнае выданьне («Грайчык», «Валянцінка», «Перапынак», «Ліцэйка», «Трыкутнік») не падобнае да іншага.

ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Паступіўшы ў ліцэй, ты атрымліваеш падарунак, які кампэнсуе любыя маральныя страты за час уступных іспытаў, — новых сяброў. За год супольнай вучобы ў тваім нататніку зьяўляецца сотня новых тэлефонаў, па якіх ты заўжды можаш патэлефанаваць. Часам шчырае сяброўства перарастае ў каханьне.

Дамаляваўшы надпіс на асфальце, ты сядаеш на лаўку і задумваешся: «Каму гэта ўсё перашкаджае?!» Пытаньне ўжо не патрабуе адказу. Галоўнае, што гэта трэба табе, тваім сябрам. Ліцэй створаны, каб існаваць, каб гадаваць адкрытых, справядлівых і шчырых людзей, за якіх сапраўды ня будзе сорамна, бо жыць і любіць іншых іх навучыў ліцэй. А гэта ня проста так...

Ліцэй ня зьнішчаны. Ліцэй пазбавілі абалонкі — будынку на Кірава, 21, але яго душа, як і ў містычных гісторыях, вылецела і цяпер вандруе разам зь ліцэістамі ды выкладнікамі. Гэтая душа ў кожным ліцэісту, выкладніку, бо менавіта яна і гуртуе іх.

А мы, людзі з гонарам і пачуцьцём годнасьці, людзі, блізкія да ліцэю, прысягаем ліцэю ва ўсім. Прысягаем негалосна, прысягаем працаю, ведамі, сабою. Прысягаем на вернасьць, на павагу, на любоў. Прысягаем берагчы гэтае адно невялікае зярнятка, якое здольнае ўскаласіць ніву й падняць з каленяў Бацькаўшчыну.

Франак Вячорка, Менск

* * *

Урад беларускі павінен быць на старане Беларускага Ліцэю і быць талерантным да іншамоўных школ. Урадоўцы беларускія павінны шанаваць беларускую школу, бо ж гэта ўсё ж край беларускага народу, у якім ім давялося быць урадоўцамі.

Напад на беларускія школы зробіць народ разгневаным і непаслухмяным, бо кожны народ мае права мець свае школы на роднай мове, у гэтым ліку ёсьць беларусы. Жадаю прыйсьці да паразуменьня і пакінуць Ліцэй беларускамоўны, каб прадоўжваў сваю гуманітарную працу на карысьць людзтва.

Кастусь Верабей, Нью-Ёрк

З тапанімікай Полацку трэба нешта рабіць

Полацкая філія Беларускай асацыяцыі журналістаў зьвярнулася да старшыні Полацкага гарвыканкаму Ўладзімера Тачылы зь лістом, у якім выказала прапановы па перайменаваньні вуліц гораду. Полацак старанна працуе над тым, каб ператварыцца ў галоўны турыстычны цэнтар краіны. Штогод зьяўляюцца новыя музэі, рэстаўруюцца старыя будынкі, узьнікаюць новыя кавярні. І толькі ў справе тапанімікі не адбываецца станоўчых зрухаў. За апошнія пяць гадоў меў месца адзіны выпадак перайменаваньня, калі замест Фрунзэ зьявілася вуліца Эўфрасіньні Полацкай. Гістарычны цэнтар гораду перанасычаны камуністычнымі назвамі: Камуністычная, Леніна, Маркса, Энгельса, Сака і Ванцэці, Сьвярдлова і г.д. Гэткая тапаніміка выглядае недарэчнай для гістарычнай сталіцы краіны. Полацкія сябры БАЖу прапанавалі свой сьпіс імёнаў для полацкіх вуліцаў: Рагнеда, Рагвалод, Усяслаў Чарадзей, Сімяон Полацкі, Ян Баршчэўскі, Вацлаў Ластоўскі, Язэп Драздовіч, Васіль Быкаў.

Праблема тапанімікі Полацку неаднойчы ўздымалася. А ў 1998 г. сябры грамадзкага аб'яднаньня «Полацкая ініцыятыва» нават правялі акцыю: вуліцы Дзяржынскай, што ў Задзьвіньні, была сымбалічна «вернутая» гістарычная назва — вуліца Віленская.

Алесь Козік, Полацак

ПЫТАНЬНЕ—АДКАЗ

Хачу пахрысьціць дзіця паводле ўніяцкага абраду, на беларускай мове. Дзе гэта можна зрабіць? Каталікам, праваслаўным проста, а ўніяцкай царквы-будынку няма.

Дзьмітры Поўта, Менск

З уніяцкімі сьвятарамі можна скантактавацца праз т.: 251-06-20 (а.Казімер), 219-71-94 (а.Андрэй).

***

Кніга Джаан Роўлінг «Гары Потэр» сталася хваробай усяе Эўропы — з паліцаў крамаў яе разьмятаюць дарэшты. Між тым, гэта падрабязны дапаможнік па ўводзінах у варажбу ды магію, што ёсьць агідай перад Богам. На маю думку, наступствы для псыхікі дзіцяці ад гэтага чытва кепскія.

Алесь Губін, Барань

Што казаць, каб цябе абралі ў парлямэнт

Сёньня пануе дзіўнае меркаваньне, што беларусы — народ з сацыялістычнымі прыхільнасьцямі. Увогуле, вобраз беларускага мужыка (чытай «працоўнага»), які дурыць пана (чытай «капіталіста»), вядомы яшчэ зь дзіцячых казак. Першыя беларускія партыі таксама мелі сацыялістычную афарбоўку, а сам нацыянальна-вызваленчы рух меў яскрава акрэсьлены сацыял-дэмакратычны характар. Праграмныя мэты сацыялістычнага кшталту можна адшукаць і ў дакумэнтах новых беларускіх партый — БНФ узору 1993 г., напрыклад.

Самі беларусы, аднак, звычайна галасуюць за вольны рынак. Толькі не на выбарах, а рублём ці нагамі. Рублём, калі ідуць у прыватную краму, стаматалягічны кабінэт, едуць прыватным аўтобусам, — прыкладаў безьліч. Нагамі — калі выяжджаюць у краіны далёкага ці блізкага замежжа, дзе, папрацаваўшы больш, больш зарабляеш.

Нярэдка можна пачуць, што беларусы не прыдатныя да працы ва ўмовах рынкавай эканомікі. Тым часам беларускія будаўнікі і маляры ў Маскве — самая высокааплатная група гастарбайтэраў. Працадаўцы з краінаў Захаду таксама аддаюць перавагу беларусам, а ня іх усходнім (і нават заходнім) суседзям. Было б дзіўна, калі б столькі людзей памыляліся ў сваім выбары найлепшых памочнікаў для ўласнага бізнэсу.

Размовы аб тым, што эканоміка павінна быць сацыяльна-арыентаванай, а дзяржава мусіць нэўтралізаваць закладзеную ў вольным рынку сацыяльную несправядлівасьць, зьяўляюцца суцэльнай бязглудзіцай. Вольны рынак (інакш кажучы — капіталізм) сам па сабе ўжо зьяўляецца найбольш справядлівай у сацыяльным пляне сыстэмай, бо ён узнагароджвае таленавітых, сумленных ды працавітых людзей і карае лайдакоў ды несумленных. Капіталізм — сыстэма, у каторай чалавек можа жыць, толькі працуючы. Ці можа быць нешта больш справядлівае?

Для дэмакратычных кандыдатаў працягваць «сацыяльна-рынкавую» рыторыку — азначае гуляць на адным полі з прадстаўнікамі ўладаў, якія таксама пойдуць на парлямэнцкія выбары. Тут спрэчкі паміж кандыдатамі магчымыя толькі ў рэчышчы таго, хто больш наабяцае выбарнікам разнастайных ільготаў, прывілеяў ці падарункаў у выглядзе аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры, дзіцячых пляцовак і г.д. Выбраць такую тактыку кандыдату не ад улады — значыць прайграць, бо ну ня можа партыя ці асобны чалавек абяцаць выбарніку пабудаваць нешта! А вось дырэктар прадпрыемства — можа, бо гэта яго праца.

Наступны шлях для незалежных і партыйных кандыдатаў — рэзаць праўду-матку і пра рынкавую эканоміку, і пра розныя неабходныя рэформы, патрэбныя сацыяльныя інстытуты і г.д. Праблема толькі ў тым, што беларусы пабачылі ўжо людзей у палітыцы, якія нібыта рабілі нейкія рэформы. Аднак лепш ня стала. А цяпер тлумачыць, што рэформаў ніякіх не было, таму і вынікаў быць не магло, — марнаваньне часу і сродкаў.

Выбарнікі галасуюць за стабільнасьць, а не за левых ці правых, сацыялістаў ці рынкавікаў. Навошта пужаць кагосьці словам «рэформа», калі можна сказаць: «Мы будзем мець тое і тое, калі пажадаем». Людзі любяць упэўненасьць. Ад кандыдата патрабуецца галоўнае — мець бачаньне разьвіцьця сваёй краіны, рэгіёну, гораду. Як будзе выглядаць месца жыцьця выбарніка праз пяць гадоў — вось што сапраўды яго цікавіць. Ці лёгка будзе знайсьці працу, ці добра будзе працаваць паліклініка, ці будуць яго дзеці мець нейкія пэрспэктывы ў жыцьці — вось што ён жадае пачуць і ў чым ён хоча быць упэўнены. Але зрабіць беларускія гарады і рэгіёны квітнеючымі можна толькі праз пабудову адпаведных рынкавых інстытутаў, пабудову капіталізму. Іншага шляху няма. Таму кожны кандыдат павінен знайсьці адпаведныя словы, каб растлумачыць гэта сваім выбарнікам.

Міхал Дамінікан, Барысаў

КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

Наталка Бабіна

Тры калёны

КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

Я іх бачу штодзень з акна. Цяпер начамі іх падсьвечваюць пражэктары, дзеля чаго яны выглядаюць як выбеленыя сонцам косьці на тле асьпіднага неба. Раней яны бялелі мякчэй, а неба здавалася шаўковым. Мора бухала і тады, і цяпер; цыкады як надрываліся тады, так і надрываюцца; буханьне мора і віскат цыкадаў — нязмоўчныя гукі майго раю. І тры калёны, якія я бачу з акна. Парэшткі храму Апалёна. Храму, які мае да мяне яшчэ меншае дачыненьне, чым да туркаў. Бо я ня турак, я курд.

Бацька памёр у турме, калі мне было дзесяць. Усе ведалі, што яго забілі. Мы жылі з мамай і сястрой. Аднойчы на вуліцы мама, не стрымаўшыся, крыкнула малой: «Асьцярожна, павалішся!» — і яе забралі ў турму, бо курдзкая мова была тады забароненай. Да канца школы я навучыўся па-турэцку; тут у Анкары нешта шчоўкнула, і нас, хлопчыкаў-курдаў, сталі вучыць за дзяржаўны кошт ва ўнівэрсытэце — паводле праверaных янычарскіх рэцэптаў.

Вельмі хутка мы скантактаваліся; нашай мэтай не была помста; мы хацелі незалежнасьці. Я ведаў, што наша група — толькі частачка вялікай паўстанцкай арміі; недзе далёка ў гарах быў яе цэнтар; там па-курдзку не баяліся гаварыць; там снаваліся пляны і назапашвалася зброя. Атрымаўшы адтуль тэлеграму «Прыязджай. Цётка», мы з маім сябрам Ансарам павінны былі прыехаць у пэўнае месца. З гэтым веданьнем я вярнуўся з унівэрсытэту да трох калёнаў, буханьня мора і віскату цыкадаў. Да белых камянёў. Да старой матулінай вопраткі. Дадому.

У чаканьні тэлеграмы я працаваў гідам і вадзіў да трох калёнаў турыстаў, якіх станавілася штораз больш.

І яна была турысткай. З ангельскай групы. Пабачыўшы яе, я падумаў, што вось і знайшоў той калодзеж, зь якога буду чэрпаць усё жыцьцё. Усё глыбей і глыбей. І ніколі не нап'юся. Не наталю смагі.

І ў дзяўчынкі, якая ў нас народзіцца, будуць карыя, а ня чорныя, як у мяне, вочы, і русыя, а не бялявыя, як у Ліём, кудзеркі.

Ліём.

Так яе звалі.

Яна была з Ірляндыі.

Я мог уявіць яе ў сваім сьвеце. Яна прызналася мне, што на радзіме ўдзельнічае ў змаганьні.

Калі я вярнуўся з спатканьня, за вушаком бялела тэлеграма.

Прыбег спалоханы Ансар, які таксама атрымаў дэпэшу.

— Ты паедзеш? — зашаптаў ён. — Слухай, давай не паедзем, а? У мяне вымалёўваецца такі гешэфт... Можна зарабіць купу грошай, купу... Давай разам, а? Аб'яднаем капіталы, хе-хе... Ты не пашкадуеш. Га?

Невялічкі, як усе мы, ён выцягваў доўгую шыю, і прага жыцьця ды прага грошай рабілі яго дробны твар выразным.

Ноччу, пад буханьне мора, я сядзеў ля трох калёнаў, якія засталіся ад старога храму, — яшчэ не асьветленых пражэктарам. У паласе прыбою бокам насіліся крабы. Па старых камянях нячутна сьлізгала брунатная начная зьмяя. Моцна пахла бугенвілія, і разагрэты за дзень лаўрус, і дзікі бурачок. Як пад падкладкай, пад гэтымі пахамі хаваўся смурод фэкаліяў.

Не пытайся, што я вырашыў у тую ноч, — зазірні ў сваю душу. Але я раскажу табе, што было далей.

Да Ліём я больш не пайшоў, нават не разьвітваўся. Мы з Ансарам узяліся за гешэфты; у пэўны момант я змог стрымацца і набыў вось гэты магазынчык; Ансар жа ня змог і страціў усе свае шалёныя грошы гэтаксама хутка, як і набыў. Цяпер ён працуе ў адным з гатэляў, што паўсталі на нашым беразе.

А сёньня час зьвіўся ў сувой.

Маладая Ліём увайшла ў мой магазын, а за ёю сьледам — Ліём пастарэлая.

Я адрухова схаваўся ў кут. У маладой Ліём былі ня карыя, а сівыя вочы і ня русыя, а бялявыя кудзеркі. Маці і дачка крутнуліся па забітым турэцкім барахлом пакойчыку — і выйшлі.

Буханьне майго сэрца заглушыла буханьне мора і віскат цыкадаў.

Гэта была ўжо другая кропля.

Першая ж кропля — з тых, што камень точаць, з тых, якімі катуюць, — упала тады, калі я ўбачыў ля трох калёнаў жабрачку зь дзецьмі. У хлопчыка была сухая нага, і, навучаны мамай, ён выстаўляў яе наперад. І руку працягваў коўшыкам.

Пакуль яе не прагналі, жанчына зь дзецьмі сядзела ля трох калёнаў і прасіла міласьціну ў турыстаў.

Гэта была мая сястра. Зь дзецьмі, як і з паліцэйскімі, яна размаўляла па-турэцку.

У выцьвілай падзёртай абтрапанай хустцы.

У брудных выцьвілых шараварах.

Рука коўшыкам.

Мая сястра.

Па-турэцку.

Вось якія кроплі б'юць мяне ў скроню.

Ласкавая пані, мы, курды, як і туркі, не ўжываем алькаголю. Нам забаронена. Ня думай, што я п'яны.

Але я няварты.

Сорак гадоў мне, і я зразумеў, што я няварты. Як у вас кажуць, смакоўніца бясплодная.

Плёну ад мяне ўжо ня будзе, але я знаю, што зраблю.

Я дачакаюся, калі прарве каналізацыю і пах фэкаліяў вырвецца з-пад падкладкі; тады я зайду ў мора і не вярнуся. Хай мяне потым выкіне на бераг. І хай мяне пабачыць Ансар.

Ён працуе на гатэльным пляжы, зьбірае сьмецьце, якое выносіць мора. Прага да жыцьця ўжо сьцерлася зь ягонага твару, засталася толькі прага грошай. Хай ён мяне пабачыць.

Хай і мяне вынесе мора. Разам з гаўном. Пад тры калёны.

Віншаваньне маме



Я не хацела, каб яна сталела, даросьлела, старэла… Мне падабалася бачыць яе такой: цёплай і маладой, пяшчотнай, юнай і крыху дзіцячай, з празрыстай скурай — сваю мініятурную, тоненькую, з пахам восеньскіх кветак, адсырэлай лістоты, згубленых у жыце валошак, аладак зь яблыкамі, журавінавага сочыва і несасьпелага бэзу маму. Мне заўсёды здавалася, што ёй мусіць вечна быць трыццаць, пасьля — вечна трыццаць пяць… Бо твая мама павінна быць прыгожай, а галоўная прыкмета хараства — маладосьць. Гэтыя дзявочыя рысы твару, стан, хада, голас, валасы, туга зьвязаныя ў коску… Я памятаю яе такой, калі яна — мне было гады чатыры — стаяла ля чарупіны і плакала, гледзячыся ў свой люстэркавы адбітак. Чаму яна плакала — я ня памятаю. Дзеці звычайна не складаюць падзеяў у сюжэты, а сюжэтаў — у эпапеі талстойскага тыпу, як гэта робяць дарослыя, а, сьпяшаючыся бачыць і запамінаць, вырываюць найбольш удалыя пярэстыя кавалкі, як у добра зрэжысаваным французскім фільме. Можа, гэтак слушней. Яна стаіць, крыху сонная, у нечым шэрым — швэдры ці кашулі, прытомленая, вытанчаная і вельмі простая, хаця і незвычайная. Не звычайная. Такія моманты закладаюць у чалавека ўяўленьне пра сябе і сьвет. Кветкі мусяць быць сьвежыя і хутка зьвядаць, як усё прыгожае і маладое — хутка старэць, усыпацца зморшчынамі, траціць колер і ўрэшце — зьнікаць.

Гэтак усюды, але яна гэткая ж маладая. Моцная. Рашучая. Дарослая. І прыгожая.

Я памятаю, як аднаклясьнікі ў малодшай школе запытваліся адно ў аднога пра век сваіх бацькоў. Я заўсёды ганарылася: бацькам некаторых малых са шматдзетных сем'яў было нашмат больш, чым маім. Чамусьці было лепш мець маладзейшую сям'ю. Прыстойней у дзіцячых вачах.

Страшна, што яны раптам пастарэюць. Мы хочам рабіцца самастойнымі, выходзіць замуж і зьяжджаць на заробкі ў Злучаныя Штаты, набываць аўтамабілі, арганізоўваць прадпрыемствы-таварыствы-кампаніі, пісаць кнігі і здаваць іх у выдавецтвы, нараджаць дзяцей — сумнавокіх дзяўчынак і хлопчыкаў, якія стануць размаўляць па-беларуску ў дзіцячых садках, садзіць дрэвы — грушы і сьлівы, гуляць у більярд і падарожнічаць у Зымбабвэ ці на Тыбэт. Але, вярнуўшыся ў дом маленства, мы хочам бачыць сваіх бацькоў гэткімі ж вясёлымі-бадзёрымі-энэргічнымі. Маладымі і прыгожымі. Без хваробаў. Без навязьлівых і думак і старэчых страхаў. Шчасьлівымі і самадастатковымі. Сучаснымі.

Усім дзецям здаецца, што пасьля трыццаці жыць настолькі нецікава, што лепш ужо проста памерці ды ня мучыцца. Пазьней гэты парог ад'яжджае да сарака-пяцідзесяці і пэнсіі. Моладзі здаецца, што сьвет належыць моладзі. І гэтак у арытмэтычнай прагрэсіі. Натуральна, што сьвет належыць і тваім бацькам. Значыць, ім абавязкова заставацца маладымі?

Гэта як пэўны комплекс: ты хочаш прабіць нос і пафарбаваць вейкі ў зялёны колер, сесьці на дыету, распаўнець і зноў сесьці на дыету, апрануць новую спадніцу, пайсьці на канцэрт, у клюб, паехаць да сяброўкі, прачытаць раман і наладзіць фатасэсію ва ўласнай кватэры, а твая мама мусіць вечна стаяць ля чарупіны — худзенькая, нязьменна маладая ў шэрым швэдры ці кашулі. Як увасабленьне тваёй уласнай непахісныасьці і маладосьці. Адарваўшыся ад яго, разумееш, што прыгажосьць ня толькі ня мае нічога супольнага з гадамі, але з гадамі набывае ўсё большую вартасьць. Яна робіцца цярпкай і насычанай, мудрай і зыркай, зусім не такой, як юнацкая — мімалётная, занадта вонкавая, каб ёю захапляцца ўсур'ёз. Урэшце, калі тваёй маме будзе вечна трыццаць пяць, трыццаць пяць так ніколі і ня споўніцца табе. А табе гэта так трэба. Хаця б дзеля таго, каб самой упэўніцца, што жыць цікава і тады, а памерці і ня мучыцца хочацца ўсё меней.

Тэда Лі

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Трацяк І. Біблія ў кантэксьце беларускай культуры: Вуч. дапам. / Гродзенскі дзярж. ун-т імя Я.Купалы. — Гродна, 2003. — 100 с. 200 ас.

Аўтар прасачыў гісторыю рукапіснай і друкаванай Бібліі, акрэсьліў шлях да беларускамоўнага Сьвятога Пісьма. Асобныя разьдзелы кнігі прысьвечаныя суіснаваньню хрысьціянства і народнай культуры, уплыву Бібліі на літаратуру. Цана ў «Акадэмкнізе» 2300 руб.

Ипатава В. Петнайсет стихотворения и една повест / Превод от беларуски Н.Вълчев. — «Илинда—Евтимов» ЕООД, 2002. — 84 с.

Пятнаццаць вершаў і аповесьць «Прадыслава» В.Іпатавай перакладзеныя на баўгарскую мову.

Улащик Н. Деревня Вицковщина 1880—1917 г. Историко-этнографический очерк. Воспоминания о Николае Улащике. — Масква.: ИМЛИ РАН, 2003. — 192 с. 600 ас.

Адной з апошніх працаў Мікалая Ўлашчыка — легенды беларускай гістарычнай навукі — было гэтае дасьледаваньне. Аўтар напісаў вычарпальную гісторыю роднае вёскі. Асаблівая ўвага зьвернутая на гаспадарку — мноства лічбаў, тэрмінаў, красьлюнкаў. Шкада, што набыць яе можна толькі ў Маскве, у Інстытуце сусьветнай літаратуры Расейскае акадэміі навук.

Беларусь мая, песьня мая…: Фотаальбом / Уклад. А.Бадака. — Менск: Літаратура і мастацтва, 2003.

«Падарункавых» выданьняў зьяўляецца ўсё больш. Большая частка ілюстрацыяў тут — беларускія краявіды ў мала чапанай рукамі чалавека прыгажосьці. На кожнай старонцы зьмешчаныя й вершы — прызнаньні ў каханьні да роднага краю, напісаныя Л.Галубовічам, Н.Гілевічам, М.Стральцовым, М.Танкам, В.Шніпам ды інш. Цана 8500 руб.

Гульні, забавы і ігрышчы / НАН Беларусі; Уст. артыкул, уклад., клясыфікацыя й сыстэматызацыя матэрыялаў, камэнтар А.Лозкі. — 3-е выд. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 534 с. — (Беларуская народная творчасьць)

Кніга з сэрыі «БНТ» вытрымлівае другое перавыданьне. Яе матэрыялы даюць уяўленьне пра тое, як бавілі вольны час нашы продкі. Падрабязныя апісаньні дапоўненыя нотамі. У аснову выданьня пакладзены запісы расейскіх ды польскіх дасьледчыкаў XIX — пач. XX ст., а таксама матэрыялы этнаграфічных экспэдыцыяў XX ст. Цана 3500 руб.

Запрудзкі І. Нарысы гісторыі беларускай літаратуры XIX ст. / БДУ. — Менск, 2003. — 138 с.

Накладам 50 ас. катэдра гісторыі беларускай літаратуры БДУ выдала кнігу, дзе ўзьнятыя маладасьледаваныя ды спрэчныя пытаньні з гісторыі новай беларускай літаратуры. Аўтар падае кароткі аналіз творчасьці Каратынскага, разглядае матывы каханьня ў лірыцы Дуніна-Марцінкевіча, прасочвае ўплыў беларускага друку сярэдзіны XIX ст. на фармаваньне нацыянальнай сьвядомасьці. Асобныя разьдзелы прысьвечаныя таксама новым аспэктам вывучэньня творчасьці Багушэвіча ды фэномэну запозьненага рамантызму ў творчасьці Янкі Лучыны. Знайсьці манаграфію можна ў «Акадэмкнізе».

Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / НАН Беларусі; Уклад., клясыфікацыя й сыстэматызацыя матэрыялаў, камэнтар А.Гурскага; Уст. артыкул А.Гурскага, А.Ліса. — 2-е выд., выпр. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 429 с. — (Беларуская народная творчасьць)

Супрун В. 100 пытаньняў і адказаў з гісторыі Слонімшчыны. — Слонім, 2002.

Хурсік В. Кроў і попел Дражна: гісторыя партызанскага злачынства. — Менск, 2003. — 76 с.: іл.

Пра злачынствы фашыстоўцаў у Беларусі напісана багата. Іншы бок гэтай страшнай вайны — неабгрунтаваная жорсткасьць партызанаў да сваіх жа суайчыньнікаў, звычайных мірных жыхароў, да апошняга часу заставаўся амаль невядомым. Імкнучыся аднавіць гістарычную справядлівасьць ды ўшанаваць памяць ахвяраў, аўтар сабраў сьведчаньні жыхароў аднае вёскі — Дражна, дзе ў красавіку 1943 г. партызаны забілі 25 чалавек і спалілі шмат хатаў. Расповеды вяскоўцаў падмацаваныя зьвесткамі з дакумэнтаў, расшуканых дасьледчыкам у архівах. Наклад 150 ас., цана ў «Акадэмкнізе» — 3280 руб.

Тацяна Вабішчэвіч

Пабачылі Саўчанку ў спэктаклі Саткілавы



Аркадзь Саўчанка

Адкрыцьцё сэзону ў Опэры

Штогадовы надыход восені нечым падобны на сьмерць Ленскага ў чацьвертай карціне «Яўгена Анегіна». Кожны раз у Опэры ў старым чырвоным плюшавым фатэлі я з заміраньнем сэрца чакаю: можа, сёньня пашанцуе? Можа, не памрэ Ленскі, як памірае заўжды? Аднак прысуд, замацаваны ў лібрэта, ня можа быць скасаваны. Сьмерць Ленскага паўтараецца зноў і зноў з рэгулярнасьцю, усталяванай у афішы, — ад верасьня да чэрвеня. А потым два з паловаю месяцы антракт — аж да восені, калі распачынаецца чарговы опэрны сэзон.

Сёлета мы маглі застацца бяз Опэры — як жывём ужо цэлы сэзон безь Філярмоніі. У опэрнага кіраўніцтва зноў праблемы з МНС, якое патрабуе зачыніць тэатар з прычыны састарэлае электраправодкі і ненадзейных жалезабэтонных перакрыцьцяў. Аднак народ з заўсёдным энтузіязмам ходзіць у гэты тэатар, а артысты бясстрашна ў ім сьпяваюць.

Сэзон адкрыўся 16 верасьня «Хаваншчынай». Зусім як у маскоўскім Вялікім тэатры, толькі з большай радасьцю і душэўным трымценьнем. У Маскве публіку абшукваюць пры ўваходзе, а перад пачаткам спэктаклю неафіцыйна папярэджваюць, што відовішча будзе працяглым і змрочным. Пасьля чатырохгадзіннага спэктаклю «маскоўцы і госьці сталіцы» вяла пляскаюць у далоні і пачуваюцца пакрыўджанымі, бо «першыя асобы краіны» праігнаравалі адкрыцьцё сэзону. Менчукі, наадварот, зьдзівіліся б, каб нехта зь беларускіх начальнікаў раптам наведаў Опэру. Гэта адзінае месца, цалкам свабоднае ад міліцыі, намэнклятуршчыкаў, крымінальнікаў, ад «дзяржідэалёгіі», таннага густу і таннага алькаголю; прастора чыстай эмоцыі, братэрства і любові. Нават у опэрнай касе, дзе ідзе бітва за квіткі, пануе радаснае ўзбуджэньне і інтрыга: хто сёньня будзе сьпяваць? Ці будзе лепей, чым на прэм'еры? А калі апускаецца заслона, воплескі доўжацца ня менш за 15 хвілін.

Гэтым разам яны былі цалкам задаволеныя. Надта ж файны быў склад сьпевакоў — без каньюнктурных кампрамісаў, якія сапсавалі чэрвеньскую прэм'еру. Асаблівае ўражаньне зрабілі Васіль Кавальчук (Дасіфей), Уладзімер Пятроў (баярын Шаклавіты) і Натальля Руднева (раскольніца Марфа). Ніводзін зь іх у прэм'еры ня ўдзельнічаў, а Руднева ўвайшла ў спэктакль фактычна з адной рэпэтыцыі. Гэтыя тры артысты маглі б з посьпехам засьпяваць свае партыі ў любым тэатры сьвету. 16 верасьня яны сьпявалі для нас.

А 20 верасьня ў Опэры адбылося сьвята для снобаў — гэткім яно мусіла быць паводле задумы арганізатараў — «Баль-маскарад» Вэрдзі з Зурабам Саткілавам у галоўнай ролі. У 1970 г. я, яшчэ зусім малая, разам з маці слухала яго ў ролі Каварадосі («Тоска» Пучыні). Гэта быў незабыўны спэктакль — нават для дзіцяці, якое толькі пачынала разумець музыку. Саткілава акурат тады здабыў другую прэмію на конкурсе імя Чайкоўскага (пятую прэмію ў той год атрымаў беларускі тэнар Аляксандар Рудкоўскі, а шостую — Валер Кучынскі). Тады ж Саткілава выйграў конкурс імя Віньяса ў Барсэлёне. Аднак аж да 1974 г. ён заставаўся салістам Тбіліскае опэры, і толькі потым трапіў у Вялікі тэатар.

Абавязковую для савецкіх опэрных зорак стажыроўку ў «Ля Скала» ён адбыў пасьля кансэрваторыі, задоўга да конкурсных перамогаў. Саткілава абапіраўся на грузінскую культурную эліту, у той час надта ўплывовую ў Маскве. Аднак кар'еры на Захадзе не зрабіў: яму меней давяралі. «Цябе ў Італіі завэрбуюць», — сказаў яму намесьнік міністра культуры Ванько, да якога Саткілава прыйшоў прасіцца на гастролі. Сярод чыноўнікаў Мінкульту было тады шмат беларусаў, якіх прасоўваў сумнавядомы загадчык аддзелу культуры ЦК КПСС Васіль Шавура. «Беларус з жалобным тварам, які задушыў «Новый мир», — казаў пра яго расейскі пісьменьнік Віктар Ерафееў. Ня ўсе пасьля сустрэчы з тымі «ваярамі ідэалягічнага фронту» захавалі добрае стаўленьне да беларусаў. Саткілава — выключэньне.

Ён нярэдка наведвае Беларусь з канцэртамі. Канцэрты для яго — заробак. Многія ягоныя сваякі зьбеглі з Заходняе Грузіі, калі абхазы пры падтрымцы Расеі разьвязалі тамака вайну. Сьпявак падтрымлівае родных матэрыяльна. Адсюль неабходнасьць гастраляваць — у Расеі, а таксама ў Гішпаніі, Партугаліі, Італіі, Нарвэгіі, ЗША, Баўгарыі.

Пераважна ён сьпявае камэрны рэпэртуар у невялічкіх залях. Напярэдадні прыезду ў Менск Саткілава адкрываў сэзон у Малой залі Пецярбурскай філярмоніі. Гучалі рамансы і расейскія народныя песьні ў суправаджэньні аркестру народных інструмэнтаў. Дзіўнавата для ўраджэнца Сухумі, былога капітана тбіліскага «Дынама», які любіць грузінскія застольныя песьні й ведае іх безьліч. Але выбіраць не даводзіцца. Сьпяваць опэры Саткілава ўжо ня можа. «Які зь мяне 18-гадовы военачальнік Радамэс? Гэта толькі Павароці ня могуць запытаць, колькі яму гадоў, калі ён грае юнака», — казаў сьпявак.

Зь вялікіх роляў у Саткілавы застаўся толькі граф Рычард з «Балю-маскараду». Пастаноўку тае опэры ў Вялікім тэатры ажыцьцявіў у 1981 г. беларускі рэжысэр Сямён Штэйн. Рабілася яна акурат з разьлікам на Саткілаву. Роля Рычарда мо найпрыгажэйшая ў тэнаравым рэпэртуары. (Калі ў Павароці пыталіся, якую ролю ён бы ўзяў з сабой на Месяц, той адказаў: «Рычарда».) «Баль-маскарад» Штэйна трымаўся на афішах дваццаць гадоў запар, але потым «стаміўся» і гады два «адпачываў». У студзені 2003-га яго ўзнавілі — ужо на італьянскай мове. Але Саткілава дагэтуль не рызыкуе паўторна ўваходзіць у спэктакль.

У Беларускай опэры «Баль-маскарад» паставілі пазьней — у 1988 г. Але на італьянскую пераклалі на дзесяць гадоў раней, чым у Маскве, — перад гішпанскімі гастролямі.

Перапрацоўка йшла аўральнымі тэмпамі, вытанчаныя мізансцэны Штэйна замяняліся на прасьцейшыя, прыдатныя для гастрольна-палявых умоваў. Арыгінальныя рэжысэрскія вынаходкі ў мітусьні забываліся. Аднак спэктакль усё яшчэ выглядае даволі прыстойна. Дастаткова прыстойна, каб «зорны тэнар» выкарыстаў яго ў якасьці «трэніровачнай пляцоўкі». «Прыкметна, што «Баль-маскарад» у Менску для Саткілавы станецца генэральнай рэпэтыцыяй: ужо на наступны дзень сьпявак засьпявае гэтую ж партыю ў Вялікім тэатры ў Маскве», — такі анонс надрукавала напярэдадні спэктаклю «Комсомольская правда в Беларуси».

Па-першае, «Баль-маскарад» у Вялікім з удзелам Саткілавы адбудзецца 21 кастрычніка, а не 21 верасьня. Немагчыма засьпяваць партыю Рычарда ў Менску, праехаць ноч у цягніку, раніцой завітаць на рэпэтыцыю і ўвечары пражыць і прасьпяваць гэтую ж партыю зноў — радасьць, боль, любоў, сьмерць...

Але галоўнае ў тым, што Вялікі тэатар прафэсіянальна ані крыху не вышэйшы за Беларускую опэру. Ён даўно ператварыўся ў пустую абалонку — у месца, куды прэстыжна хадзіць і слухаць сьпевакоў з гучнымі імёнамі, якія таксама ператварыліся ў пустыя абалонкі. Састарэлыя «зоркі», дзякуючы сваім імёнам і мітусьні на тэлебачаньні, атрымліваюць нядрэнныя ганарары. Амаль як Максім Галкін.

Саткілаву многія таксама памятаюць зь перадач на ОРТ. Аднак, паставіўшы кошт на квіткі ад 7 да 70 тыс. рублёў, «Кляс-клюб» пралічыўся. Людзі не былі гатовыя купляць квіткі на Саткілаву за гэткія грошы, тым болей што ягоны леташні канцэрт многіх расчараваў. Вольных месцаў у залі было зашмат. І было б яшчэ болей, калі б ня палкія заўзятары барытона Аркадзя Саўчанкі, які выконваў адказную ролю Рэната — сябра, суперніка і забойцы галоўнага героя. Саўчанка на год старэйшы за Саткілаву, апошнім часам ён цяжка хварэе і рэдка выходзіць на сцэну. Ягоныя спэктаклі — на вагу золата.

Саўчанка й насамрэч сьпяваў дасканала. Асабліва ў трэцім акце, дзе Рэната дае волю сваім пачуцьцям. Былі ў спэктаклі і іншыя выдатныя пэрсанажы. Партыю Амэліі выдатна засьпявала ляўрэатка нацыянальнага конкурсу Ніна Шарубіна.

Добра прэзэнтаваліся ў «Балі-маскарадзе» Натальля Руднева, Ганна Гур'ева, Васіль Кавальчук. Нездарма спадар Саткілава да апошняй хвіліны не жадаў выходзіць на сцэну, спасылаючыся на хворае горла. Калі б Марат Грыгорчык згадзіўся яго замяніць, ён увогуле б адмовіўся ад удзелу ў спэктаклі. Але сп.Грыгорчык пасьля паўтарагадзіннай рэпэтыцыі пачуваўся стомленым, і Саткілава мусіў аддацца свайму лёсу. Як сьпяваў ён у той вечар, казаць ня хочацца — занадта я паважаю ягонае добрае сэрца і мінулыя дасягненьні. На просьбу сьпевака з спэктаклю выкінулі цэлую сцэну, якой ён напэўна б ня даў рады. Воплескаў у той вечар было досыць. Вось толькі адрасаваліся яны зусім не заежджай славутасьці.

Юлія Андрэева

Піва, кава, мэнінгіт

Такіх нахабных халодных дажджоў, як тыя, што апалі на нашы гомельскія галовы ў пачатку восені, даўно не было. Надвор'е шалее, народныя прыкметы ня спраўджваюцца, мокнуць ногі, баліць галава. Ніхто ня кажа пэўна, якая сапраўды сытуацыя з мэнінгітам. Міжволі адмаўляешся ад усіх магчымых вадкасьцяў, апроч мінэралкі, піва, кавы і пярцоўкі. Знаёмцы наракаюць на лішкі хлёркі ў вадзе з-пад крану.

* * *

Чарговы гомельскі манумэнтальны праект зьбянтэжыў. Скульптар Вячаслаў Далгоў прапануе паставіць на Кіеўскім спуску помнік першаму гомельцу. Добрая ідэя. Гомель і так небагаты на ўласна гомельскія манумэнты. Аднак падаецца, што выява чалавека на чаўне з рысьсю выглядае не зусім дарэчна. Ясна, што аўтар мае на ўвазе гомельскі герб з намаляванай дзікай коткай. Аднак жа герб той зьявіўся за часам расейскага панаваньня і ні першыя, ні сто сорак першыя гамяльчане да яго ніякага дачыненьня ня маюць. Хіба мо спадар зь якіхсьці крыніцаў дазнаўся, што рысь між нашых далёкіх продкаў шанавалася як татэм. Помнік патрэбны, але гэтая жывёла тут лішняя, нібы тая павышаная канцэнтрацыя хлёркі ў вадзе з-пад крану.

* * *

Як толькі ў Гомель завітваюць расейскія сьпевакі-сьпявачкі, то мусова апынаюцца на арэне цырку. Во й цяпер горад аздобілі плякацікі «хвабрыкі зьвёзд» з запросінамі ў тое самае месца. Уяўляю ідылічную карціну: маладыя маскоўскія зьнічкі спрытненька пераскокваюць цераз радовішчы цёплага вярблюджага лайна гастрольнага цырку «Magic». Апроч «хвабрычных» у Гомель прыехаў перасоўны расейскі зьвярынец. Зіркнуў я на вагончыкі й мала не абамлеў: па бакох — выявы каранаваных дзьвюхгаловых птушак, а пасярэдзіне тлумачэньне: «Фламинго». «Дык вось яны якія, флямінгі!» — падумалася. Аднак расейцы падманулі: усе жывёлінкі ў зьвярынцы аднагаловыя.

* * *

Заснуўшы над «Советской Белоруссией», дзе колішні аўтар «НН» прыўкрасна распавядае пра гомельскія *преображения*, прысьніў вусьцішны сон. Марфэй закінуў цябе зь сябрамі-аднадумцамі ў Ветку 20NN-га году, дзе між іншага давялося разглядаць інтэр'ер Дому культуры. Надпісы ўсюды былі па-расейску. Адзін ты зь няўрымсьлівым дзівацтвам даводзіў, што гэта беларуская мова будучыні: пішацца «спасибо», а чытаецца «дзякуй».

* * *

Падчас службы ва Ўнутраных войсках неаднакроць даводзілася чуць нараканьні камандзіраў на тое, што камандуючымі прызначаюцца выслужэнцы зь іншых родаў войскаў. Напрыклад, танкісты. Тады як УВ, маўляў, — эліта. За тыдзень да гарадзкога карнавалу давялося назіраць, як сяржанцік з шаўронам «Узброеныя Сілы РБ» спрабаваў пашыхтаваць жаўнераў унутраных войскаў. Тыя гэткімі Гулівэрамі крочылі па мірным Гомелі, парушаючы, як толькі гэта магчыма, форму адзеньня. Сяржанцік, што быў ці то ў адпачынку, ці то ў звальненьні, лагодна размаўляў каля тэатру з сваякамі. А гэтыя парушальнікі абсалютна не зважалі на ягоную таўсматую лычку старшага сяржанта. О-о-оў!!! Як ішлі, так і пайшлі. Здавалася, яго на тым самым месцы вырубіць ад абурэньня. А тыя толькі пасьміхаліся міжсобку. Гетманы растуць?

* * *

Ад гарадзкога сьвята вырашыў трохразова адхрысьціцца. Гэткія імпрэзы актывізуюць усялякіх бажаволкаў, алькаголікаў ды прастытутак. З самай раніцы іх давялося назіраць на кожным кроку. Зь іншага боку, даймае афіцыёз. Шэсьце псэўданародных строяў. Гульня пад прымусам немагчымая, цьвердзіў мудры Ёган Хёйзынга. Быць мудрым гэткім днём — не выяжджаць у цэнтар, а чытаць Булгарына ці Доўнар-Запольскага пад келіх бурштынавага напою.

Сяргей Балахонаў, Гомель

Турко супраць ідработы

Іосіф Турко, кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага сымфанічнага аркестру, адмовіўся весьці ідэалягічную працу ў сваім калектыве. На адпаведным загадзе ён напісаў: «Ня згодны». Апроч вымовы за гэта, кіраўніцтва Філярмоніі дало яму яшчэ адну — «за неналежнае ўтрыманьне фракаў і смокінгаў музыкаў». Турко напісаў заяву аб звальненьні. 70 музыкаў зьвярнуліся да міністра культуры з адкрытым лістом у яго падтрымку… Усе на нэрвах. Якая ўжо тут творчасьць!

Народзіны **Ніны Мацяш** адзначалі ў Белаазерску 21 верасьня. Самы арыгінальны прэзэнт зрабіў Вінцук Вячорка — падараваў паэтцы наклад толькі-толькі выдадзенай кнігі яе перакладаў з эўрапейскіх моваў «Перабіраю самацьветы». Часьцей бы нам радаваць добрых паэтаў.

Уладзімер Парфяновіч зьбіраецца скласьці альтэрнатыўны праект бюджэту на 2004 год. Але для гэтага трэба ведаць асноўныя бюджэтныя паказьнікі, якія закладае ўрад. З Саўміну ж дэпутат атрымлівае адны адпіскі.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Васіль Даўгалёў, кіраўнік Берасьцейскага аблвыканкаму, уганараваны найвышэйшай узнагародай Саюзу мастакоў — мэдалём «За заслугі ў выяўленчым мастацтве». Матывацыя — дапамог зладзіць выставу берасьцейскіх мастакоў у Менску. Новаўзнагароджанага адразу ж папрасілі зьнізіць стаўкі арэнднай платы за мастакоўскія майстэрні. Расчулены вэртыкальшчык, які сумленна прызнаўся, што «маляваць ня ўмее», даў дабро. «У нас ёсьць з каго ўзяць грошы», — адзначыў ён.

Фагатыст **Аляксей Фралоў** стаў ляўрэатам VII міжнароднага конкурсу сучаснай камэрнай музыкі ў Кракаве. Ён граў «So-na-tu» Рагале ды «In Freundschaft» Штакгаўзэна. Музычная дынастыя: бацька пачынаў з Мулявіным у «Лявонах», а сын перамагае ў прэстыжных конкурсах. Зайздросны кавалер, дарэчы.

Публіцыст **Аляксандар Грыцанаў**, супрацоўнік «Белорусской газеты» і «Советской Белоруссии», асуджаны на два гады строгага рэжыму за махлярства. Нібыта пазычыў 2500 даляраў і не аддаў. Грыцанаў усё адмаўляе.

Ляўрэат Фралоў

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Давыд Гарадзенскі стаў нарэшце над Кронанам. Помнік Гедымінаваму зяцю ў Горадні паставілі ў час нядаўняга «сьвята гораду».

Кампазытар **Анатоль Багатыроў**, патрыярх беларускае музыкі, адышоў 19 верасьня. Было яму 90 гадоў. Сапраўднае прозьвішча ягонага бацькі было Багацька, але ён памяняў, каб было прыгажэй.

УЛАДЗІМЕР КРУК

Памяць **Івана Сырэля**, які загінуў сёлета падчас «Басовішча», зьбіраюцца ўшанаваць гарадзенскія музыкі. Яны маюць супольна выдаць трыб'ют рок-гурту «Lasty Kysto», у якім граў хлопец. Да акцыі ўжо далучыліся «Contra la Contra», «Кальян», «Deviation».

Яан дэ Хаоп Схефэр, міністар замежных справаў Галяндыі, стаў новым генэральным сакратаром NATO. Яму давядзецца мірыць Паўночнаатлянтычны блёк з ЗША ды інтэграваць у Альянс новых сяброў. Сярод кандыдатаў на пасаду генсака NATO фігураваў і польскі прэзыдэнт Квасьнеўскі. Прычым ён быў настолькі даспадобы прадстаўнікам 19 краінаў Альянсу, што былога сакратара Джорджа Робэртсана ўпрошвалі пакіраваць яшчэ гадок — пакуль прэзыдэнцкі тэрмін Квасьнеўскага ў Польшчы скончыцца. Але Робэртсан адмовіўся.

Самы багаты на сьвеце

Нэльсан Мандэла і **Біл Гейтс** заклікалі паўднёваафрыканскую моладзь змагацца з СНІДам так, як бацькі й дзяды змагаліся з апартэідам. Прычым сёньняшнія паўднёваафрыканцы ў выгадным становішчы: за змаганьне супраць СНІДу ня садзяць у турму на доўгія гады, а грошы на «рэвалюцыю» дае гаспадар «Microsoft». Біл Гейтс дзясяты год ачольвае сьпіс найбагацейшых амэрыканцаў. Яго маёмасьць ацэньваецца ў 46 млрд даляраў. Але невядома, ці доўга ён яшчэ пратрымаецца на вяршыні. З касьмічнай хуткасьцю растуць капіталы тых, хто зарабляе на інтэрнэт-паслугах.

Антон Бутэйка, пасол Украіны ў Румыніі, пайшоў у адстаўку, пратэстуючы супраць далучэньня краіны да ялцінскіх пагадненьняў пра «адзіную эканамічную прастору». Гэта, на думку пасла, уцягвае Украіну «ў арбіту Масквы». Бутэйка, адзін з найлепшых дыпляматаў, які быў дарадцам прэзыдэнта, віцэ-шэфам МЗС, паслом у ЗША, лічыць, што гэтым падпісаньнем Кучма паўтарыў памылку Хмяльніцкага. Беларусь і губэрнямі далучаюць, а нашы дыпляматы маўчаць.

Прынц **Гары**, малодшы ўнук брытанскай каралевы, не паступіў у вайсковую акадэмію. 19-гадовага хлопца палічылі замаладым, параілі «пашыраць далягляды ведаў» і сказалі, што возьмуць не раней чым праз два гады. «Пашыраць далягляды» Гары будзе на аўстралійскай фэрме, пасучы скаціну. Амаль як Алесь Загорскі. Заробак прынца-фэрмэра — 100 фунтаў у тыдзень.

WWW.GAZETA.RU

СМ

• ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ •

ВІТАНЬНІ

Даражэнькая Юлія Кручыніна. Віншую з тым, што я цябе моцна КАХАЮ! Ты самая лепшая. Інкогніта

КАНТАКТЫ

Увага! Менскі Малады Фронт зьбіраецца шточацьвер у 19.00 каля тэатру Янкі Купалы — у нас новы офіс!

Увага! Сапрадную незалежнасьць Вы знойдзеце толькі на detr.org. Т.: 230-62-14

Шукаю кантактаў зь беларускімі калекцыянэрамі. Пішэце: zmhul@seznam.cz, http://www.geocities.com/belarus_coins

Мужчына, 43/173, па гараскопе Скарпіён, пазнаёміцца з жанчынай, па гараскопе Рыбай. Т.: (у Слуцку): 6-19-64

Спадарства, заносьце беларускія дзіцячыя кніжкі ў інтэрнаты і дзіцячыя больніцы!

Anhielskija džynsy (32/34, 33/34), kurtka (20) GAP. Т.: 291-55-63

Не шукайце мяне сярод жытніх палёў. Прысутны

ЗБМ «Беларускі Шлях»

запрашае на падарожжа

ў Горадню

з заездам у **Мураванку**

5 кастрычніка (нядзеля), а таксама

на Браслаўшчыну

28 верасьня (нядзеля).

Т.: 232-54-58; 8-029-622-57-20 (Зьміцер)

КНІГІ, МУЗЫКА

Алесь Гарун «Выбраныя творы» — 24-я кніга сэрыі «Беларускі кнігазбор». Набывайце

Прадам: «Статут ВКЛ» 1588, «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі», 1 т., «Этнаграфію Беларусі» — энцыкляпэдыю, «Нашу Ніву», 1 т., кнігу У.Арлова пра крыж Эўфрасіньні Полацкай, 8 тамоў У.Караткевіча, «Беларускае народнае адзеньне», Біблію Скарыны. Т.: 265-63-91

Прадаецца «Беларуска-расейскі слоўнік» Яна Станкевіча. Т.: (у Гомелі) 45-11-51

Каб замовіць «Сьпеўнік Беларускі», дашліце свой паштовы адрас на akimycz@yahoo.com ці на пэйджэр: 233-00-00, аб. 1030 з адзнакай «па сьпевы». У сеціве: http://bs.studenty.org

Куплю «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (тт.1–18), «Археалёгію Беларусі» (тт.1, 2), Статут ВКЛ 1588 г. (перавыданьне 1989 г.), «Беларускую энцыкляпэдыю» (т.6), «Энцыкляпэдыю прыроды Беларусі» (тт.1–5), першы том Збору твораў Янкі Купалы ў 9 тамах. Т.: 230-91-53

Прадам «Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь», «Беларускую энцыкляпэдыю» (тт.1, 5, 7, 8), акадэмічныя расейска-беларускі і беларуска-расейскі слоўнікі, 1953 і 1962 г. адпаведна, «Беларуска-расійскі слоўнік» Байкова і Некрашэвіча, «Нацыянальны атлас Беларусі». Т.: 230-91-53

Адам Міцкевіч «Выбраныя творы», 25-я кніга сэрыі «Беларускі кнігазбор», 640 старонак, найбольш поўнае выданьне на беларускай мове. З новымі перакладамі Р.Барадуліна і М.Скоблы. Набывайце

У Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю да 13.00 можна набыць Біблію, Беларускі Малітаўнік ды іншыя кнігі

Шырокі выбар беларускіх CD, аўдыё, відэа, кніг у Гомелі на пл.Паўстаньня (штонядзелю, да 13.00)

У Гомелі зьявілася кніга В.Чаропкі «Уладары ВКЛ». Т.: 45-11-51. Пл.Паўстаньня, штонядзелю да 13.00

У Гомелі можна набыць супэркнігу «Краіна Беларусь». Т.: 45-11-51. E-mail: bandrej@tut.by

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

• ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ •

Прэзэнтацыя кнігі Кіпеляў

26 верасьня Саюз беларускіх пісьменьнікаў (Менск) і Беларускі інстытут навукі й мастацтва (Нью-Ёрк) запрашаюць на прэзэнтацыю кнігі Зоры й Вітаўта Кіпеляў «Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе». Імпрэза адбудзецца ў бібліятэцы Дому літаратара (вул. Фрунзэ, 5). Пачатак а 18.30. Адмыслова на гэтую імпрэзу ў Менск прыехаў доктар Вітаўт Кіпель.

Сустрэча з альхімікам

Літаратурна-мастацкая гасьцёўня «Маладзік» запрашае 4 кастрычніка а 15-й на творчую сустрэчу з маладым рэжысэрам Алесем Матафонавым, аўтарам і вядучым тэлепраграмы «Альхімія слова». Да Вашае ўвагі самыя арыгінальныя перадачы з праграмаў «Біяграфія слова» і «Альхімія слова», жывая музыка (Уладзімер Бярбераў). Адбудзецца сустрэча ў Палацы дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41, кіналекцыйная заля). Уваход вольны.

ЗС

КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў), на старонку 16

Рэклямныя расцэнкі:

— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб.

За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб.

Аформленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 360 руб.

Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.

На зваротным баку бланку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

Даведкі праз т. (017) 284-73-29

Адказы на крыжаванку з №34

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 4. Кавалёнак. 6. Ацёл. 7. Ёлуп. 9. Нанпарэль. 10. Ясьлі. 12. Накіп. 15. Карат. 16. Кароста. 18. Акуляры. 19. Вісконсын. 20. Глаголіца. 22. Сымпсан. 23. Сандалі. 24. Бутык. 26. Ампір. 29. Скунс. 31. Атлянтыда. 32. Арфа. 33. Кола. 34. Прыліпала.

ПА ВЭРТЫКАЛІ: 1. Дворнік. 2. Альбатрос. 3. Анапэст. 4. Клуні. 5. Кёльн. 6. Авёс. 8. Пані. 10. Ялавічына. 11. Ластоўскі. 13. Агурочнік. 14. Парацэльс. 17. Аксон. 18. «Аракс». 21. Аўтаномія. 24. Балерын. 25. Крымчак. 27. Міна. 28. Равап. 29. Саўка. 30. Нэта.

Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
выпускны рэдактар	Арцём Лява
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.

Наклад 3434. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 01.00 24.09.2003.

Замова № 4813.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а